

Птушкі, якія сімвалізуюць каханне

СТАР 3



Як выратаваць унікальны лесапарк

СТАР 3



Маленькі горад з вялікім ваенным значэннем

СТАР 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 СНЕЖНЯ 2013 г. ЧАЦВЕР № 229 (27594) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЎЗНАГАРОДЫ ЗА ПЛЁННУЮ ПРАЦУ

**За шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў і высокае прафесійнае майстэрства, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў у галіне машынабудавання і лёгкай прамысловасці, удасканаленне падатковай сістэмы і рэалізацыю дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, вялікі асабісты ўклад у развіццё сродкаў сувязі, сферы адукацыі, культуры, мастацтва і спорту дзяржаўных узнагарод Беларусі ўдастоены 72 работнікі розных сфер. Адпаведны ўказ падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Ордэнам Айчыны III ступені ўзнагароджаны галоўны трэнер спартыўнай каманды таварыства з абмежаванай адказнасцю «Гандбольны клуб «СКА-Мінск» Спартак Мірановіч.

Работнікі ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Мінскі маторны завод» удастоены ордэна Пашаны. Сярод іх токар эксперыментальнага цэха Анатоль Лазоўскі, вадзіцель аўтамабіля транспартнага цэха Алег Леўданскі, выпрабавальнік рухавікоў цэха зборкі і выпрабавання матораў Віктар Саўчук, электраманцёр па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання цэха малых серый Васіль Тарасевіч.

Ордэнам Францыска Скарыны ўзнагароджваюцца артыст аркестра вышэйшай катэгорыі Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча ўстановы «Беларуская дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія» Аляксандр Крамко і артыст размоўнага жанру вышэйшай катэгорыі канцэртна-гастрольнага аддзела філармоніі Уладзімір Радзівілаў.

Заслугі шэрагу грамадзян адзначаны медалём «За адвагу» і «За адзнаку ў папярэджанні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый».

Вялікая група работнікаў розных сфер удастоена медаля «За працоўныя заслугі». Сярод іх старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр Ацясаў і першы намеснік міністра эканомікі Беларусі Анатоль Філонаў.

Сярод узнагароджаных медалём Францыска Скарыны галоўны рэжысёр Драматычнага тэатра беларускай арміі Марына Дударава і дырэктар прадстаўніцтва Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір» у Рэспубліцы Беларусь Уладзімір Пярцоў.

Указам таксама прысвойваюцца ганаровыя званні «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь», «Заслужаны работнік прамысловасці Рэспублікі Беларусь», «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь», «Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь».

# ЛЁГКАЯ ВОЎНА



*Жыхарка вёскі Пакуцце Дрыбінскага раёна Марыя Міхайлаўна Асіпоўская перадала сыну Уладзіміру сакрэты шапавальскага майстэрства. Цяпер гэтая сям'я і вёска вядомыя па ўсёй Беларусі вырабам якаснага традыцыйнага абутку з воўны — валёнак. У вёсцы, акрамя Асіпоўскіх, яшчэ некалькі сем'яў займаюцца гэтым промыслам. А Уладзімір, у сваю чаргу, вучыць дрыбінскіх дзяцей у гуртку «Катрушнік», які створаны пры Дрыбінскім раённым гісторыка-этнаграфічным музеі. Сёлета ў складзе музейнага калектыву Уладзімір Асіпоўскі быў узнагароджаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Беларусі за захаванне і развіццё народных традыцый і промыслаў.*

*У асенне-зімовы перыяд у добрага шапавала заўсёды шмат працы. Не сумуюць без свайго занятку і Уладзімір і Марыя Асіпоўскія.*

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый ГАЙДУКЕВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы:**

***«З вывадам сіл міжнароднай кааліцыі з Афганістана, які, як чакаецца, адбудзецца ў 2014 годзе, у Саюзнай дзяржавы і ў цэлым мытнай тройкі з'явяцца новыя праблемы. Гэта — наркатрафік. Напэўна, больш актыўна ён пойдзе ў Расіі, але і, адпаведна, на нашу тэрыторыю. Часу не так шмат, каб прыняць нейкія кардынальныя і эфектыўныя практычныя захады. Нацыянальная бяспека патрабуе пастаяннай увагі. Мы выдатна бачым, што адбываецца вакол. Узнікаюць новыя выклікі і пагрозы, на якія неабходна больш аператыўна рэагаваць».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.12.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9390,00 | ▲ |
| Еўра | 12740,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 282,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1137,49 | ▼ |

■ Парламенцкі дзённік

## АДУКАЦЫЯ ЯК УМОВА РОСКВІТУ

**Дэпутаты падвялі першыя вынікі комплекснага маніторынгу Кодэкса аб адукацыі. Прыняты ў Беларусі два гады таму Кодэкс аб адукацыі стаў першым на постсавецкай прасторы вопытам кадыфікацыі заканадаўства ў гэтай сферы. З самага пачатку меркавалася, што Кодэкс будзе пад пільным наглядам і парламентарыяў, і спецыялістаў, каб своечасова мець магчымасць удасканалення альбо карэкціроўкі яго нормаў. Вынікам маніторынгу Кодэкса і прапановам па яго дапаўненнях і зменах былі прысвечаны парламенцкія слуханні, якія адбыліся 4 снежня ў Авальнай зале Палаты прадстаўнікоў.**

### ЭФЕКТ АД ДЫПЛОМА

— На наш погляд, неабходна замацаваць на заканадаўчым узроўні выкарыстанне ў адукацыйнай практыцы дыстанцыйных тэхналогій, сеткавага ўзаемадзеяння ўстаноў адукацыі і ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу, — сказаў, адкрываючы слуханні, **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.** — Сёння як ніколі актуальна развіццё дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў сферы адукацыі, распрацоўка сумесна з прадстаўнікамі рынку працы механізмаў фарміравання дзяржаўнага заказу падрыхтоўкі кадраў. Павінна быць істотна палепшана і пашырана сістэма падрыхтоўкі рабочых і спецыялістаў сярэдняга звяна, аптымізавана падрыхтоўка кадраў з вышэйшай адукацыяй.

Пільнай увагі, дадаў спікер ніжняй палаты парламента, патрабуе падрыхтоўка педагагічных кадраў і павышэнне ўзроўню сацыяльнай абароны работнікаў сістэмы адукацыі. Яшчэ адзін кірунак удасканалення заканадаўства ў галіне адукацыі — стварэнне знешняй незалежнай дзяржаўнай атэстацыі навучэнцаў, ацэнкі дзейнасці ўстаноў адукацыі па выніку.

СТАР 2

## СТАЛІЧНАЯ НЕРУХОМАСЦЬ «ПАХУДЗЕЕ» ЯШЧЭ НА 3–5%?

**Цэны на жыллё ў Мінску да канца года могуць страціць каля 3%, паведамляе ў сваім прагнозе намеснік дырэктара па продажах на другасным рынку жылля агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Святлана КУДЗЕЛКА. Разам з тым, асобныя аналітыкі прадказваюць, што ў снежні цэннікі на стандартнае сталічнае жыллё могуць «прасесці» нават мацней — да 5%.**

Паспрабуем разабрацца ў праўдзівасці такіх прагнозаў. Нагадаем, што рост цэн на жылую нерухомасць дасягнуў свайго максімуму сёлета ў верасні. А ўжо з кастрычніка кошт квадратнага метра другаснага жылля пачаў зніжацца. Эксперты прагназуюць, што падобная тэндэнцыя захаваецца і ў апошнім месяцы года. Справа ў тым, што цяпер прапанова на рынку жылля перавышае попыт, а колькасць здзелак памяншаецца. Аб'ём попыту сёння напрамую залежыць ад даступнасці жыллёвых крэдытаў. «Калі яшчэ летам на другасным рынку насельніцтва актыўна прыцягвала крэдыты на куплю жылля, то цяпер сітуацыя цалкам супрацьлеглая», — адзначыла Святлана Кудзелка.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пры гэтым спад на рынку жылой нерухомасці прывёў да ўсталявання больш выразных крытэрыяў цэнавай дыферэнцыяцыі, калі кошт «квадрата» ўсё больш залежыць ад тыпу і месцазнаходжання кватэры. Сёння, каб прадаць свой аб'ект, уладальнікі кватэр часта вымушаны зніжаць цэны і ісці насустрач пакупнікам. Цяпер розніца паміж коштам прапановы і коштам здзелкі на другасным рынку ў сярэднім складае каля 10%. У той жа час, калі заяўлены кошт на кватэру першапачаткова адпавядае рынкавым трэндам, то яна будзе прададзена хутка і амаль без гандлю, адзначае спецыяліст.

СТАР 2

■ Погляд

**Украінскі эксперт Ігар ДРУЗЬ:**

## «ЧАСТКА ЎЛАДЫ ПРАЦУЕ НА РЭВАЛЮЦЫЮ»

**Падзеі ва Украіне асвятляюцца ў асноўным з акцэнтам на супрацьстаянні ўлады і апазіцыі. У той час як думка значнай часткі насельніцтва, роўна аддаленай і ад таго, і ад другога лагера, часта аказваецца незаўважанай. Напрыклад, мала хто ведае, што 1 снежня, у перыяд найбольшага напалу апазіцыйных настрояў, у Кіеве прайшоў хрэсны ход праваслаўнай грамадскасці. Гэтыя людзі традыцыйна крытыкавалі ўлады Украіны, а цяпер падтрымалі рашэнне Віктара Януковіча адмовіцца ад падпісання пагаднення аб асацыяцыі з Еўрасаюзам. На пытанні «Звязды» адказвае ўдзельнік гэтых падзей, старшыня руху «Народны сабор» Украіны, публіцыст Ігар ДРУЗЬ.**

**— Ігар Міхайлавіч, на думку назіральнікаў, масавыя беспарадкі ў Кіеве запусціла неабгрунтавана жорсткая акцыя ўкраінскіх сілавікоў па разгоне мітынгоўцаў на плошчы Незалежнасці 30 лістапада. Вы згодны з гэтым пунктам гледжання?**

— Не згодны. Перш за ўсё, сам факт непадпісання дагавора аб асацыяцыі ўкраінскім бокам выклікаў жаданне Брусела разбурыць законную ўладу ва Украіне і правесці дзяржаўны пераварот. Гэта першапачаткова была вялікая геапалітычная гульня, а насельніцтва і апазіцыйныя палітыкі Украіны ў ёй — толькі пешкі.

СТАР 2



## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ЕЎРОПЕ ПРОДАЖЫ ВЕЛАСІПЕДАЎ ПЕРАВЫСІЛІ ПРОДАЖЫ АЎТАМАБІЛЯЎ

У большасці краін Еўрасаюза летась продаж веласіпедаў перавысіў продаж аўтамабіляў, што, на думку экспертаў, звязана з эканамічным крызісам, перадаюць інфармагенцтвы. Пры гэтым двухколавы від перамяшчэння стаў папулярным не толькі ў «веласіпедных» сталіцах Еўропы, якімі лічацца Амстэрдам і Капенгаген. У Італіі, напрыклад, упершыню за 50 з лішнім гадоў было прададзена 1,6 млн веласіпедаў супраць 1,4 млн аўтамабіляў. У італьянскім Мілане з нядаўняга часу дзейнічае сістэма грамадскага велапракату накшталт той, якая існуе ў Парыжы і Лондане. Улады Мадрыда, у сваю чаргу, плануюць стварыць так званае зялёнае кольца — зону веласіпедных маршрутаў агульнай працягласцю 10 км. Лонданскія ўлады сцвярджаюць, што за апошняе дзесяцігоддзе колькасць веласіпедных паездак вырасла на 66% — да 500 тыс. за дзень. Тым не менш аварыі на дарогах, у якіх гінуць веласіпедысты, прымушаюць задумацца, наколькі бяспечны такі від транспарту.



### СМЯРОТНА НЕБЯСПЕЧНЫ ГРЫП АБ'ЯВІЎСЯ Ў ГАНКОНГУ

Жыхары Ганконга знаходзяцца ў напрузе — зафіксаваны першы выпадак заражэння птушыным грыпам H7N9. Паведамляецца, што 36-гадовая ахвяра знаходзіцца ў шпіталі ў крытычным стане. Усе кантакты асобы ізаляваныя.

### ПРЫНЦ УІЛЬЯМ ПРЫСВЕЦІЦЬ СЯБЕ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ

Прынц Уільям, які ў ліпені стаў бацькам, збіраецца заняцца ў наступным годзе сельскай гаспадаркай. Другі ў чарзе на атрыманне ў спадчыну прастола Злучанага каралеўства, Уільям у верасні вырашыў пайсці ў адстаўку з вайсковай службы дзеля сям'і, але цяпер задумаўся пра будучыню, паведамляе The Sun. «Спадчыннік трона гатовы паступіць на курсы навучання сельскай гаспадарцы», — гаворыцца ў артыкуле брытанскага выдання. Уільям на дадзены момант з'яўляецца капітанам запасу Каралеўскіх ВПС. Па некаторых звестках, прынц ужо рыхтуецца да паступлення ў Кембрыджскі ўніверсітэт на курсы сельскагаспадарчай эканомікі.

Як патлумачылі аўтары артыкула, на курсах Уільям збіраецца атрымаць «неабходныя веды для таго, каб прыняць ад бацькі ў кіраванне герцагства Корнуал, калі прынц Валійскі Чарльз стане каралём».



ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### АМЕРЫКАНЦЫ: ЗША НЕ ВАРТА ЎМЕШВАЦЦА Ў СПРАВЫ ІНШЫХ ДЗЯРЖАЎ

Больш за палову амерыканцаў, якія прынялі ўдзел у сацыялагічным даследаванні, праведзеным цэнтрам П'ю, лічаць, што ЗША не варта ўмешвацца ў справы іншых дзяржаў. Як адзначаюць прадстаўнікі цэнтра, ніколі яшчэ за ўсю гісторыю такіх апытанняў (яны праводзяцца ўжо амаль 50 гадоў) адпаведнай пазіцыі не прытрымлівалася такая значная доля рэспандэнтаў.





Згодна з распаўсюджанымі вынікамі даследавання пад назвай «Месца Амерыкі ў свеце — 2013», рэкордныя 52% амерыканцаў пагадзіліся са сцвярджэннем, што ЗША «варта займацца ўласнымі справамі і даць іншым краінам самастойна вырашаць свае праблемы». Супрацьлеглага пункту гледжання прытрымліваюцца толькі 38% апытаных. На пытанне аб тым, «ці сталі ЗША больш уплывовымі і магутнымі за апошнія 10 гадоў», станоўчы адказ далі толькі 17% удзельнікаў даследавання. 53% апытаных упэўнены, што сітуацыя адваротная. Пераважная большасць (70%) рэспандэнтаў лічаць, што сёння ЗША ўжо не карыстаюцца такой павагай, якой карысталіся раней.

КОРАТКА

Нацыянальная авіякампанія «Белавія» ў канцы лістапада ўнесена ў рэестр мытных перавозчыкаў. Гэта азначае, што «Белавія» атрымала права на перавозкі грузаў з выкарыстаннем працэдуры мытнага транзіту ў аэрапорты, якія знаходзяцца на тэрыторыі краін Мытнага саюза.

У Мінску завяршылася масавая імунізацыя насельніцтва супраць грыпу. Паводле даных на 2 снежня, прышчэпку супраць грыпу зрабілі 679 тыс. чалавек (амаль 131 тыс. дзяцей і 548 тыс. дарослых), або 35,8 працэнта насельніцтва.

ДАІ шукае кіроўцу, які 28 лістапада каля 18 гадзін на 3-м км аўтадарогі Сеніца — Прылукі — Самахвалавічы ў пасёлку Юбілейны Мінскага раёна на аўтамабілі «Мазда-6» збіў дзяўчынку і ўцёк.

У X Калядным міжнародным турніры аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Беларусі, які пройдзе ў Мінску з 3 па 7 студзеня 2014 года, згуляюць 12 каманд.

Унікальная падводная лодка класа субмарын «Sen-Toku» імператарскага флоту Японіі часоў Другой сусветнай вайны знойдзена паблізу Гавайскага архіпелага. Усяго было пабудавана шэсць субмарын дадзенага класа. Гэтыя лодкі дасягалі 122 м у даўжыню і былі здольныя зрабіць шлях даўжынёй у паўтара падарожжа вакол свету без дазапраўкі.

■ Будзе свята!

### ДЗЯДЫ МАРОЗЫ ЗГУЛЯЮЦЬ... У ХАКЕЙ

**З 16 снежня ў сталіцы на пляцоўцы каля Палаца спорту, а таксама на Кастрычніцкай плошчы, распачнуць сваю працу навагоднія кірмашы. 2014-ы — год Чэмпіянату свету па хакеі, таму яго сімвал — зубр Волат — будзе самым актыўным удзельнікам многіх мерапрыемстваў. Плануецца правесці парад Дзядоў Марозаў і Снягурак, а таксама хакейны матч паміж камандамі Дзядоў Марозаў каля галоўнай ёлкі краіны.**

Святкаванне каля Палаца спорту не спыніцца і ў навагоднюю ноч: з 21 да 4 гадзін тут будзе праводзіцца эстрадная праграма з незвычайным святломузычным суправаджэннем. У гадзіну ночы каля стэлы «Мінск — горад-герой» можна будзе паглядзець на святочны феерверк.

Па словах **Віталіны РУДЗІКАВАЙ, начальніка ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама,** святкаванне Новага года традыцыйна пройдзе і ва ўсіх раёнах. Сярод ужо звыклых месцаў з'явіцца і адно новае — побач з «Чыжоўка-Арэнай». З планам усіх навагодніх мерапрыемстваў можна будзе азнаёміцца на сайце Мінгарвыканкама ў спецыяльным раздзеле.

**Першы намеснік начальніка дзяржустановы «Галоўнае ўпраўленне спажывецкага рынку Мінгарвыканкама» Аляксей РАМАНАЎ** паведаміў, што ў Мінску на працягу навагодніх святаў пройдзе больш за 2,5 тысячы акцый, сярод якіх будуць распродажы, дэгустацыі і многае іншае. 15 снежня мінчан будуць чакаць 15-працэнтныя зніжкі на ўсю прадукцыю ва ўнівермагах ГУМ, ЦУМ, «Беларусь» і Гандлёвым доме «На Нямізе». Дарэчы, арганізатары святочных мерапрыемстваў не забыліся і на гасцей сталіцы. **Дырэктар інфармацыйна-турысцкага цэнтра «Мінск» Тамара АРЭХАВА** паведаміла, што толькі ў складзе арганізаваных турыстычных груп у сталіцу на навагоднія святы прыедзе каля 10 тысяч замежных турыстаў.

Асобная праграма прадугледжана для жыхароў сталага ўзросту. З 12 па 15 снежня ў выставачным цэнтры па вуліцы Янкі Купалы, 27 пройдзе сацыяльная выстава-кірмаш «50+». З 10 да 18 гадзін тут будуць працаваць стэнды па розных кірунках: сацыяльна-прававы, медыцынскія, спажывецкі і культурны.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ**

ISSN 1990 - 763X

Працягваецца падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2014 года!

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

**Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.**

**Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым калядным падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.**

| Індэкс/перыяд | 1 месяц | 3 месяцы | 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (для індывідуальных падпісчыкаў) | 47 500 | 142 500 | 285 000 |
| 63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 42 750 | 128 250 | 256 500 |
| 63858 (для ведамасных падпісчыкаў) | 95 300 | 285 900 | 571 800 |
| 63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 85 800 | 257 400 | 514 800 |

# АДУКАЦЫЯ ЯК УМОВА РОСКВІТУ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

**Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей МАСКЕВІЧ** паведаміў дэпутатам, што ўзровень задаволенасці спажыўцоў адукацыйных паслуг (бацькі, выпускнікі, працадаўцы), згодна з праведзеным маніторынгам, даволі высокі: у сярэднім вышэйшы за чатыры балы па 5-бальнай шкале.

— Гэта добры паказчык, але спецыялісты сістэмы адукацыі разумеюць, што знешнія выклікі, абумоўленыя глабалізацыяй, адкрытасць эканомікі краіны, а таксама неабходнасць яе інавацыйнага развіцця патрабуюць крытычнай ацэнкі як існуючай у рэспубліцы сістэмы адукацыі, так і зместу адукацыйных праграм і тэхналогій,— сказаў міністр.— Задача гэтых парламенцкіх слуханняў — паглядзець на сістэму адукацыі з пункту гледжання яе эфектыўнасці.

У адпаведнасці з Кодэксам аб адукацыі ў Беларусі функцыянуе больш як 9 тыс. устаноў асноўнай, спецыяльнай і дадатковай адукацыі. Большасць з іх — установы дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі. Цяпер выконваецца 7 мэтавых праграм развіцця ў сферы адукацыі, у адпаведнасці з якімі толькі за апошнія 3 гады пабудавана 40 дашкольных устаноў (на 6 тыс. 561 месца), 19 школ (на 8 тыс. 736 месцаў), 5 навучальных карпусоў ВНУ, 6 інтэрнатаў (на 5 тыс. 384 месцы). Адкрыта 16 новых кваліфікацый па праграмах падрыхтоўкі рабочых, 7 новых спецыяльнасцяў і 3 спецыялізацыі па праграмах падрыхтоўкі спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, 47 спецыяльнасцяў — па праграмах вышэйшай адукацыі 1-й ступені і 120 спецыяльнасцяў па праграмах магістратуры.

## У 322 КЛАСАХ — ПА АДНЫМ ВУЧНІ

Дынамічна развіваецца і карыстаецца даверам у насельніцтва сістэма дашкольнай адукацыі, заўважыў Сяргей Маскевіч. Утрыманне аднаго дзіцяці абыходзіцца дашкольнай установе Br1,49 млн за месяц пры сярэдняй заработнай плаце работнікаў Br2,9 млн. «Лічу, што будзе правільна, калі мы прымем дадатковыя захады нарматыўна-прававога і арганізацыйнага плана па развіцці платных паслуг у дашкольных установах, стымуляванні ўдзелу бацькоў у фінансаванні расходаў дашкольных устаноў»,— дадаў міністр.

Далейшае павышэнне даступнасці і якасці дашкольнай адукацыі міністр звязвае з рэалізацыяй праграмы будаўніцтва новых устаноў, развіццём здароўезберагальнага асяроддзя (удасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы патрабуе амаль 50 працэнтаў устаноў), павышэннем кампетэнтнасці спецыялістаў. Яшчэ адна важная задача — прыняцце мер па іх замацаванні ва ўстановах адукацыі. Сяргей Маскевіч падкрэсліў, што сёння ў дашкольных установах каля 450 вакантных ставак. У тым ліку ў Мінску — 300, у Мінскай вобласці — каля 100. Па ахопе дзяцей дашкольнай адукацыяй і падрыхтоўцы іх да школы Беларусь мае адны з самых лепшых паказчыкаў не толькі сярод краін СНД, але і ў свеце.

Разам з тым сетка агульнай сярэдняй адукацыі, якая склалася ў Беларусі, з эканамічнага пункту гледжання неэфектыўная, прызнаў міністр. Паводле яго слоў, у заканадаўстве адсутнічаюць якія-небудзь паказчыкі, што стымулююць эканомнае расходаванне сродкаў у сферы адукацыі і адначасова гарантуюць бюджэтную забяспечанасць з прывязкай да навучэнца або ўстановы. «У класе, напрыклад, можа быць адзін вучань. І такіх класаў у краіне сёння яшчэ 322. У іх працуюць каля 600 настаўнікаў»,— расказаў Сяргей Маскевіч. Апошнія гады Мінадукацыі сумесна з Міністэрствам фінансаў падрыхтавала шэраг нарматыўных прававых актаў, прызначаных змяніць сітуацыю.

## РАЗАМ З ПРАДПРЫЕМСТВАМ

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Генадзь ПАЛЬЧЫК** вылучыў асноўныя кірункі ўдасканалення заканадаўчай базы нацыянальнай сістэмы адукацыі: выкарыстанне модульных і дыстанцыйных тэхналогій; стварэнне адзінай адкрытай базы інфармацыйных рэсурсаў нацыянальнай сістэмы адукацыі; развіццё сістэмы інклюзіўнай адукацыі; увядзенне базавага і павышанага ўзроўню вывучэння прадметаў у сярэдняй школе; удзел Беларусі ў адпаведных міжнародных маніторынгавых даследаваннях.

— Больш эфектыўна і мэтанакіравана неабходна выкарыстоўваць матэрыяльна-тэхнічны і фінансавы патэнцыял заказчыкаў адукацыйных паслуг, а гэта і дзяржаўныя, і недзяржаўныя прадпрыемствы,— лічыць парламентарый.— Сёння запатрабавана сістэма ўзаемадзеяння сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі і ўстаноў вышэйшай адукацыі праз выкарыстанне скарочаных тэрмінаў навучання для студэнтаў. Менавіта яны складуць аснову для далейшай магістэрскай падрыхтоўкі.

Генадзь Пальчык таксама звярнуў увагу калег і ўрада на неабходнасць змен у сістэме кіравання адукацыяй, пашырэння паўнамоцтваў устаноў адукацыі, узроўню іх аўтаноміі. Ён прапанаваў прадугледзець у бюджэце на будучы год магчымасць пераразмеркавання фінансавых сродкаў унутры галіны адукацыі. Парламентарый агучыў патрэбу ў новых падыходах да атэстацыі навучэнцаў, скарачэнні дакументазвароту ў навучальных установах.

Пры гэтым, заўважыў старшыня парламенцкай камісіі, самай галоўнай умовай поспеху ўсіх новаўвядзенняў будзе павышэнне статусу педагога, што залежыць ужо не толькі ад заканатворцаў, але ад грамадства ў цэлым.

## БОЛЬШ СВАБОДЫ ВНУ

Прапанову пераходу у вышэйшай школе з бюджэтнага фінансавання да бюджэтнага субсідавання выказала **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзевай палітыцы Святлана ШЫЛАВА.**

— Дзяржава будзе заказваць у ВНУ месцы па запатрабаваных спецыяльнасцях; студэнт, які выбраў замоўленае месца, атрымлівае беспрацэнтны крэдыт, які будзе пагашаны дзяржавай пасля адпрацоўкі студэнтам па размеркаванні,— растлумачыла яна сваю ідэю.— Калі падчас навучання студэнт будзе адлічаны ці не адпрацуе неабходнага тэрміну, то няхай сам гасіць гэты крэдыт. Такім чынам, усе ВНУ апынуцца ў роўных умовах, працуючы па сістэме гаспадарчага разліку. Гэта ўмацуе сістэму вышэйшай адукацыі.

У сваю чаргу **рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта акадэмік Сяргей АБЛАМЕЙКА** выказаў думку пра тое, што заканадаўчая база павінна ствараць умовы для забеспячэння гнуткасці адукацыйнага працэсу.

— Цвёрдая рэгламентацыя ў рамках Кодэкса аб адукацыі, тыпавых штатных раскладаў ВНУ і іншых нарматыўных дакументаў абцяжарваюць укараненне адукацыйных інавацый,— сказаў ён.— Працуе падыход: усё, што не рэгламентавана і не дазволена,— забаронена. Не прадугледжаны нарматыўнымі дакументамі новыя формы правядзення заняткаў, няма магчымасці гнутка змяняць аб'ём аўдыторных заняткаў у залежнасці ад электронных сродкаў навучання і інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, якія выкарыстоўваюць выкладчыкі.

Сёння шэраг вядучых ВНУ становяцца цэнтрамі актыўнасці, пілотнымі пляцоўкамі для інавацыйных праектаў у вобласці электроннага навучання. «У гэтых умовах ужыванне ў дачыненні да гэтых ВНУ тыпавых штатных раскладаў, распрацаваных для ўсіх навучальных устаноў, непрымальнае»,— падкрэсліў рэктар. Па яго словах, вырашыць гэтыя праблемы простымі карэкціроўкамі і дадаткамі ў Кодэкс пра адукацыю і іншыя нарматыўна-прававыя акты нельга. «Установам вышэйшай адукацыі, у першую чаргу вядучым, трэба даць істотна большую ступень свабоды ў выбары зместу, формаў і тэхналогій адукацыйнага працэсу»,— лічыць Сяргей Абламейка.

На яго думку, адукацыя павінна быць гнуткай, даваць навучэнцу магчымасць выбару тэрмінаў, аб'ёму і зместу навучання. Людзі зацікаўлены ў атрыманні тых ведаў, якія ім патрэбны для прафесійнай дзейнасці «тут і цяпер» з улікам магчымасці далейшага бесперапыннага навучання. «Даводзіцца канстатаваць, што сучасная айчынная сістэма вышэйшай адукацыі з'яўляецца недастаткова гнуткай, бо модульнае навучанне, выбар тэрмінаў навучання і індывідуалізацыя графікаў навучальнага працэсу на нарматыўным узроўні ў нас практычна не рэалізаваны»,— рэзюмаваў ён.

Сяргей Абламейка таксама адзначыў, што практычна адсутнічае нарматыўна-заканадаўчая база для арганізацыі гнуткага дыстанцыйнага навучання. Хоць дыстанцыйнае навучанне — адна з асноўных формаў дадатковай адукацыі для дарослых, дзе як нідзе патрэбны гнуткасць і модульнасць навучальнага працэсу.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# СТАЛІЧНАЯ НЕРУХОМАСЦЬ «ПАХУДЗЕЕ»...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Сітуацыя падказвае, што выгадней за ўсё рэалізаваць жылы аб'ект да канца года. «Гэта разумеюць многія прадаўцы і таму актыўна канкурыруюць у барацьбе за пакупніка. Чакальная пазіцыя патэнцыяльных прадаўцоў пагражае апошнім яшчэ большым зніжэннем рынкавага кошту ўласнага жылля. Некалькі месяцаў экспазіцыі кватэры абыдуцца незгаворліваму прадаўцу стратай часу і грошай. Каб гарантавана прадаць кватэру, трэба ўмець спрагназаваць змены яе рынкавага кошту»,— патлумачыла эксперт.

Большасць здзелак на другасным рынку ўяўляюць «ланцужкі», пры якіх прадавец аб'екта шукае кватэру наўзамен. Па падобнай схеме цяпер ажыццяўляецца да 80% здзелак. На «падаючым» рынку вырашаць пытанне пашырэння жылплошчы прасцей, паколькі памяншаецца дэльта, якую неабходна даплаціць за пераезд у больш прасторную кватэру.

Разам з тым, у «ланцужку» звычайна прысутнічаюць больш за два прадаўцы, што значна ўскладняе рашэнне задачы. Падабраць спрыяльны варыянт замест кватэры, якая прадаецца, можна досыць хутка. «На «падаючым» рынку асабліваe значэнне маюць максімальны ахоп патэнцыяльных пакупнікоў, перагаворы ў дзень звароту і аператыўнае суправаджэнне здзелак. Пры правільным падыходзе прадаць старую і купіць новую кватэру можна ўсяго за некалькі дзён»,— упэўнена Святлана Кудзелка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Футбол

# «ДЫНАМА» РАЗВІТАЛАСЯ З МАСКАНТАМ

**Кіраўніцтва «бела-блакітных» скасавала кантрактнае пагадненне з 44-гадовым галандскім трэнерам.**

Пасля фінальнага свістка пераможнай гульні ў Жодзіне Роберт Маскант прызнаўся журналістам, што трэцяга месца налета для каманды будзе замала, мэта — барацьба за чэмпіёнства. Выглядаў ён бадзёрым, задаволеным вынікам, з поўнай кішэняй планаў на наступны год. І сапраўды, апошні адрэзак першынства сталічная дружына правяла выдатна — заняла першае месца ў першай шасцёрцы па набраных балах, напрыканцы перамагла БАТЭ і жодзінскае «Тарпеда», якое дынамаўцы ўжо даўно не маглі адолець. Балельшчыкі насамрэч не бачылі прычын для звальнення.

— Мінскае «Дынама» — клуб, які ставіць перад сабой максімальныя задачы ў кожным чэмпіянаце,— на адмысловай прэс-канферэнцыі кажа Сяргей Паўлюковіч, генеральны дырэктар «Дынама».— Таму мы хочам расці і рухацца далей у нашых выніках. Сёння ўпэўненасць ў тым, што пры гэтым трэнерскім штабе будзе паступовы рух наперад, у нас не ўзнікла.

Маскант, вядомы па працы з кракаўскай «Віслай» і з шэрагам галандскіх клубаў, узначаліў «Дынама» толькі ў чэрвені. Тады на капітанскім мосціку ён змяніў добра вядомага Алега Пратасава. За апошнія 14 гадоў галандзец стаў 27-м галоўным трэнерам каманды... Пераемнікам яго многія называюць айчыннага спецыяліста Алега Кубарава. Былы трэнер «Гомеля» зараз трэніруе «Зімбру» з Кішынёва. Аднак, як той казаў, няма дыму без агню. Паглядзім, што будзе далей.

**Тарас ШЧЫРЫ**

■ Хочацца верыць

# НАС ЧАКАЕ ЦЁПЛЫ СНЕЖАНЬ І КАЗАЧНАЕ НАДВОР'Е НА НОВЫ ГОД

**Пра гэта рэдакцыі паведаміў начальнік службы метэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрый Рабаў.**

Увогуле сёлета сярэднямесячная тэмпература паветра ў снежні чакаецца на 1 градус вышэйшай за норму, а па паўднёвым усходзе — каля яе (кліматычная норма складае 2–5 марозу). Месячная колькасць ападкаў прагназуецца ў межах сярэдніх шматгадовых значэнняў, калі кліматычная норма складае 38–57 мм.

Так, снежань — першы месяц зімы. Аднак атмасферныя працэсы, асабліва ў першай палове месяца, яшчэ захоўваюць рысы пераходнага сезона. Таму ў снежні нярэдка назіраецца няўстойлівае надвор'е са значнымі ваганнямі тэмпературы паветра. Часта першая пяцідзёнка і нават першая дэкада месяца бываюць вельмі цёплымі. І сёлета першая дэкада чакаецца на 1–2 градусы цяплейшай за норму.

Разам з тым у бліжэйшыя дні ў Беларусі чакаецца далёка не камфортнае надвор'е. У чацвер часам чакаюцца ападкі, у асноўным снег і мокры снег. Месцамі прагназуецца слабы галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. У многіх раёнах узмацненне ветру парывамі да 15–20 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень ад мінус 1 да плюс 4 градусаў. Сапраўды складаныя ўмовы надвор'я сіноптыкі абяцаюць нам у пятніцу, калі ў многіх раёнах будзе ісці снег, часам мяцеліца, на дарогах галалёдзіца. На большай частцы тэрыторыі краіны прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15–20 м/с, удзень па паўднёвым захадзе — месцамі да 21–24 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак у пятніцу ад мінус 3 да плюс 2 градусаў. Захаваюцца складаныя ўмовы надвор'я і ў суботу, калі часам чакаецца снег, мяцеліца, а на дарогах галалёдзіца. На большай частцы тэрыторыі ўзмацненне ветру парывамі да 15–20 м/с, уначы па паўднёвым захадзе месцамі да 21–24 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак ад 0 да мінус 6 градусаў. Часам снег, а месцамі мяцеліца чакаецца ў нядзелю. На дарогах галалёдзіца. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе мінус 3–9 градусаў, а максімальная ўдзень — ад 0 да 6 марозу.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у панядзелак уначы па заходняй палове, а ўдзень — на большай частцы тэрыторыі снег, у светлы час сутак у заходніх раёнах краіны чакаецца мокры снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Стане халадней. Мінімальная тэмпература паветра ўначы 6–12 марозу, пры праясненнях да мінус 14 градусаў, максімальная ўдзень — мінус 2–8 градусаў; па захадзе ўначы — ад 0 да мінус 5, удзень — ад мінус 1 да плюс 2 градусаў. Удзень месцамі, а ўначы на большай частцы тэрыторыі краіны будзе ісці снег і ў аўторак. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак мінус 2–8 градусаў, па паўночнай палове — да 9–14 марозу.

Падзяліўся прагнозам надвор'я Юрый Рабаў і на другую дэкаду снежня. У асобныя дні ў гэты перыяд прагназуецца кароткачасовы снег. На дарогах месцамі галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы мінус 1–8 градусаў, пры праясненнях, пераважна па паўночным усходзе, да 9–14 марозу, удзень — ад 0 да мінус 7 градусаў. У канцы дэкады па паўднёвым захадзе чакаецца мокры снег з дажджом, месцамі туман, галалёд, а тэмпература ўначы павялічыцца да 0 градусаў, а ўдзень — нават да плюс 1–3 градусаў.

Сіноптыкі падлічылі, што ў апошняй дэкадзе снежня ў асобныя дні будзе ісці снег. На дарогах месцамі галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы стабільна знізіцца да мінус 2–9 градусаў, а часам пры ўварванні халоднага арктычнага паветра — да 10–15 марозу, а месцамі па паўночным усходзе і да мінус 16–19 градусаў; удзень будзе пераважна ад 0 да мінус 7 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных экспертаў, у апошнія дні снежня ніякіх актыўных цыклонаў ці ўраганаў не прагназуецца. Уначы на 1 студзеня чакаецца казачнае спакойнае надвор'е. Часам будзе ісці снег. Тэмпература ўначы на гэта свята складзе ад мінус 2 да мінус 7 градусаў, удзень — ад 1 цяпла па паўднёвым захадзе, да 5–7 марозу па паўночным усходзе. У Мінску ў навагоднюю ноч будзе 5–7 марозу, удзень чакаецца мінус 3–4 градусы, часам снег. Спецыяліст адзначыў, што спраўджальнасць гэтага прагнозу складае каля 70%.

Асобна Дзмітрый Рабаў паведаміў рэдакцыі, што з надыходам зімы ўзмацняецца ўплыў Атлантыкі на наша надвор'е. Таму ўжо сёлета і напрыканцы зімы, а можа, і ўвесну сіноптыкі не выключаюць паўторнага завітання да нас новых моцных і экстрэмальных цыклонаў (кшталту «Хаўера»). Наадварот, спецыялісты прагназуюць, што падобныя анамальныя з'явы будуць турбаваць нашу краіну ўсё часцей.

**Сяргей КУРКАЧ**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# «ЧАСТКА ЎЛАДЫ ПРАЦУЕ НА РЭВАЛЮЦЫЮ»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Што да падзей 30 лістапада ў Кіеве... Самае страшнае ў гвалце — гэта гвалт, здзейснены «не да канца». Няздольнасць або нежаданне ўлады паслядоўна правесці тую ці іншую лінію. У апошнія гадзіны лістапада напружанне ва ўкраінскім грамадстве ўжо пачало спадаць. Было відавочна, што пратэстныя настроі згасаюць і ў хуткім часе сітуацыя стабілізуецца. Таму арганізатары перавароту і спонсары еўраінтэграцыі Кіева за мяжой тэрмінова шукалі падставы для таго, каб рэалізаваць свой сцэнар. І яны яго знайшлі — у выглядзе сілавой акцыі. Дакладней, стварылі — пры дапамозе сваіх «партнёраў» у блізкім акружэнні ўкраінскага прэзідэнта.

Безумоўна, сам разгон дэманстрантаў быў законным крокам. Але з пункту гледжання палітычнай мэтазгоднасці дастаткова было патрываць дзень-два, і пратэсты з'ехалі б на нішто.

Але ў выніку быў выбраны самы згубны спосаб вырашэння сітуацыі. Была праведзена сілавая акцыя. Пры гэтым ніякай асаблівай жорсткасці ў дзеянні праваахоўнікаў там не было: інфармацыя пра нібыта шматлікія ахвяры падзей на «майдане» не пацвердзілася. Але акцыя была праведзена, карцінка была прад'яўлена, і такім чынам была штучна паднята новая хваля пратэсту.

**— Гэта значыць, па сутнасці, улада сама стала арганізатарам беспарадкаў?**

— Не зусім так. Проста частка ўлады працуе на рэвалюцыю. Гэта сцэнар любой рэвалюцыі. Рэвалюцыя не можа перамагчы, калі ёй не падыгрываюць здраднікі з ліку дзейнай улады. Так расійская «ахранка» на пачатку XX стагоддзя супрацоўнічала з рэвалюцыянерамі, так было падчас французскай рэвалюцыі і гэтак далей.

Але ўрэшце такі працэс заўсёды выходзіць з-пад кантролю. І тыя здраднікі ва ўладзе, якія распальвалі пратэстныя настроі і арганізоўвалі правакацыі, апынуцца ў пройгрышы.

**— Як апазіцыя ўспрыняла сваю няздольнасць адправіць урад у адстаўку? Ці была рэакцыя на такі паварот падзей на вуліцах?**

— Так, гэта выклікала значны ўздым пратэстных настрояў. Але важна разумець наогул, што адбываецца ў Кіеве. На вуліцах людзі раздаюць лістоўкі з заклікамі да прамога звяржэння ўлады, да правядзення дзяржаўнага перавароту. Гэта крымінальнае злачынства. Але людзі спакойна раздаюць такія матэрыялы, ніхто на гэта не рэагуе.

Да гэтага часу не затрыманы і не пасаджаны ў турму ініцыятары беспарадкаў. Тыя, хто арганізоўваў штурм адміністрацыі прэзідэнта, іншыя сутычкі з міліцыяй.

Гэтая слабасць улады падагравае гвалт. Такая бяздзейнасць улады злачынная.

З іншага боку, тое, што «Партыя рэгіёнаў» не дала адправіць у адстаўку ўрад Мікалая Азарава, сведчыць аб наяўнасці разумных сіл і здольнасці іх кансалідавацца.

**— Што наогул цяпер адбываецца ў Кіеве? Якія будынкі заблакаваны? Ці працуе гарадскі транспарт?**

— Я зараз знаходжуся ў Вярхоўнай Радзе. Будынкі Кабінета Міністраў і Вярхоўнай Рады заблакаваныя. Але міліцыі і «Беркуту» ўдалося адціснуць аблажнікаў на сотні метраў, таму праца не спыняецца. Праваахоўнікі добра робяць сваю справу.

У цэлым жа сітуацыя ў горадзе звычайная, ідзе спакойнае жыццё. Працуюць кавярні, рэстараны, школы. Усё ідзе сваім парадкам. Напружанне ёсць толькі ў раёне галоўных адміністрацыйных будынкаў, Майдана.

**— У якой ступені адлюстроўваюць рэальнасць словы Уладзіміра Пуціна аб тым, што сённяшнія падзеі — гэта фальшстарт прэзідэнцкай кампаніі 2015 года?**

— Думаю, што гэтая ацэнка вельмі блізкая да рэальнасці. Я сам чакаў, што асноўныя падзеі будуць разгортвацца ў 2015 годзе, у перыяд прэзідэнцкіх выбараў.

Але, відаць, незгаворлівасць Януковіча ў зносінах з заходнімі калегамі згуляла фатальную ролю, і яны запусцілі гэты механізм ужо цяпер.

Вядома, улада сама шмат у чым вінаватая. Амаль тры гады кіраўніцтва краіны агітавала за еўрапейскі выбар, а цяпер літаральна сарвала стоп-кран. Разгарнуць ідэалагічную машыну ў адваротны бок адразу, у такі кароткі прамежак часу, фактычна немагчыма.

Больш за тое, «рэгіяналы» да гэтага часу так і не вылучылі ніякай альтэрнатыўнай дактрыны. Па сутнасці, «Партыя рэгіёнаў» працягвае агітацыю за «еўрапейскі выбар» нават цяпер.

**Падрыхтаваў Юрый ЦАРЫК.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ПРАЕКТ ДЗЕЛЯ НОВЫХ... ПРАЕКТАЎ

**Канферэнцыяй у Гродне стартаваў праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Планета ідэй», дзякуючы якому павінны з'явіцца новыя ідэі ў галіне прыцягнення інвестыцый для развіцця памежнага турызму.**

Праект ажыццяўляецца Гродзенскім абласным аддзяленнем грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз» і ўпраўленнем фізічнай культуры, спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама сумесна з партнёрамі з Беластока (Польшча) і Луцка (Украіна). Паводле слоў каардынатара праекта Сяргея Каляды, на Гродзеншчыне ўжо ёсць шмат прыкладаў інвесціравання ў рамках трансгранічных праектаў: па развіцці турыстычнай інфраструктуры польска-беларускага памежжа ў раёне Аўгустоўскага канала, стварэнні турысцка-інфармацыйных цэнтраў, папулярызацыі здаровага ладу жыцця, гісторыка-культурнай спадчыны, укараненні сучасных музейных тэхналогій... Разам з тым, нярэдка здараецца так, што ёсць даволі перспектыўныя ідэі, якія могуць разлічваць на фінансаванне па праграмах міжнароднай тэхнічнай дапамогі, аднак з-за нізкай якасці афармлення заявак гэта не атрымліваецца і інвестыцыі трапляюць да іншых. Таму ставіцца задача навучыць супрацоўнікаў грамадскіх арганізацый, мясцовых органаў улады, турысцка-інфармацыйных цэнтраў і іншых устаноў граматнай падрыхтоўцы і рэалізацыі трансгранічных праектаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## БЕСПРАЦОЎНЫХ СТАЛА НА 21% МЕНШ, ЧЫМ ЛЕТАСЬ

**У эканоміцы Беларусі ў студзені—кастрычніку сёлета было занята 4,526 млн чалавек, што на 1,2% менш, чым за адпаведны перыяд летась, паведамілі рэдакцыі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

Разам з тым, паводле інфармацыі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, колькасць беспрацоўных, зарэгістраваных у органах па працы гэтай галіны, на канец кастрычніка склала 21 тысячу чалавек, што на 21% менш, чым на адпаведную дату летась. Арганізацыямі (без уліку мікраарганізацый і малых арганізацый) у кастрычніку сёлета было прынята на працу 79,8 тысячы чалавек, у тым ліку на дадаткова ўведзеныя працоўныя месцы — 3,9 тысячы. За гэты час звольнена па розных прычынах 75,4 тысячы чалавек, з іх 7,3% было звольнена за прагулы і іншыя парушэнні працоўнай дысцыпліны, 0,7% — у сувязі са скарачэннем колькасці або штату работнікаў ці ліквідацыяй арганізацый.

Колькасць прынятых работнікаў арганізацыямі рэспублікі перавысіла колькасць звольненых на 4,4 тысячы чалавек.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ПРАГРАМІСТЫ З БДУ — У ФІНАЛЕ

**Каманда студэнтаў факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ, адзіная з Беларусі, здолела прабіцца ў фінал чэмпіянату свету па праграмаванні сярод студэнтаў. Трэцякурснік Аляксандр Некрашэвіч і студэнты чацвёртага курса Яўген Грыцкевіч і Аляксей Колесаў паспяхова выступілі ў паўфінале прэстыжных спаборніцтваў, якія праходзілі 1 снежня адначасова ў Санкт-Пецярбургу, Барнауле, Тбілісі і Ташкенце.**

Беларусь у Санкт-Пецярбуругу прадстаўлялі 9 каманд: ад БДУ — чатыры, ад БДУІР — дзве і па адной — ад Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта і Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Усяго ў паўфінале чэмпіянату свету, які праводзіўся сярод студэнтаў ВНУ паўднёва-ўсходняга Еўрапейскага рэгіёна, спаборнічалі 224 каманды з Беларусі, Расіі, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Украіны, Казахстана, Грузіі, Арменіі, Азербайджана, Кыргызстана і Узбекістана.

Фінал чэмпіянату свету па праграмаванні сярод студэнтаў адбудзецца ў чэрвені 2014 года. Удзельнікамі гэтага паядынку стануць 120 лепшых камандаў са 100 краін свету, у тым ліку студэнты Санкт-Пецярбургскага нацыянальнага даследчага ўніверсітэта інфармацыйных тэхналогій, механікі і оптыкі, якія ўжо неаднойчы перамагалі ў фінале, а таксама студэнты Маскоўскага дзяржаўнага і Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэтаў. Санкт-Пецярбург неафіцыйна лічыцца сусветнай сталіцай праграмавання. Такім чынам барацьба ў фінале для праграмістаў з Белдзяржуніверсітэта лёгкай не будзе.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ПАКАТАЛІСЯ...

**Два браты (аднаму з іх 19 гадоў, другому — 18) з вёскі Купяцічы Пінскага раёна, а таксама іх сябар з суседняй вёскі прыдумалі, на іх погляд, арыгінальную забаву. Юнакі кралі машыны ў Пінску, каталіся на іх, затым пакідалі транспартныя сродкі, дзе прыйдзецца.**

Так, адну з машын, уволю пагойсаўшы, кінулі каля вёскі Кудрычы, другую — у Падбалоцці, а трэцюю загналі аж у Іванаўскі раён. Чацвёртую хацелі ўгнаць, але яна не завялася. Усіх гора-«шумахераў» затрымала міліцыя. А суд Пінска і Пінскага раёна прыгаварыў да пазбаўлення волі аднаго — на тры гады, другога — на два з паловай і трэцяга — на два гады і тры месяцы. Так рэальным тэрмінам калоніі агульнага рэжыму скончыліся не вельмі разумныя забавы маладых людзей, якія нідзе не працавалі. Акрамя таго, ім давядзецца кампенсаваць пацярпелым матэрыяльны і маральны ўрон.

## ВІНОЎНІК ГІБЕЛІ — П'ЯНЫ КІРОЎЦА

**У Івацэвіцкім раёне на дарозе Косава — Няхачава загінула 31-гадовая веласіпедыстка. Аварыя адбылася ў светлы час сутак.**

Вадзіцель аўтамабіля «Сеат» ехаў у Косава. Ён збіў жыхарку вёскі Няхачава, якая ехала ў тым жа напрамку. Пазней у крыві кіроўцы зафіксавалі 2,1 праміле алкаголю. Сам ён сказаў, што выпіў прыкладна бутэльку гарэлкі... І сеў за руль. Заведзена крымінальная справа.

**Яна СВЕТАВА.**

## ВЫЙШАЎ У «МОРА» НА ПРОМЫСЕЛ...

**Больш за адзін кіламетр сетак знайшлі супрацоўнікі Мінскай міжрайінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету ў доміках на тэрыторыі летняй базы адпачынку, размешчанай на беразе Заслаўскага вадасховішча, або Мінскага мора.**

— База зараз не эксплуатуецца, аднак вартаўнікі там ёсць. Аднаго з іх і выкрылі ў незаконным промысле,— паведаміла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч.— Мужчыну разам з прыяцелем, які «зазірнуў на агеньчык», заўважылі на лодцы з сеткамі. Літаральна адразу на базу прыехалі дзяржінспектары. Агледзеўшы домікі, яны знайшлі свежую азёрна-рачную рыбу і 18 сетак з ячэйкамі рознага памеру — для лоўлі буйных і сярэдніх асобін. Браканьерам пагражае штраф у памеры да 50 базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## НЕ ДАЛІ «РАСТВАРЫЦЦА» МАБІЛЬНІКАМ І ПЛАНШЭТАМ НА 2,2 МЛРД

**Пры правядзенні мытнага кантролю грузавога аўтамабіля «Рэно» супрацоўнікі аддзела па барацьбе з кантрабандай і адміністрацыйнымі правапарушэннямі Ашмянскай мытні выявілі буйную партыю мабільных тэлефонаў і планшэтаў, якія незаконна перавозіліся праз мытную граніцу Мытнага саюза.**

Грузавік накіроўваўся з Літвы ў Расійскую Федэрацыю праз пункт пропуску «Каменны Лог». У грузавым адсеку аўтамабіля, як вынікала з дакументаў, перавозіўся груз у выглядзе эмаляў, растваральнікаў. Аднак падчас паглыбленага мытнага дагляду, зверкі даных, указаных у таваратранспартнай накладной, з таварам, які знаходзіўся ў грузавым адсеку, былі выяўленыя 765 тэлефонаў і планшэтаў, якія перавозіліся ў 40 каробках без дэкларавання.



Тавар, што перавозіўся з парушэннем мытнага заканадаўства, канфіскаваны. Згодна з папярэдняй ацэнкай, яго кошт складае каля 2,2 мільярда рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Акрыленыя марай

# ПТУШКІ, ЯКІЯ ПРЫНОСЯЦЬ ШЧАСЦЕ

**«Па дахах бегаць, галубоў ганяць...» — у гэтай песні спявалі пра настальгію па бесклапотным дзяцінстве і такіх жа забавах. Але, аказваецца, ганяць галубоў — справа вельмі карысная і патрэбная. Для птушкі лётных парод гэта вельмі важна. Аб тым, што прымушае аддаваць за аднаго голуба сто долараў, а пасля выдаткоўваць немалыя грошы на ўтрыманне, на што «хварэюць» усе заводчыкі галубоў і ці ёсць у нашай краіне будучыня гэтага захаплення, карэспандэнты «Звязды» пагутарылі з баранавіцкімі прадстаўнікамі Клуба галубаводаў і аматараў дэкаратыўных птушак.**

## «СЕРП» І... ГОЛУБ

Па расповедах Леаніда Зяленскага, птушкамі ён захапіўся ледзь не з пялёнак. Урыўкамі ў памяці захавалася, як на старой этажэрцы ў адным з пакояў нехта паставіў клетку з галубамі. Адкуль яны там з'явіліся, невядома. Мабыць, старэйшы брат прынёс. Ён таксама цікавіўся. А вось бацька Леаніда Зяленскага сваіх сыноў за «птушкаводства» не хваліў.

— Тады ж якое разуменне было: ты галубоў трымаеш — значыць жулік, бандыт і хуліган. Дзе толькі мы птушак ні хавалі: і ў хляве, і ў куратніку, і ў скрынках розных, — кажа Леанід Уладзіміравіч. — Зараз стаўленне зусім іншае.



Акрамя сярпаста-вываратных, у галубятні Анатоля Гулько знайшоўся цікавы дэкаратыўны голуб пароды «якабін».

Нясу, напрыклад, маладых галубоў, каб павучыць іх лятаць, сустракаю суседзяў, а яны адразу праяўляюць цікавасць, просяць унукам птушак паказаць.

У выніку бацьку ўсё ж давялося прымірыцца з галубятняй на гарышчы, а нашмат пазней Леанід Уладзіміравіч паставіў для сваіх гадаванцаў прасторны сімпатычны будыначак у двары.

У ім, а таксама ў невялічкай «прыбудоўцы» побач, жыве зараз некалькі дзясяткаў сярпаста-вываратных галубоў. Гэтых птушак так называюць з-за адмысловых, нібыта «завернутых» крылаў, якія па форме нагадваюць серп.

— Па прыгажосці палёту гэта лепшыя ў свеце галубы. У Баранавічах у часы майго дзяцінства шмат хто «ганяў галубоў», але больш простых. Паступова некаторыя людзі сталі прывозіць з Нікалаева, з Украіны, гэтых птушак са складаным палётам. У нас тады такіх не было. Такім патрэбны вецер, — распавядае Леанід Зяленскі, падкідаючы ў неба адну са сваіх галубак.

Чым вецер мацнейшы — тым прыгажэй птушка ляціць і «серп» крылаў яскравей праяўляецца. Дарэчы, лётаць наперад сярпаста-вываратныя галубы добра не ўмеюць. Толькі ўверх ці ўніз. Вось і птушкі з галубятні Леаніда Зяленскага, падкінутыя ў неба, паказваюць нам «веер» свайго апярэння.

Леанід Уладзіміравіч кажа, што, калі вецер аднясе птушку надта далёка, яна можа не прылятаць дадому па некалькі дзён. Калі голуб добры, моцны, ён часцей за ўсё прападае раней часу: ці ўзляціць занадта высока, ці трапіць у хмару, ці каршун яго зловіць.

Сёлета ў галубятні Леаніда Зяленскага вывелася 58 птушанят.

— Гэта няшмат. Я наўмысна не ганюся за колькасцю птушкі. Ужо ў ліпені я адсадзіў галубак у іншае памяшканне. Няхай адпачываюць, каб не было позніх птушанят, — распавядае ён. Такім не хапае часу ўвабрацца ў сілу, выліняць, як мае быць патрэніравацца лятаць. Самы лепшы час для з'яўлення на свет птушанят — гэта сакавік і красавік. Акурат тады выводзяць сваіх дзяцей пералётныя птушкі. Да восені яны паспяваюць і вырасці, і сонца ўбачыць, і палятаць, і сілы набрацца. Некаторыя людзі даюць сваім галубам імёны. У асноўным, па знешніх прыкметах.

— Напрыклад, гэтага будуць зваць «Тры на адну», з-за таго, што ў яго хвасце тры белыя пёры і адно чорнае, — тлумачыць Леанід Зяленскі.

Каб малыя не хварэлі, ім даводзіцца даваць лекі для прафілактыкі розных птушыных хвароб.

Але выгадаваць птушаня — гэта яшчэ палова справы. Галубаводы скардзяцца, што з канца 1990-х гадоў чамусьці паўсюдна вельмі размножыліся ястрабы. Яны «выбіваюць» усіх птушак. Калі адзін раз украў голуба з даху, ведай: вернецца зноў. Некаторыя з драпежнікаў нават не пужаюцца гняздзіцца ў горадзе. У Баранавічах, напрыклад, у выбоінах трубы ТЭЦ жыве дзве пары ястрабаў.

Леаніду Уладзіміравічу даводзіцца ад драпежніка галубоў хаваць.

— Зараз, напрыклад, у птушкі завяршаецца перыяд лінькі, яна мае шмат сіл і новае прыгожае пер'е. Трэба лётаць, але я закрываю іх і не выпускаю далёка, бо ястрабы тут як тут. У горадзе з-за гэтага некаторыя гаспадары галубоў не выпускаюць ужо два месяцы. Ад доўгага сядзення ў вальеры птушкі губляюць лётныя якасці, — распавядае ён.

## ВЫСОКІ ПАЛЁТ — НЕМАЛЫ КОШТ

У Баранавічах галубоў трымае 180 — 200 чалавек, але ў гарадскім Клубе галубаводаў і аматараў дэкаратыўных птушак удзельнічае недзе 30.

— Ёсць галубы лётныя. Да іх адносяцца, напрыклад, нікалаеўскія. Іх прыгажосць...



Любімыя галубы Леаніда Зяленскага.

...значэнне — праяўляць сябе ў палёце, — распавядае старшыня аб'яднання Уладзімір Кухарчык. — Каштоўнасць паштовых галубоў — у пераадольванні вялікіх адлегласцяў за як мага меншы час. Бойныя галубы лётаюць і робяць сальта ў паветры, шчоўкаючы крыламі. Калі іх ганяць у перыяд лінькі, яны могуць крылы разбіць у кроў. А вось дэкаратыўныя галубы, з чубамі, аперанымі нагамі, прыгожымі хвастамі, разводзяцца выключна для прыгажосці.

> **Тады ж якое разуменне было: ты галубоў трымаеш — значыць жулік, бандыт і хуліган. Дзе толькі мы птушак ні хавалі: і ў хляве, і ў куратніку, і ў скрынках розных.**

Па словах Уладзіміра Кухарчыка, нягледзячы на пэўную «элітнасць» такога занятку, як галубаводства, у Беларусі зарабіць на ім грошы, лічы, немагчыма.

— З усёй немалой колькасці баранавіцкіх заводчыкаў галубоў, можа, у двух ці трох чалавек птушкі сябе «акупаюць», а людзей, якім утрыманне птушак прыносіць прыбытак, яшчэ менш. Таму перш за ўсё развядзенне галубоў — гэта патрэба душы, а не магчымасць разбагацець.

А вось ва Украіне ці ў Бельгіі некаторым гэта сапраўды ўдаецца. Там галубы каштуюць нямала. Ва Украіне за пародзістага голуба просяць мінімум 100 долараў. У доме Леаніда Зяленскага вісіць сувенірны каляндар, які падарыў адзін з самых багатых людзей Украіны, бізнесмен Ігар Сало. Ён, аказваецца, таксама захапляецца развядзеннем галубоў. Пазнаёміцца давялося на «птушынай» выставе ў Харкаве. Ігар Сало спецыяльна шукаў лепшых птушак па ўсёй Украіне і адкрыў недалёка ад Еўпаторыі цэнтр па вывядзенні і рэабілітацыі сярпаста-вываратных галубоў. Месца выбіралі з дапамогай навукоўцаў. Там абавязкова павінны былі круглы год дуць вятры.

Відавочна, каб у развядзенні птушкі ўсё ішло добра, неабходна ўкладваць грошы. Па-першае, патрэбна пастаянна набываць новых галубоў, іначай птушкі «закроўліваюцца», выбіраючы сабе ў пару родзічаў. Па-другое, выдаткі ідуць і на ветэрынарнае абслугоўванне. У галубоў хвароб не менш, чым у людзей. Калі здарыцца, што адна птушка занядужае, можа хутка загінуць і ўся галубятня.

— Ветэрынара, які б разумеў нешта ў галубіных хваробах, знайсці немагчыма. З лекамі — тая ж справа, — кажа Уладзімір Кухарчык. — Аднойчы заходжу ў мясцовую ветэрынарную аптэку, стаў пытацца пра лекі для птушкі, а прадавец кажа: «Пачакайце, зараз дам вам тэлефон аднаго чалавека, ён дакладна дапаможа». Праз імгненне разумею, што прадавец дыктуе... мой нумар тэлефона. Таму ўсе неабходныя навыкі спасцігаем самастойна, а лекі набываем за мяжой.

Корм, як ні дзіўна, — самая бюджэтная графа выдаткаў. Галубы любяць самае рознае зерне: пшаніцу, ячмень, проса, гарох, сланечнік і г.д. Але гэта для «старэйшага пакалення». Маладым птушкам лепш даваць толькі ячмень і проса, каб птушкі былі лёгкімі і «лятучымі». У халодную пару года птушак кормяць раз на дзень, а ў цёплую — два разы.



Для сваіх гадаванцаў Леанід Уладзіміравіч пабудаваў прасторную галубятню.



У галубятні Анатоля Гулько.

## А РАДАСЦЬ АГУЛЬНАЯ...

Птушанят «свойскія» галубы выводзяць у спецыяльна падрыхтаваных гаспадаром гнёздах, падобных да гліняных глыбокіх місак. З самых першых дзён птушкі вельмі прывыкаюць да месца, дзе з'явіліся на свет.

— Як птушка вяртаецца да сваёй галубятні, ёсць многа меркаванняў, — распавядае Уладзімір Кухарчык. — Але дакладна тое, што ў іх развіта не адно пачуццё для таго, каб лепш арыентавацца ў прасторы. Ёсць версіі, што птушцы выбіраць маршрут дапамагае адчуванне магнітнага поля Зямлі, здольнасць адрозніваць пахі, а таксама зрокава запамінаць родныя мясціны. Праўда, апошняя здольнасць працуе тады, калі гаворка ідзе пра недалёкія адлегласці.

Акурат у гэты час мы пад'язджаем да дома Анатоля Гулько, яшчэ аднаго баранавіцкага заводчыка галубоў. Каля варот нас сустракае сам гаспадар і цікаўны даберман-пінчар па мянушцы Банан.

Акрамя сярпаста-вываратных, у галубятні Анатоля Гулько ёсць яшчэ паштовыя галубы.

— Іх я не выкарыстоўваю па прызначэнні, яны ў мяне проста для прыгажосці, — тлумачыць ён.

У гэты час з адкрытых дзвярэй галубятні на газон дружна выходзяць «сярпастыя». Банан, дарэчы, жыве з імі мірна, не чапае. У яго сабачай крыві — непрыязь выключна да катоў, якія абыходзяць двор бокам.

Што датычыць развядзення галубоў сёння, прыклад нават родных бацькоў, на жаль, не заўжды натхняе. Час цяпер іншы і інтарэсы іншыя.

— Зараз моладзь такім не захапляецца. Я, напрыклад, сына свайго не змог прывучыць галубоў разводзіць. Калі малы ўнук прыязджае, абавязкова вяду яго на галубятню. Але гэта для яго больш гульня, — кажа Леанід Зяленскі.

Па меркаванні Анатоля Гулько, уся справа ў тым, што раней дзеці бачылі цікавасць і задавальненне ад жыцця і ў рэальных, адчувальных рэчах. Зараз жа малыя вельмі моцна захоплены віртуальным светам.

Гледзячы на людзей, што маюць розныя лёсы і лад жыцця, але аднолькава захоплена назіраюць за палётам птушкі, захацелася пацікавіцца, што ж іх аб'ядноўвае:

— Як што, мы ж «хворыя», — аджартоўваецца Леанід Зяленскі. — Замест таго, каб плаціць сто долараў за птушку, лепш бы да доктара схадзілі і сваю «манію» палячылі. Як толькі збіраемся разам, бясконца абмяркоўваем галубоў і іх палёты.

А калі сур'ёзна, то заводчык галубоў — гэта чалавек пунктуальны і цярплівы. На паляванне ці на рыбалку можна пайсці, а можна і не пайсці. А даглядаць птушку трэба і ў дождж, і падчас водпуску, і калі дрэнна сябе адчуваеш. Для такога чалавека самая вялікая радасць, якая нібыта акрыляе, — гэта адчуваць надзею, што некалі ў цябе будзе птушка яшчэ лепшая, прыгажэйшая і мацнейшая, чым зараз.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**
*Мінск — Баранавічы — Мінск*

# УЛЮБЁНЫ Ў ЖЫЦЦЁ

**Менавіта такую назву далі новай экспазіцыі ў гомельскім філіяле Веткаўскага музея старaабрадніцтва і беларускіх традыцый і прысвяцілі яе заснавальніку і першаму дырэктару — Фёдару Шкляраву. Дарэчы, сам музей сёння носіць яго імя.**



Фотаздымак Фёдара Шклярава ў экспазіцыі.

Дзве даты сталі падставай — 35 гадоў таму Гомельскі аблвыканкам выдаў распараджэнне аб стварэнні новай установы культуры на аснове прыватнай калекцыі жыхара Веткі. І яшчэ адна — чвэрць стагоддзя, як Фёдар Рыгоравіч пакінуў гэты свет. Але ж сёння яго ўзгадваюць так, нібы ён яшчэ ўчора быў побач — такая сіла апантанай асобы.

Справа яго жыцця трапіла ў надзейныя рукі такіх жа апантаных людзей — дзвюх сябровак Галіны Нячаевай і Святланы Лявонцьевай, якія дагэтуль з'яўляюцца дырэктарам і галоўным захавальнікам музея адпаведна. Галіна Рыгораўна свой калектыў называе творчым і непаслухмяным:

— Мы прычыняем шмат турбот сваёй актыўнасцю.

Прадстаўнікі ўлад тым часам падкрэсліваюць, што менавіта за гэта і паважаюць музей і яго кіраўніцтва. Святлана Лявонцьева нагадвае асобныя старонкі біяграфіі Фёдара Шклярава:

— Мы ўсе яму абавязаны музеем. Ён валодаў вельмі многімі прафесіямі, але ж усё жыццё маляваў — з ранняга дзяцінства і да апошніх дзён. На жаль, яго мара аб атрыманні мастацкай адукацыі не спраўдзілася: перашкодзіла вайна і цяжкія гады пасля яе. Ён казаў, што не прыбіўся да прафесіяналаў, але адбіўся ад самадзейнасці.



Дзяўчына ў Веткаўскім строі на фоне малюнкаў Фёдара Шклярава.

Дарэчы, да Фёдара Шклярава ў Ветку, каб убачыць унікальную калекцыю старажытных кніг і ікон, прыязджалі вядомыя мастакі Арлен Кашкурэвіч, Барыс Забораў, Іван Рэй, Мікалай Казакевіч, пісьменнікі Янка Брыль, Эрнэст Ялугін, творчыя людзі з Расіі, іншых краін. Калі ўрачы яму паведамілі дыягназ і вызначылі тэрміны жыцця, ён не апусціў рукі, не стаў маркоціцца. Вырашаў: што яшчэ паспее зрабіць за паўтара адведзеных года.

— Ён выканаў сваю асабістую праграму — пабудаваў дом, пасадзіў не адно дрэва і выхаваў траіх дзяцей, — расказвае Святлана Лявонцьева. — Але гэтага яму было мала. Ён пабудаваў дом для нас усіх — Веткаўскі музей.

Складаны характар Фёдара Рыгоравіча ў жыцці яму і дапамагаў, і перашкаджаў. Ён мог любому сказаць тое, што хацеў, — таму няпроста было яму жыць сярод тых, хто лічыў неабходным думаць адно, казаць другое, а рабіць — іншае. З упартасцю змагаўся са шматлікімі перашкодамі. Як моцны ледакол, пракладваў свой шлях у цісках непаразумення і абыякавасці.

У сённяшняй гомельскай экспазіцыі прадстаўлены алоўкавыя замалёўкі і карціны алеем, фотаздымкі і сталярныя інструменты Фёдара Шклярава, а таксама — новыя рарытэтныя набыткі, якія сталі экспанатамі музея дзякуючы матэрыяльнай дапамозе Гомельскага аблвыканкама. Сем унікальных старажытных ікон і акладаў папоўнілі калекцыю. Сярод іх — абраз свяціцеля Міколы Цудатворца. Між іншым, з такога ж калісьці, у 60-я гады мінулага стагоддзя, пачыналася прыватная калекцыя Фёдара Шклярава.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота Мікалая ШКЛЯРАВА.**

■ Жамчужыны Айчыны

# ЗАХАВАЕМ РУМЛЁВА РАЗАМ!

## Або Рэаліі ўнікальнага лесапарку



Воданапорная вежа 1980-га ў парку Румлёва.

**Беларускай сталіцы, ды і практычна ўсім абласным цэнтрам краіны, пашанцавала з лесапаркамі ў гарадскіх межах. Гродзенцам, напрыклад, мінуўшчына перадала ў спадчыну два буйныя лесапаркі Румлёва і Пышкі, а таксама ўрочышча Ласосна. Іх значэнне для горада з пункту гледжання экалогіі, якасці паветра і адпачынку людзей проста каласальнае. Гэта ніхто і не аспрэчвае. Іншая справа, што экалагічныя каштоўнасці лесапаркаў далёка не заўсёды знаходзяцца ў гармоніі з эканамічнымі і іншымі рэаліямі вялікіх гарадоў. У чым гэта праяўляецца і якім можа быць кампраміс, сёння можна назіраць на прыкладзе гродзенскага лесапарку Румлёва.**

Неўзабаве павінны адбыцца грамадскія слуханні па абмеркаванні праекта добраўпарадкавання лесапарку Румлёва. А папярэднічаў ім сход зацікаўленых прадстаўнікоў грамадскасці, мясцовых улад, прыродаахоўных органаў. Ён адбыўся ў гімназіі № 1, якая мяжуе з паркам і дзе ўжо даўно з першага класа ажыццяўляецца праграма экалагічнай адукацыі.

Меркаванне, што лесапарку патрэбна канцэпцыя добраўпарадкавання з улікам яго прыродаахоўнага статусу, навукоўцы і грамадскія актывісты выказвалі ўжо неаднойчы. А вось дакладнай пазіцыі ўладных структур доўгі час не было. Нават агучваліся ідэі абсталяваць там стадыён, тэнісныя корты. «Момант ісціны» надышоў каля 3 гадоў таму, калі ў горадзе ўзяліся за навядзенне парадку ў лесапаркавых зонах.

— Вучоныя тады падказалі, што можна рабіць у Румлёве, а чаго нельга, — кажа **кардынатар навуковай часткі праекта па добраўпарадкаванні лесапарку Віталь ГУМЕННЫ.** — Але на справе, на жаль, атрымалася інакш: улезлі ў парк з цяжкай тэхнікай, асфальтаваннем, прычыніўшы шкоду дрэвам, кустоўю і падлеску, дзе гняздуюцца птушкі. Грамадскасць паднялася, дайшлі нават да прыродаахоўнага міністэрства, — і падобнае «добраўпарадкаванне» прыпынілі. Былы мэр горада Барыс Казялкоў даў указанне ўзгадняць усе дзеянні з навукоўцамі.

### ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

**Тэрыторыя, якая цяпер называецца»Румлёва, уяўляе сабой унікальныя рэшткі трох прыпойменных тэрас Нёмана, што ўтварыліся ў выніку дзейнасці ледавікоў. Паркавая частка, у адрозненне ад іншых у Гродне, з'яўляецца не проста лясным масівам, а аб'ектам садова-паркавага мастацтва, мае юрыдычны статус помніка прыроды мясцовага значэння. Грабы, вязы, клёны, 200-гадовыя ці нават яшчэ старэйшыя дубы, акацыі... Сярод флоры і фаўны — шэраг відаў, занесеных у Чырвоную кнігу і яе прафілактычны спіс: прадстаўнікі рэдкіх імхоў, лішайнікаў, групы першацветаў, зялёны дзяцел... Румлёўскія дубы памятаюць розных уладальнікаў сядзібы, што тут размяшчалася, а таксама пісьменніцу Элізу Ажэшка, педагога і стваральніка заапарка Яна Каха765ўскага, заснавальніка музея прыроды Станіслава Жыўну і іншых знакавых для Гродна асоб. І, безумоўна, існуе вялізны пласт ваеннай гісторыі: у гэтай мясцовасці размяшчаліся царскія, польскія, нямецкія, савецкія войскі...**



Нават у будны дзень нам сустрэлася шмат адпачывальнікаў.

З гэтага моманту ў нас з гарвыканкамам ёсць, наколькі гэта магчыма, узаемаразуменне, распачалася работа над праектам добраўпарадкавання лесапарку.

По кожным канкрэтным выпадку спецыялісты гарадскога ўпраўлення ЖКГ, «Гродназелянбуда», якія адказваюць за парадак у лесапарку, цяпер раяцца з вучонымі. Румлёўскую тэрыторыю «маніторыць» прыродаахоўная служба.

— Гэта помнік прыроды мясцовага значэння, які знаходзіцца пад аховай дзяржавы. Там не дапускаюцца ўзвядзенне пабудоў, пракладка новых дарог, праездаў, стаянак аўтатранспарту, распальванне вогнішчаў, выгул сабак, правядзенне работ, звязаных з парушэннем зямель і змяненнем гідралагічнага рэжыму тэрыторыі. Мы надзелены адміністрацыйным рэсурсам і прыцягваем да адказнасці за шкоду помніку прыроды, — зазначае **начальнік Гродзенскай гарадской інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Вадзім ПАЛЯКОЎ**.

Што ж датычыцца праекта добраўпарадкавання паркавай часткі Румлёва (9 гектараў), то да яго падрыхтоўкі прыцягнулі групу з 18 вучоных у сферах археалогіі, біялогіі, адукацыі, гісторыі. Яны правялі даследаванні біялагічнай разнастайнасці і стану культурна-гістарычнай спадчыны прыроднага помніка.

У прыватнасці, звярнулі ўвагу на вельмі сур'ёзную пагрозу лесапарку — эрозію глебы. Гэтыя працэсы імкліва прагрэсуюць, тры вялікія равы растуць не толькі ў глыбіню, але і ў шырыню, даўжыню. Адна з галоўных прычын — разбурэнне сістэмы адводу сцёкавай вады: яна ідзе па паверхні парку, паскараючы эрозію, і калі так будзе працягвацца, то паркавую частку Румлёва папросту змые ў Нёман. Моцна пацярпела брукаваная дарога XIX стагоддзя, новыя раўкі з'явіліся на прыбярэжных палянах. Таму неабходна аднавіць сістэму адводу вады, тэрмінова правесці проціэразійныя мерапрыемствы, каб запаволіць, а затым і спыніць ровaўтварэнне.

— Пры гэтым ні ў якім выпадку ў парку не павінна працаваць цяжкая тэхніка, нельга выкарыстоўваць матэрыялы і тэхналогіі іх укладкі, якія могуць прывесці да падмывання грунту пад канструкцыямі. Гэта пагражае ўтварэннем новых равоў і стратай унікальнай экасістэмы. Хочацца спадзявацца, што ў бліжэйшай перспектыве знойдуцца сродкі на проціэразійныя мерапрыемствы, — кажа Віталь Гуменны.

Разам з тым, гэтая экасістэма ў сувязі са знаходжаннем побач буйнога раёна жылой забудовы, дзе пражывае каля 15 тысяч людзей, не можа быць нейкай прыроднай рэзервацыяй. У чым аўтар гэтых радкоў пераканаўся падчас прагулкі па парку разам з Віталем Гуменным у якасці гіда. Нават у будны дзень нам сустрэлася шмат адпачывальнікаў — на лаўках, з дзецьмі ў калясках. Відавочна, што варыянт захавання помніка прыроды шляхам агароджы з абмежаваннем доступу людзей не падыходзіць. Але як улічыць і каштоўнасці лесапарку, і сённяшнія рэаліі?

З планам добраўпарадкавання паркавай часткі Румлёва ўдзельнікаў сходу азнаёміў аўтар праекта, архітэктар Аляксандр ШТЭН. Ён лічыць, што глабальная праблема парку — гэта эрозія глебы, равоў, якія паглыбляюцца. Вырашэнне гэтай праблемы патрабуе вялізных выдаткаў, якія былі вымушаны аднесці на другую чаргу праекта. А канцэпцыя першай чаргі праекта, якая цяпер выносіцца на абмеркаванне грамадскасці, — у тым, каб знайсці разумны кампраміс паміж прыроднымі абмежаваннямі і гарадскімі функцыямі лесапарку «Румлёва» як зоны адпачынку.

— Мы і прыроду любім, і хочам ёю карыстацца. Але калі не ўрэгуляваць схему знаходжання тут людзей, то парку прыйдзе канец, — лічыць Аляксандр Штэн.

Пра стадыён і тэнісныя корты размова ўжо не ідзе. Праўда, у праекце ёсць так званая фальклорная пляцоўка для мерапрыемстваў мікрараёна. Аднак калі грамадскасць будзе супраць такой нагрузкі на прыродны комплекс, то без гэтага, кажа Аляксандр Штэн, можна абысціся. Як і без выкарыстання паркавых алей для пракату дзіцячых машынак. А вось пасадка ў парку новых дубоў, а таксама ўшанаванне гісторыі парку скульптурнымі кампазіцыямі, пэўна, праціўнікаў не знойдуць.

Акрамя таго, патрабуюць увагі пабудаваная ў 1930 годзе воданапорная вежа, румлёўскія крыніцы, кансервацыя рэштказ сядзібы ...

Дарэчы, падчас прагулкі па лесапарку да нас з Віталем Гуменным звярнулася жанчына, якая катэгарычна супраць правядзення тут забаўляльных мерапрыемстваў, а заклапочана найперш лёсам дубоў, якім шкодзіць праведзенае асфальтаванне. Аднак так думаюць далёка не ўсе. Нядаўна, напрыклад, правялі апытанне па тэме прыродазберажэння сярод дзяцей мікрараёна, што мяжуе з Румлёва. Што ў выніку? Так, ёсць заклапочанасць пра дрэвы, кармушкі для птушак. Аднак большая частка рэспандэнтаў думае найперш не пра ахову прыроды, а пра атрыманне максімальнага камфорту ад наведвання лесапарку: ёсць прапановы пабудаваць там кавярню, спартыўны комплекс, валейбольную пляцоўку, канатную дарогу, фунікулёр ...

Як бачым, лёс Румлёва залежыць не толькі ад граматных праектаў па зберажэнні помніка прыроды...

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА**

# «ПТАШКІ РАННІЯ»

**У 10-й сталічнай гімназіі адбыўся гала-канцэрт конкурсу «Пташка ранняя». Гэты конкурс быў аб'яўлены гукавым часопісам «Таварыш» Беларускага таварыства інвалідаў па зроку.**

Конкурс прызначаўся для дзетак з парушэннямі зроку. Удзел у ім прынялі, галоўным чынам, выхаванцы адпаведных спецшкол. Мэтай яго было выявіць і падтрымаць таленты ў сферы вакальнага мастацтва — і дзякуючы гэтаму сацыялізаваць такіх дзяцей, уключыць іх у грамадства. У журы ўваходзілі «зоркі» беларускай эстрады, сярод якіх Іна Афанасьева, Ядзвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч і інш. На гала-канцэрце выступілі прызёры конкурсу і беларускія спевакі.

**Святлана БУСЬКО.**



Дыпламанты конкурсу разам з Аляксандрам ЦІХАНОВІЧАМ і Ядзвігай ПАПЛАЎСКАЙ.

■ Май на ўвазе!

## СА СНЕЖНЯ — ПРАМЫЯ РЭЙСЫ З ВІЛЬНЮСА Ў МІНСК

**З 19 снежня будуць адкрыты прамыя авіярэйсы з Вільнюскага міжнароднага аэрапорта ў Мінск. Рэйсы (8 разоў на тыдзень) пачне ажыццяўляць беларуская кампанія «Белавія» самалётамі «CRJ-100/200», якія змогуць узяць на борт 50 пасажыраў. Білеты можна будзе набыць як у агенцтвах, так і ў інтэрнэце.**

«Прымаючы рашэнне пачаць лятаць у гэтым напрамку, мы перш за ўсё думалі пра нашых пасажыраў, якія цяпер едуць з Мінска ў Вільнюс. Акрамя таго, гэты маршрут будзе зручны для транзітных пасажыраў з краін СНД. Пачынаючы палёты са снежня, мы спадзяёмся на высокі перадсвяточны паток пасажыраў», — сказаў генеральны дырэктар кампаніі «Белавія» Анатоль Гусараў.

Самалёт з аэрапорта «Мінск-2» у Вільнюс па панядзелках, суботах і нядзелях будзе лятаць два разы на дзень, па чацвяргах і пятніцах — адзін раз. Гэта будзе адна з самых кароткіх авіяліній у Еўропе. Палёт будзе доўжыцца ўсяго 40 хвілін. Кошт квітка ў эканом-класе — ад 62 еўра.



«Мы вельмі рады, што нашы перамовы з кампаніяй «Белавія» завяршыліся паспяхова. Гэтае супрацоўніцтва будзе ўзаемавыгадным. Пасажыры атрымаюць хуткі і зручны транспарт. Акрамя таго, транзітныя пасажыры, якія прыляцелі з Мінска, змогуць дзякуючы стыковачным рэйсам хутчэй дасягнуць многіх гарадоў Еўропы. Вільнюс злучаны з 43 аэрапортамі, якія знаходзяцца ў 22 краінах. Мы ўпэўнены, што новы маршрут будзе спрыяць далейшаму ўмацаванню дзелавых і іншых сувязяў паміж Літвой і Беларуссю, становуча паўплывае і на эканоміку», — сказаў карэспандэнту «Звязды» генеральны дырэктар Вільнюскага міжнароднага аэрапорта Гедымін Алмантас.

Вільнюс для Мінска стане 46 горадам, з якім кампанія «Белавія» будзе мець рэгулярныя зносіны.

**Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,**
**уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве.**
*г. Вільнюс.*

# Да любімай цешчы... з «Яндэксам»

**Беларусь — адзіная краіна ў свеце, дзе дзве буйныя пошукавыя сістэмы («Яндэкс» і Google) роўна напалову падзялілі аўдыторыю. Менавіта таму Беларусь для расійскай IT-кампаніі даўно з'яўляецца асобнай нішай на рынку. І прадставіўшы ў Мінску новы праект «Навігатар», «Яндэкс» у чарговы раз нагадаў, што ён не толькі «добрая альтэрнатыва Google», а таксама якасная падборка карысных сэрвісаў.**

Як адзначае менеджар службы аўтамабільнай маршрутызацыі «Яндэкса» Яўген Грабеннікаў, новы сэрвіс узнік на платформе ўжо добра «раскручаных» — «Карты», «Заторы», «Маршруты» і «Пошук». Так, дадаткам «Карты» кожны месяц карыстаецца больш за 500 тыс. беларусаў, з якіх 100 тыс. падключаюцца з мабільных прылад. Але тое, што мы бачым на экранах сваіх тэлефонаў ці планшэтаў, — гэта толькі інтэрфейс. «Карцінка» па сутнасці, нішто без аб'ёмных баз звестак, якімі валодае «Яндэкс». Таму расійская кампанія асабліва ўважліва ставіцца да сістэматычнага абнаўлення сваіх рэсурсаў.

Напрыклад, зусім нядаўна «Яндэкс» запусціў сусветнае пакрыццё картаграфічных даных. Прасцей кажучы, у карыстальнікаў цяпер ёсць магчымасць пракласці маршрут у Аўстралію ці Эквадор. Некаторыя карты (краіны Паўночнай Амерыкі і Еўропы) вельмі добра дэталізаваны: на іх можна адшукаць практычна любы дом ці іншы будынак. А карты «стратэгічна важных тэрыторый» — Расіі, Украіны, Казахстана (і ў тым ліку Беларусі) — увогуле абнаўляюцца кожны месяц. І, дарэчы, кожны з карыстальнікаў сэрвісу мае магчымасць скарэктаваць штосьці, калі закралася памылка. Дадатак «Заторы» дапамагае аўтамабілістам пазбегнуць праблем на дарогах, паказваючы на картах месцы ДТЗ, дарожна-будаўнічых работ ці затораў. Заканамерна, што расійскія распрацоўшчыкі аб'ядналі ўсе свае «дарожныя» сэрвісы ў адзін.

Паводле слоў Яўгена Грабеннікава, асноўная перавага «Навігатара» — тое, што ён выбірае самы аптымальны маршрут. «Сэрвіс працуе анлайн, таму сітуацыя на дарогах абнаўляецца ў рэжыме рэальнага часу. І пракладзены маршрут можа быць зменены, калі, напрыклад, наперадзе — затор. «Навігатар» «прапануе» вадзіцелю новы маршрут, з якім можна пагадзіцца ці не. У адрозненне ад іншых навігатараў, ён выступае ў якасці дарадцы, а не ментара, які нават не папярэджвае, што маршрут перабудаваны». Акрамя таго, зручна, што «Навігатар» кіруецца з дапамогай галасавых каманд. Напрыклад, у мабільніку можна «запомніць» самы прывычны маршрут, даць яму назву, і ў наступны раз дастаткова будзе сказаць «Паехалі да цешчы!», каб трапіць туды, куды трэба.

Новы дадатак даступны для аперацыйных сістэм Android, iOS і Windows8. Так што ўладальнікі сучасных «гаджэтаў» ужо могуць пампаваць карысную навінку.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

■ Птушыныя лёсы

# СТУДЭНТЫ ДАПАМАГЛІ АРЛАНУ ВЫЖЫЦЬ

## Крылаты сімвал Беларусі атрымаў новую сям'ю

**У апошні дзень кастрычніка на 9-м кіламетры ад горада Баранавічы вайскоўцы знайшлі птушку буйных памераў, якая самастойна перасоўвацца ўжо не магла. Потым крылаты драпежнік быў дастаўлены на баранавіцкую станцыю юных натуралістаў.**

Пасля агляду птушкі спецыялістамі стала зразумела, якую каштоўную знаходку прывезлі юннатам добрыя людзі: гэта быў арлан-белахвост, занесены ў Чырвоную кнігу нашай краіны. Памеры птушкі ўражвалі, бо размах крылаў дасягаў 220 сантыметраў, а вага — больш за 5 кілаграмаў.

У птушкі было паранена правае крыло. Набліжаліся халады, а з такой траўмай самастойна арлан мог бы і не выжыць. На жаль, у нашай краіне няма спецыяльных цэнтраў, дзе можна пакінуць параненую птушку. У сувязі з гэтым **грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны»** (АПБ) не так даўно падтрымала петыцыю-зварот аб стварэнні арніталагічнага рэабілітацыйнага цэнтра для лячэння дзікіх птушак з далейшым іх вяртаннем у натуральнае асяроддзе.

Аказаць медыцынскую дапамогу арлану-белахвосту пагадзіўся Гродзенскі заапарк, у якім на той час пражывала тры такія ж птушкі. Аднак сродкаў, каб пераправіць белахвоста на новую радзіму, не было.



Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт, а менавіта студэнты факультэта педагогікі і псіхалогіі, аказалі крылатаму сімвалу нашай краіны слушную дапамогу, сабраўшы неабходную суму для пераезду, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе АПБ. Студэнтка Юлія Гурына пагадзілася суправадзіць арлана ў гэтую далёкую дарогу. Літаральна на руках добрай спадарыні Юлі 16 лістапада птушка была дастаўлена ў Гродзенскі заапарк, дзе яе гасцінна сустрэлі ветэрынары і адміністрацыя. Птушка прабудзе на каранціне каля трох тыдняў. Пазней арлана паспрабуюць падсяліць у клетку да астатніх птушак, дзе для іх створаны дастаткова добрыя ўмовы.

Дзякуй усім тым, хто аказаў дапамогу ў ратаванні птушкі.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Жывуць жа людзі!

# НІЧОГА НЕ ПРАСІЦЬ, СПАДЗЯВАЦЦА НА СЯБЕ —

## такая «філасофія» шматдзетнай сям'і Навошаў не ўсім зразумелая

**У беларускіх вёсках жыве нямала людзей, на якіх, можна сказаць, трымаецца сельская гаспадарка. Хтосьці іх не любіць, здзекліва называючы кулакамі. А нехта — валадарамі вёскі — у добрым сэнсе слова. Менавіта яны не просяць нічога ў дзяржавы, спадзяюцца на асабістыя сілы, на здаровы сялянскі розум і працавітыя рукі. І сваёй справай мацуюць не толькі дабрабыт сям'і, але прымнажаюць грамадскі набытак. Мне пашчасціла пазнаёміцца з такой сям'ёй у вёсцы Сейлавічы, што на Нясвіжчыне.**

Прайсці міма падворка Івана і Вольгі Навошаў і не заглянуць сюды проста немагчыма. Перад вокнамі пад заценню галінак вінаграду — процьма амшэлых пнёў! Мне спачатку падалося, што яны змешчаны тут знарок — для «карцінкі».

— Ды не, — смяецца Іван Аляксандравіч. — На гэтых карчах мы вырошчваем вешанкі.

Ніхто іх спецыяльна не разводзіў. Гадоў пяць таму гаспадар прывёз дровы ды скінуў за хлявом. А праз нейкі час на іх пачалі з'яўляцца грыбы, якія вырашылі рассадзіць на спецыяльна расстаўленых для гэтага пнях. Што цікава, яны прыжыліся, а на другі год літаральна абляпілі драўляныя калоды. Такая прыгажосць была! Хтосьці дзівіўся, а нехта і зайздросціў: маўляў, багатаму і чорт дзяцей калыша, хоць ураджаем гаспадары шчодра дзяліліся з усімі ахвотнымі. Сям'я Навошаў, па вясковых мерках, сапраўды не бедная. Але гэтая заможнасць дастаецца нялёгка, і, перш за ўсё — працай, пра што мала хто з зайздроснікаў узгадвае.

У Івана і Вольгі вялікая падсобная гаспадарка: чатыры каровы, конь, свойская птушка, в'етнамскія парсючкі ды свінка Машка, якую выйгралі ў конкурсе падчас свята «Валадар сяла».

А да нядаўняга часу Іван працаваў... дворнікам у сельсавеце.

— Лепшага работніка цяжка знайсці: адказны, дысцыплінаваны, старанны, выдатна спраўляўся са сваімі абавязкамі, — распавёў старшыня Сейлавічскага сельвыканкама Васіль Чычко. — Цяпер перайшоў даглядчыкам на новую малочнатаварную ферму, якую нядаўна пабудавалі.

Старэйшай Вользе хутка споўніцца 16 гадоў. Куды будзе паступаць, пакуль не вызначылася. У 15-гадовай Каці і 13-гадовай Іны таксама планы наконт будучай спецыяльнасці часта мяняюцца.

— Прыкладна ў іх узросце я паступіў у тэхнікум на электрамеханіка, але вучобу кінуў. Паехаў са старэйшым братам на Поўнач, на заробкі, — згадвае бацька. — Давучваўся ў вячэрняй школе, адначасова набываў спецыяльнасць. І ніколі пра гэта не пашкадаваў. Пабачыў свет, сустрэўся з цікавымі людзьмі. Так і дачушкі. Няважна, якім шляхам пойдуць — галоўнае, каб былі спагадлівымі і працавітымі, нічога дрэннага ў жыцці не рабілі.

У Сейлавічах сям'я Навошаў пасялілася ў 2001 годзе. Купілі дом, дзе ёсць усё для нармальнага жыцця: прыродны газ, водаправод, цэнтральнае ацяпленне, каналізацыя. Але плошчы зараз, вядома ж, малавата: 45,2 кв.м (тры пакоі на шасцярых). Вользе дастаўся асобны, Каця з Інай жывуць у другім, а бацькі з Ангелінай — у зале.

**У Івана і Вольгі вялікая падсобная гаспадарка: чатыры каровы, конь, свойская птушка, в'етнамскія парсючкі ды свінка Машка, якую выйгралі ў конкурсе.**

Іван і Вольга змаглі стварыць сапраўдную сям'ю — дружную і працавітую. У іх чатыры цудоўныя дачушкі: Вольга, Каця, Іна і Ангеліна. У кожнай з дзяўчынак свае хатнія абавязкі: адна каровак даглядае, другая — свінак корміць, трэцяя — у доме прыбірае. І нават трохгадовая Ангеліна імкнецца дапамагчы маме: калі тая адвернецца, малая бяжыць на кухню. Вельмі дасціпная, дапытлівая і кемлівая не па гадах. Ёсць з каго браць прыклад — з старэйшых сястрычак. Праўда, яны, вяртаючыся са школы, злуюцца, што малая навяла «парадак» у пісьмовым стале, ці ў камп'ютары.

— У цэлым усе змяшчаемся, — жартуе Іван Аляксандравіч. — А калі сур'ёзна, то не за гарамі час, калі старэйшыя дзеці павылятаюць з бацькоўскага гнязда, каб віць сваё, уласнае...

Вользе і Івану няма і сарака. Што прымушае яшчэ маладых людзей так трымацца за падсобную гаспадарку?

— Прыродная працавітасць. Ды і дзеці падрастаюць — трэба думаць пра іх будучыню. З пачатку гэтага года Навошы ўжо здалі амаль 17 тон малака дзяржаве. Нават з улікам затрат, што ідуць на догляд, трымаць кароў выгадна, — лічыць старшыня сельвыканкама. — Адкрытае акцыянернае таварыства «Сейлавічы» выдзяляе для патрэб жывёлы пашу, падкормлівае кароў, скошвае траву.

— Так, — згаджаецца з кіраўніком улады гаспадар, — выгадна. Гэта добры дадатак да сямейнага бюджэту. У мяне ёсць уласны электрапастух, якім магу абгарадзіць да 3 гектараў пашы, два генератары, адзін працуе на батарэйках, другі — ад сонечнай энергіі. Калі прыходзіць мая чарга пасвіць кароў, то многія сяльчане просяць, каб пусціў іх жывёлу ў электразагарадзь.

З кармамі на зіму таксама няма асаблівай праблемы. За здадзенае цяля сельгасарганізацыя выдзяляе зерне — 20 кілаграмаў за кожны кілаграм жывой вагі. Акрамя таго, дае два рулоны саломы і два рулоны сена. «На ўсю жывёлу гэтага не хапае, таму сена дадаткова нарыхтоўваем самі або дакупляем у іншых гаспадарках, — канстатуе Іван Аляксандравіч. — А ў цэлым мы задаволены».

Каровы дояцца электрычнай перасоўнай устаноўкай. У дбайных гаспадароў ёсць і сепаратар для перагонкі малака і атрымання вяршкоў. Не супраць яны і пашырыць свае ўладанні. Але пакуль не хапае часу: Іван Аляксандравіч, можна сказаць, днюе і начуе на ферме. Паспець справіцца на двух адказных участках складана.

Акрамя таго, пры доме вялікі агарод, дзе вырошчваюць усё неабходнае: буракі, моркву, цыбулю, капусту, салаты і зяляніна на стале — усю вясну і лета. Бульбу саджаюць у полі. Сёлета пасадзім яе на плошчы ў 45 сотак, вельмі добры ўраджай атрымалі. Збіралі «другі хлеб» усёй талакой два дні.

Цяпер, калі Іван Аляксандравіч пайшоў на ферму, галоўнакамандуючы на «фазэндзе» — жонка. Вольга Канстанцінаўна і бухгалтар, і эканаміст, і менеджар. Вытворчасць і акупнасць — пад пільным вокам гаспадыні. Усё ў яе занатавана: і прыбыткі, і расходы, і бізнес-планы па далейшым развіцці.

Вольга і Іван часта ўдзельнічаюць у конкурсах, што ладзяцца ў раёне. А яшчэ ў Івана Аляксандравіча ёсць хобі: ён збірае прадметы народнага побыту, прыёмнікі, прайгравальнікі, патэфоны. Маці з дзяўчатамі можна назваць ландшафтнымі дызайнерамі: наводзяць прыгажосць на сваёй сядзібе, афармляюць кветнікі. А ў пазамінулым годзе гаспадары сабралі са свайго падвор'я амаль 14 тон малака і сталі пераможцамі раённага спаборніцтва сярод малаказдатчыкаў, за што атрымалі грамату і падарунак. Удзел у конкурсах, як адзначыла Вольга Канстанцінаўна, — не самамэта. Гэта, па сутнасці, імкненне дасягнуць пэўнага ўзроўню культуры ва ўсім: у чалавечых узаемаадносінах, побыце, асабістых ці грамадскіх справах. Для сям'і Навошаў — гэта стыль жыцця, філасофія, якую ўбіраюць у сябе і дзеці — надзея і апора бацькоў у будучыні.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■ Погляд на сябе

# ЛЯЛЬКІ З МОДНЫМ ПРЫЖМУРАМ

**5 снежня ў Цэнтры сучасных мастацтваў адкрываецца выстаўка «Moneyкенщицы. Iznanka. Метр восемьдесят спустя...» Зазірнуць за кулісы мадэльнага жыцця, а таксама з іроніяй паглядзець на саміх сябе прапануе ўсім ахвотным вядомая тэлевядучая, сцэнарыст, мадэль Ірына Ханунік-Рамбальская.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Калі на дэбютнай выстаўцы былі прэзентаваны маленькія лялькі, то ў гэты раз творчасць набірае размах. Калекцыя экспанатаў «прырасла» не толькі колькасцю, але і памерамі. З'явяцца тры вялікія лялькі ў поўны рост. Напрыклад, адна з іх — вобраз дзяўчыны, якая глядзіцца ў адно люстэрка і фатаграфуе свой адбітак у іншым. У руцэ ў яе тэлефон. Такі сабе прататып сучасных ліфтлукаў (*фотаздымкі, зробленыя ў ліфце.* — **Аўт.**).

— Лялькі, можна сказаць, на злобу дня. Яны адлюстроўваюць пэўную іронію, але гэта не накіравана на песімістычнае ўспрыманне жыцця, — заўважае мастачка. — Проста часам здараюцца сітуацыі, калі варта зірнуць на сябе збоку, прааналізаваць свае паводзіны. У мяне часта здараецца, што нейкія праявы чалавечых адносін прымяраю на сябе і разумею, чаму так ці інакш рабіць нельга. Напрыклад, калі браць сацыяльныя сеткі, то я ў гэтым плане не вельмі арыентаваны карыстальнік. Не фатаграфую кожны свой крок, каб потым выкласці ў «Фэйсбуку». Але мне падабаецца чытаць паведамленні маіх сяброў, якія дзеляцца сваімі думкамі, вершамі. Такія запісы часам успрымаю як газету. Аднак калі мой «эфір» псуюць рознымі ліфтлукамі, то гэта не вельмі прыемна. Хочацца прапанаваць такім аматарам лепш схадзіць на нейкае культурнае мерапрыемства і адтуль захаваць фотаздымак.

Мастацтва заўсёды дае магчымасць выказваць сваю пазіцыю, звяртаць увагу на нейкія з'явы. Калі разглядаць у гэтым кантэксце працы Ірыны Ханунік-Рамбальскай, то перш за ўсё прасочваецца імкненне з гумарам паглядзець на сябе, любімых, у нечым змяніць свае паводзіны. У наведвальнікаў будзе магчымасць не толькі паглядзець на экспанаты, але і пры жаданні зрабіць фотаздымкі побач з імі.

Калі казаць пра «гераінь» выстаўкі, то цяпер іх будзе каля дваццаці. Зможаце ўбачыць «Венеру Мілоскую XXI стагоддзя», якая змяніла на гэты раз колер і не толькі... Альбо падумаць пра ідэю аздаблення сваёй кватэры «Лялькай-вешалкай».

Экспанаты ў поўны зрост Ірына рыхтавала сумесна з лялечным майстрам Станіславам Нікановічам. Можна лічыць вопыт першага разу ўдалым ці не — тут ужо кожны няхай вырашае асабіста, але творцы атрымалі сапраўднае задавальненне ад працы.

— Працэс стварэння кожнай лялькі патрабуе часу і неверагодных высілкаў, але ўсё здольны кампенсаваць драйв, які атрымліваеш ад працэсу, — працягвае аповед Ірына. — Ёсць нейкае судакрананне з магіяй. Усё пачынаецца з эскіза. Потым тыдні працы — і з'яўляецца паўнацэнная скульптура.

Здавалася б, што цяжкага ў стварэнні лялек? Але калі размова ідзе пра мастацтва, то ўсё не так проста. Трэба знайсці матэрыялы, якія, бывае, даводзіцца прывозіць з-за мяжы, выхаваць у сабе пачуццё цярплівасці (працэс не з лёгкіх) і не баяцца эксперыментаваць, асвойваючы новыя творчыя прасторы. Так, напрыклад, мастачка жадае аб'яднаць у сваіх працах мастацтва з практычнасцю, дзе лялька можа стаць вешалкай для адзення, а клетка — домам для нейкай птушкі. Не выключана, што з часам гэтае жаданне рэалізаваць новыя ідэі набудзе маштабы чарговай выстаўкі...

Лялькі, якія знаходзяцца ў калекцыі сёння, не прадаюцца, бо яны маюць сваю філасофію і з'яўляюцца часткамі агульнай задумы. Аднак пры жаданні можна замовіць такі твор мастацтва для сябе індывідуальна. Варта мець на ўвазе, што штучны тавар патрабуе немалых выдаткаў, таму ён можа каштаваць да тысячы долараў. Адных такая лічба пужае, у іншых выклікае ўсмешку. Справа не толькі ў працаёмкім працэсе, але і ў рознага кшталту дэталях, якія часам даводзіцца шукаць для лялькі. Гэта можа быць гітара XVIII стагоддзя альбо натуральны шоўк для шыцця сукенкі, ці нейкія ўстаўкі з золата, срэбра...

У планах Ірыны працягваць творчую дзейнасць. Будзе гэта выраб ювелірных упрыгажэнняў, новае бачанне мастацтва мінулага — пакуль невядома. Можа, і не варта прыспешваць падзеі і раскрываць інтрыгу — лепш убачыць сённяшні вынік на ўласныя вочы.

**Алена ДРАПКО**

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

### ЛЕПШЫ СКЛАДАЛЬНІК ЗАДАЧ

Падведзены канчатковыя вынікі ЧРБ-17 па шашачнай кампазіцыі-64. Як паведаміў каардынатар першынства Аляксандр Ляхоўскі (Жодзіна), у ім перамаглі: у раздзеле эцюдаў — 1. Пётр Шклудаў (Наваполацк), 2. Васіль Грабенка (Мінск), 3. Дзмітрый Камчыцкі (Магілёў); праблем — 1. П. Шклудаў, 2. Аляксандр Кагоцька (Пінск), 3. Д. Камчыцкі; камбінацыйных мініяцюр — 1. Д. Камчыцкі, 2. А. Ляхоўскі, 3. Аляксандр Сапегін (Усполле Мсціслаўскага раёна); у жанры дамачных праблем — 1. Д. Камчыцкі, 2. П. Шклудаў, 3. А. Кагоцька.



Лепшым жа складальнікам задач стаў Аляксандр Шурпін з Клімавіч **(на фота)**. Ва ўпартай барацьбе ён апярэдзіў Мікалая Зайцава (Баранавічы) і А. Ляхоўскага. Чэмпіён даслаў у рэдакцыю новую задачу, якая атрымалася ў яго на 100-клетачнай дошцы. З задавальненнем знаёмім з ёю:



**Белыя:** 9, 10, 23, 24, 27, 40, 42, 49, 50, дамкі 14, 32, 44, 46 (13). **Чорныя**: 3, 4, 25, 30, дамка 16 (5). Замкнуць дзве простыя: 42-37 (13А) 14-10, 19, 19, 22, 9, 10, 14#. А(15) 14-19, 10, 20, 19, 5, 10, 19, 24, 34, 45#.

### ШОСТЫ ТУР

Аўтарскі-17 нашага аўтара П. Шклудава працягваецца чарговымі заданнямі. У іх белыя пачынаюць і выйграюць:



№ 17/18. **Белыя:** g7, дамка b8(2). **Чорныя:** a3, b4, c5, d8, e7(5).

№ 17/19 (блізнец № 17/18). **Белыя:** g7, дамка b8 (2). **Чорныя:** a3, b4, b6, c5, e7(5).

№ 17/20. **Белыя**: a1, a5, b6, d4, e3, e5, f2, f4, g7, h6(10). Чорныя: a3, b2, b4, b8, c3, d8, e7, g5, h4 (10).

❑ ❑ ❑

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

### РАШЭННІ

**«Аўтарскі-18»** (В. Шульга): **№ 18/11** — fg3, g3, f7, a5, b6 (b4, g3) a5 (h2A) b4 (b6B, g1) c5, c5x. A(f2) e1 (b6) g3/h4, f4(c3) c1x. B(g1), a5x, **№18/12** — h8 (cd4A) he3 (g3) a3, c3x. A(a3) a7 (b2) d4 (a1) h8 (b4) d2x і **№ 18/13** — 48-43, 39, 44, 40, 8, 1 (7) 20, 25, 50 (32) 33 (37) 47x.

Прыгожую жанчыну, працаўніцу, маці, адданую падпісчыцу і прыхільніцу «Звязды» **Веру Фёдараўну ХУДАЛЕЙ** з г.п. Свіслач шчыра віншуем **з 90-годдзем!** Добрага здароўя вам, бадзёрасці духу, аптымізму.



*Хай заўжды*
*ў вашы вокны*
*Радасць сонцам зазірае!*
*Сто гадоў*
*вам маладосці*
*І здароўя пажадаем!*

**Звяздоўцы.**

Міхась ДРЫНЕЎСКІ:

# «НЕСЦІ НАРОДУ ЯГО Ж СПАДЧЫНУ»

**Міхась Дрынеўскі — адзін з тых рупліўцаў-падзвіжнікаў, хто кожны свой дзень прысвячае святой і высакароднай справе — захаванню, развіццю і ўзбагачэнню беларускай народнай песні.**


hor.by

Дрынеўскі не толькі багаты, але і шчаслівы чалавек. Народны артыст Рэспублікі Беларусь, заслужаны дзеяч мастацтваў, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга і ордэна Францыска Скарыны, ганаровы акадэмік Міжнароднай кадравай акадэміі. А хор, якім ён кіруе, за час яго працы атрымаў найвышэйшыя тытулы: у 1983 годзе — званне акадэмічнага, у 1987 — імя Генадзя Цітовіча, у 2002 — званне нацыянальнага, а ў 2004 годзе пастановаю Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь хор быў названы дзяржаўнай установай культуры, якая мае асаблівае значэнне для захавання, развіцця і распаўсюджання беларускага нацыянальнага музычнага мастацтва.

## Песні, як людзі, — розныя

***— Міхась Паўлавіч, народнаму хору Беларусі неўзабаве споўніцца 60 гадоў...***

— Усё пайшло ад Генадзя Іванавіча Цітовіча. Дзякуючы яго актыўнасці, яго энергіі, яго адданасці беларускаму фальклору. У далёкім 1939 годзе ён сабраў і ўзначаліў самадзейны народны хор у вёсцы Вялікае Падлессе Ляхавіцкага раёна. Хор яшчэ да вайны стаў шырока вядомы ў рэспубліцы. Але сапраўдная слава прыйшла да яго ў пяцідзясятыя гады, калі самадзейны калектыў быў пераўтвораны ў Дзяржаўны народны хор БССР. Г.І. Цітовіч зрабіў яго вядучым мастацкім калектывам, які стаў вядомы далёка за межамі Беларусі. А ў 1975 годзе, калі Генадзь Іванавіч пайшоў на пенсію, гонар і вялікая адказнасць узначаліць знакаміты калектыў выпалі мне.

***— Што патрабуецца ад калектыву, які мае высокія званні нацыянальнага, акадэмічнага, народнага, каб адпавядаць патрабаванням часу, быць сучасным?***

— Традыцыі, калі яны добрыя, народныя, нацыянальныя, то яны — вечныя. Гэта як тое жыцейка: якім яно было тысячу гадоў таму, такім яно ёсць і цяпер, такім будзе і яшчэ праз тысячу гадоў. Сутнасць яго не зменіцца.

Я часам бываю ў роспачы, калі раптам чую ад некаторых «спецыялістаў ад музыкі», што, маўляў, няма чаго чапляцца за старое — трэба ствараць, развіваць новае, сучаснае. Але калі ў гэтым сучасным вытраўлена душа, калі ў ім няма паэзіі, няма мелодыі, то якое яно сучаснае? Яно — часовае: як прыйшло — так і пойдзе.

А традыцыі — яны няхітрыя: ашчадна збіраць і клапатліва захоўваць нашу багатую спадчыну і як самы каштоўны скарб перадаць яе наступным пакаленням. І я лічу, што гэта — самае галоўнае, што мы павінны рабіць. А па модзе ісці — гэта лёгка. Можна нават і добрыя грошы зарабіць. Адзін з нашых эстрадных спевакоў, калі размова зайшла пра крызіс, здзівіўся: «Які крызіс? Я за мінулы год мільён долараў накасіў!»

Таму мы прытрымліваемся «залатога правіла»: сучаснае павінна гарманічна спалучацца з глыбока народнымі, нацыянальнымі традыцыямі. Што гэта азначае для нас на практыцы? А тое, што ў сваіх творчых пошуках мы прытрымліваемся трох асноўных кірункаў. Першы — выконваем народныя песні ў іх першародным, аўтэнтычным выглядзе, раскрываем сродкамі хору сутнасць іх меласа. Другі кірунак — апрацоўка, аранжыроўка народных песень з тым, каб надаць ім сучаснае гучанне. Пры гэтым стараемся мелодыю максімальна захаваць, расквеціўшы, узбагаціўшы яе сучаснымі харавымі і музычнымі сродкамі. Нехта з музыказнаўцаў такі працэс вобразна назваў пераўтварэннем вуглаватага, неапрацаванага алмаза, здабытага з нетраў народнай памяці, у дарагі, прыгожы, сонечны брыльянт. І, нарэшце, трэці кірунак — выкананне народнага песенна-танцавальнага мастацтва ў сінтэтычным адзінстве спеваў, музыкі і танца. Гэта дае нам магчымасць ствараць яркія жанравыя замалёўкі народных гулянняў, песні-карагоды, разгорнутыя вакальна-харэаграфічныя кампазіцыі.

У сваю чаргу, мы не цураемся і таго лепшага, што ёсць у нашых суседзяў-братоў. Але 90 працэнтаў рэпертуару складаюць беларускія народныя песні, тыя самыя, што збіраў калісьці Генадзь Цітовіч, іншыя фальклярысты.

Песні, як людзі, — розныя. Ёсць у нас творы лірычныя, працяжныя, жартоўныя, ёсць вясновыя, карагодныя, вясельныя, салдацкія, баладныя... Калі падлічыць, то ўсяго ў нашым рэпертуары будзе больш за тысячу нумароў песеннай класікі.

У дзеючым рэпертуары — недзе пад сотню, а можа, і за сотню. Ведаеш, ёсць такія песні, якія жывуць кожны дзень на працягу многіх гадоў. Ёсць песні, якія выконваюцца ад свята да свята...

## Працаваць у мастацтве — што па кладцы ісці

***— Артыст хору... Якімі якасцямі ён павінен валодаць?***

— Найперш — добрым галасам. Важны таксама тэмбр. Бывае голас моцны, але занадта рэзкі, непрыемны, ён не зліваецца з іншымі галасамі. Такі для хору, зразумела, не падыходзіць. А яшчэ трэба быць музыкантам, адчуваць інтанацыю слова. Музыкальнасць, эмацыянальнасць — далёка не апошнія рэчы ў нашай справе. А яшчэ неабходна разумець, што ты спяваеш. Разумець сэнс твора. Ствараць вобраз, настрой. У песні кожнае слова мае значэнне. Умець вылучыць галоўнае, зрабіць на гэтым акцэнт. Прычым не абавязкова гучна — можна і шэптам.

Сваім артыстам я часта кажу: «У вашым тэмбры павінна адлюстроўвацца сонца».

***— А ці многа ў вас салістаў?***

— Гэта залежыць ад рэпертуару. Ад голасу, яго сілы, спецыфікі, дыяпазону. Адна салістка гэты твор можа спець выдатна, а другая яго не спяе ніколі. Адна разумее народную песню душою, а другая будзе спяваць нібыта і правільна, па нотах, але душы ў гэтым спяванні не адчуваецца. І да сэрца гледача такая песня не дойдзе.

Саліст, вобразна кажучы, тавар адзінкавы і даволі рэдкі. Іх многа ніколі не бывае. Дзякаваць Богу, у нас ва ўсе часы былі сапраўдныя «зоркі». Ёсць яны, на шчасце, і цяпер. Найперш хачу назваць Валянціну Крыловіч. Наш залаты голас, спявачка ад Бога, заслужаная, а па сутнасці, ужо даўным-даўно народная артыстка. Нядаўна атрымала ордэн Францыска Скарыны. Я вельмі ўдзячны таленавітым спевакам, заслужаным артыстам рэспублікі Васілю Браіму і Уладзіміру Будаю. Усё большую вядомасць і папулярнасць набіраюць нашы салісты, лаўрэаты рэспубліканскага конкурсу беларускай песні Рэната Мацвеенка, Наталля Гарнастаева, Іван Вярбіла і іншыя.

Я сказаў, што колькасць салістаў залежыць ад рэпертуару. Але і разнастайнасць рэпертуару залежыць ад адпаведных галасоў. Мне, напрыклад, для царкоўных песень не хапае нізкіх басоў. Пакуль што адзін Аляксандр Снітко. Праўда, мае рэдкі голас — прафунда-бас. Пакрывае ўсе галасы. Прычым любую ноту бярэ лёгка, без напругі, з запасам. Безумоўна, хацелася б мець яшчэ пару такіх басоў, ды дзе ж іх знойдзеш...

***— А, дарэчы, як ідзе пошук і падбор харыстаў?***

— Цяпер гэта не такая ўжо і праблема. Асабліва жаночых галасоў. Таму што шмат розных конкурсаў, фестываляў. Дый з музычных вучылішчаў, дзе мяне ўсе ведаюць і я іх усіх ведаю, часам тэлефануюць, прапануюць цікавых выпускнікоў. А ёсць жа яшчэ Універсітэт культуры, кафедра харавога дырыжыравання, дзе таксама, пашукаўшы, можна знайсці таленавітых спявачак. Цяжэй з мужчынскімі галасамі.

***— А ў чым прычына? У тым, што ў Беларусі традыцыйна мала добрых спевакоў?***

— Ну і гэта, вядома. Але галоўнае — зарплата. Ну што такое для мужчыны заробак у 2 — 3 мільёны рублёў? Як на такія грошы пракарміць сям'ю? Таму хлопцы і выбіраюць больш грашовыя спецыяльнасці. Застаюцца ўжо самыя адданыя, самыя бескарыслівыя.

**Я часам бываю ў роспачы, калі раптам чую ад некаторых «спецыялістаў ад музыкі», што, маўляў, няма чаго чапляцца за старое — трэба ствараць, развіваць новае, сучаснае.**

***— Цякучасць кадраў вялікая?***

— Можна сказаць, нулявая. У хоры яшчэ працуюць людзі, з якімі я некалі пачынаў. А гэта ўжо амаль чатыры дзесядзігоддзі. Нават калі чалавек выходзіць на пенсію, ён яшчэ застаецца на год-другі ў калектыве. І я да гэтага стаўлюся з разуменнем.

***— Артысты хору ў асноўным з вёскі?***

— Так, раней былі ў асноўным з вёскі. А цяпер я б не сказаў. Ёсць і «асфальтныя», як я часам жартую. Асабліва моладзь, якая прыходзіць. Яна выключна гарадская. Безумоўна, ім цяжэй пранікаць у сутнасць народнай песні. Але на тое і мастацкі кіраўнік, каб дапамагаць ім і накіроўваць іх развіццё ў той бок, куды трэба. Каб яны душою спасцігалі ўсё багацце музычнага фальклору і маглі перадаць інтанацыйна, драматургічна так, як я гэтага прашу.

***— Кажуць, што наш народны хор можа спяваць на восем галасоў...***

— Безумоўна. У хоры чатыры партыі — сапрана, альты, тэнары і басы. Кожная з гэтых партый дзеліцца яшчэ на дзве. А бывае, што сапрана можа дзяліцца нават на тры. Што такое хор? Вось у фартэпіяна мы націскаем клавішу — адну, а гук здабываецца з трох струн. Атрымліваецца своеасаблівая арганнасць. Тое ж і ў хоры: шматгалоссе надае спевам аб'ёмнасць, глыбіню, незвычайную яркасць і выразнасць. Харавая тканіна — як багатая вышыўка. Вядома, не ў кожным выпадку такое багацце патрабуецца. Ёсць песні, дзе можна абысціся і больш простымі сродкамі. Шматгалоссе ж выкарыстоўваецца, галоўным чынам, у акапэльных спевах, у царкоўным песнапенні.

***— Якімі якасцямі павінен валодаць дырыжор?***

— Перш за ўсё ён павінен мець добры слых. У мяне, напрыклад, тэмбральны слых, і гэта можа нават важней, чым абсалютны. Далей. Трэба быць педагогам, псіхолагам. А яшчэ — любіць сваіх харыстаў, дапамагаць ім. Некаму трэба дапамагчы ўладкаваць дзіця ў садок, некаму — стаць на чаргу ў кааператыў, і шмат яшчэ чаго іншага. Я мог бы гэтым і не займацца, але тады ў мяне не было б з калектывам кантакту, даверу, а без гэтага не было б нічога. Складанасць у тым, што нас у кансерваторыі вучаць толькі музыцы. А калі трапляеш у калектыў, то сутыкаешся з мноствам іншых праблем. І вось тут даводзіцца гэтую няпростую навуку — чалавеказнаўства — спасцігаць самастойна.

***— Структура хору захавалася ранейшая, трохзвённая?***

— Так, у адным калектыве цэлыя тры калектывы — харавы, танцавальны і аркестравы. І кожны з іх мае свайго кіраўніка. Хорам займаюся я, а таксама хормайстар — заслужаны дзеяч мастацтваў Іван Абразевіч. Балетмайстрам працуе наш выхаванец, заслужаны артыст рэспублікі Юрый Паўлішын. Аркестрам жа кіруе вельмі таленавіты музыкант і аранжыроўшчык Пётр Глушчук. Любую мелодыю ён умее аздобіць, расквеціць так, што нельга не захапляцца.

***— Вядомых, праслаўленых калектываў на постсавецкай прасторы засталося не так ужо і многа. Хор імя Пятніцкага, Кубанскі народны хор у Расіі ды хор імя Вяроўкі ва Украіне — вось, бадай, і ўсё. У чым адметнасць Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь?***

— Галоўнае, на мой погляд, у змесце народнай беларускай песні, яе меласе. Наш песенны фальклор адрозніваецца і ад рускага, і ад украінскага. Хаця нашы тры народы-суседзі і вельмі блізкія, але ўсё роўна розніца тут ёсць. У нас няма гэткіх разухабістых, разгульных песень. Я думаю, што гэта абумоўлена гістарычна. Хто толькі ні таптаўся па нашай зямлі, якіх толькі пакут наш народ ні выцерпеў ад розных заваёўнікаў! Вось чаму беларускія песні амаль усе пачынаюцца з «ой» — «Ой, ты, грушка мая», «Ой, павей, вецярок...», «Ой, сівы конь бяжыць...» Наша «ой» — не ўзнёслае, не радаснае, а задуменна-журботнае. Калі для рускіх народных спеваў характэрная зычнасць, для ўкраінскіх — трубнасць, то для нашага хору — мяккасць і сонечнасць.

## Як пайду я дарогаю

***— Як прыходзіць адчуванне душы ў народнай песні?***

— Нарадзіўся я ў вёсцы Тонеж Лельчыцкага (а тады Тураўскага) раёна. Гэта самая глыбінка прыпяцкага Палесся. Хараство прыроды — неапісальнае! Нездарма ж паэт-песеннік Адам Русак, пабываўшы ў тутэйшых мясцінах, назваў іх салаўіным берагам. Але ён жа напісаў і такое двухрадкоўе: «Ой, не едзь, мой мілы, ў Тонеж — не заедзеш, а ўтонеш...» Справа ў тым, што ў часы майго маленства ды і юнацтва таксама гэты салаўіны край быў не толькі глыбінным, але і глухім, далёкім ад даброт цывілізацыі. Я рос, не ведаючы ні радыё, ні тэлебачання. А кніжкі даводзілася чытаць часцей за ўсё пры лучыне.

Але пры гэтым была адна вельмі важная перавага: людзі былі не пасіўнымі спажыўцамі культуры, а актыўнымі творцамі. З больш чым пяцісот тонежскіх двароў не было, бадай, ніводнага, дзе б хто-небудзь не ўдзельнічаў у мастацкай самадзейнасці. Не ў тым сэнсе, што чалавек выступаў на сцэне, а ў тым, што ён нешта тварыў — па-майстэрску іграў на гармоніку, віртуозна спраўляўся з бубнам, прыгожа танцаваў, выдатна спяваў. Асабліва ў нас любілі і ўмелі спяваць. Ішлі на працу — спявалі, вярталіся — таксама. Пасля вечарам у розных канцах вёскі альбо дзе-небудзь за вёскаю, каля кастра, збіраліся гурты хлопцаў і дзяўчат і спявалі да самай раніцы. Цяпер дзіву даешся: як мы маглі, амаль не спаўшы, цэлы дзень затым працаваць. Вось што значыць сапраўднае, жывое, жыццядайнае мастацтва!

***— Бацькі любілі спяваць?***

— Бацька спяваў добра. Асабліва да жаніцьбы, хлопцам. Сябра яго, Паша Вянгура, падводзіў, а ён басаваў. Пасля ўжо, калі ажаніўся, з'явілася сям'я, вельмі любіў наладжваць музычныя вечары. З вайны бацька прывёз губны гармонік. Дык вось пад гэты гармонік мы і спявалі, і танцавалі. Лепшаму танцору бацька даваў прэмію — дваццаць капеек, а часам нават і рубель.

***— А хто іграў?***

— Старэйшы брат Дзіма. Бацька давяраў каштоўны інструмент толькі яму, больш нікому не даваў. Пасля ўжо, калі за сталярку прыдбаў невялічкі акардэончык, Дзіма стаў іграць на ім, а мне дастаўся губны гармонік. Праз нейкі час бацька купіў большы акардэон, а меншы перайшоў да мяне. Іграць я вучыўся на слых, без усялякіх нот, самавукам. Затое з надзвычайнаю ахвотай — рыпаў кожную вольную хвіліну. Маці іншы раз не вытрымлівала. «Каб табе ў жываце рыпала! — нязлосна сварылася яна і штурхала мяне ў плечы. — Ідзі от за адрыну і там цягай свае мяхі, а то галава ажно гудзе...»

***— Сям'я ў вас была вялікая?***

— Маці нарадзіла дзевяцярых. Але першыя чацвёра памерлі. Малымі. Ад дыфтэрыі ці, як у нас казалі, разачкі. Пасля з'явіліся, адзін за адным, пяцёра хлопцаў. Я нарадзіўся перад самай вайной, у лютым. І амаль яе не помню. Застаўся ў памяці адзін жахлівы эпізод, калі амаль трыста маіх аднавяскоўцаў немцы сагналі ў царкву і жыўцом спалілі. Наша сям'я ўцалела толькі таму, што мы жылі ў зямлянцы на выспе сярод балота. У гэтай зямлянцы мы, чацвёра малалеткаў і маці, і пракачаліся ўсю вайну. Бацька ваяваў на фронце.

Мне ішоў пяты год, калі на вёсцы пачуў, што вайна скончылася. Я прыбег да сваіх і радасна абвясціў: «Мама, не будзем зараз снедаць. Будзем чакаць тату!» Але тата вярнуўся толькі ў лістападзе: дэмабілізацыю затрымалі ў сувязі з японскай вайной.

***— А хто вызначаў твой лёс — сам ці бацькі?***

— Не, бацька не адабраў мой прафесійны выбар. Казаў: музыка мне трэба, калі я добра наемся ды вазьму чарку, але гэта не часта бывае. Словам, прафесію музыканта, як і любы вясковы чалавек, ён лічыў несур'ёзнай. Любіў дактароў, таму Дзіма, Мікола і Валодзя і абралі гэтую пуцявіну. Два з іх — прафесары. Яшчэ адзін брат, Рыгор, узначальваў лабараторыю, якая працавала на космас. Бацька іх нават больш паважаў, чым мяне. Паверыў, што і я нешта значу, толькі пасля аднаго выпадку. Мы давалі канцэрт для вайскоўцаў, і вось пасля канцэрта мяне разам з бацькам запрасіў у госці адзін мой добры знаёмы, генерал. А ў бацькі, напэўна, яшчэ з вайны засталася вялікая павага да военачальнікаў. І калі ён пасядзеў побач з генераламі ды яшчэ выпіў з ім чарку за харошага сына, нешта ў бацькоўскім сэрцы скранулася. «Аказваецца, — прызнаў ён, — і музыканту можна жыць добра...» А крыху пазней, калі я атрымаў званне прафесара, бацька з непадробным здзіўленнем і шчырай радасцю ўсклікнуў: «А ёлкі-маталкі! І ў вас прафесараў даюць...»

***— Дык як жа вы пайшлі супроць волі бацькі — паступалі ў музычнае вучылішча?***

— Маёй саюзніцай аказалася маці. Яна ўгаварыла бацьку не перашкаджаць мне выбіраць тое, што я хачу. Таму я хоць і без бацькоўскага блаславення, але і не насуперак яго волі паступіў пасля сямі класаў вучыцца на баяніста. Праўда, паступленне гэтае аказалася марным. Мне не далі месца ў інтэрнаце, і я праз два тыдні вярнуўся дадому. Зноў пайшоў у школу. А хадзіць давялося далёка, у суседнюю вёску, за 13 кіламетраў. Скончыўшы дзесяцігодку, я ў другі раз паступіў у Гомельскае музвучылішча. На гэты раз на харавое аддзяленне. Чаму на харавое? А я яшчэ ў школе кіраваў хорам, і нават не адным, а трыма — школьным і двума калгаснымі, з вёскі Тонеж і вёскі Букча, дзе я канчаў дзесяцігодку. І, здаецца, не без поспеху. Хор вёскі Тонеж на занальным аглядзе калектываў мастацкай самадзейнасці заняў першае месца. Мне паабяцалі: «Паедзеце ў Маскву на Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў». Я быў на сёмым небе ад шчасця. Стрыечная сястра дзеля гэтага нават вышыла мне шыкоўную, у нацыянальным стылі сарочку, якая недзе і цяпер захоўваецца ў вясковым музеі. Мы шмат рэпеціравалі. Але паехаў іншы калектыў — знакаміты Тураўскі хор. Крыўдна было. Але што зробіш? Затое гэта стала мне добрым урокам на ўсё жыццё: нішто не даецца так проста і лёгка, а пры няўдачы — ні ў якім разе не апускаць рукі.

***— Гэтае правіла дапамагала пасля ў вучобе, у працы?***

— Дапамагала. У вучылішчы мяне заўважыла Раіса Цімафееўна Красніцкая, выдатны педагог і цудоўны чалавек. З першага курса яна стала пераконваць, што мне абавязкова трэба рыхтавацца да вучобы ў кансерваторыі, і таму нагружала мяне дай Бог. Часам нават калегі яе папракалі за гэта, але яна заўсёды адказвала: «Хлопец цягне — няхай цягне. Няхай развівае Боскую іскру».

І як жа я быў пасля ўдзячны ёй за гэтую «нагрузку», калі з лёгкасцю паступіў у кансерваторыю і ўсе гады без асаблівых праблем там правучыўся. Праўда, не без дапамогі другога выдатнага педагога, дацэнта Ганны Паўлаўны Зелянковай.

А я ж яшчэ не толькі вучыўся, але і працаваў. У мяне практычна не было ніводнага года «чыстай» вучобы. У вучылішчы — кіраваў хорам дрэваапрацоўчага камбіната, народным хорам вёскі Прыбыткі, на трэцім курсе нават даверылі праводзіць заняткі з завочнікамі. У кансерваторыі, калі быў яшчэ першакурснікам, наш вядомы дырыжор-хормайстар Уладзімір Раговіч запрасіў мяне папрацаваць з капэлаю Палаца культуры Мінскага трактарнага завода. Ад такой спакуслівай прапановы адмовіцца было цяжка. Дый капейка якая, па праўдзе кажучы, была не лішняя. Але ж, вядома, не капейка была на першым плане. Праца ў капэле мяне настолькі захапіла, што я аддаў ёй усе пяць гадоў свайго і без таго напружанага кансерваторскага жыцця. І ведаеш, мне і сёння прыемна ўспомніць той шчаслівы час. Успомніць і адчуць гонар, бо капэла МТЗ была прызнана лепшай у Савецкім Саюзе!

***— Ведаю, што пасля заканчэння кансерваторыі вы атрымалі накіраванне ў аспірантуру ў Маскву. Чаму не паехалі?***

— О, тут цэлая гісторыя. Праўда, гэта было не адразу пасля кансерваторыі, а крыху пазней. А спачатку я быў накіраваны на працу ў Мінскае музычнае вучылішча. І амаль аднačасова атрымаў запрашэнне ад Генадзя Цітовіча ў Дзяржаўны народны хор на пасаду хормайстра (па сумяшчальніцтве, вядома). А яшчэ ж заставалася і капэла. Не знаю, як я вытрымаў такую нагрузку. Напэўна, дапамагла мне мая вясковая загартоўка і сялянская цярплівасць.

І вось у разгар усіх гэтых клопатаў мне раптам прапаноўваюць ехаць у Маскву ў аспірантуру. Пасля некаторых ваганняў я даў згоду. Але патрэбна была яшчэ згода Міністэрства культуры. А там замест аспірантуры нечакана прапаноўваюць пасаду галоўнага хормайстра ў Народны хор. А ў мяне ўжо быў і білет на Маскву. І жонка хацела, каб я ехаў вучыцца. Але міністэрскі чыноўнік аказаўся настойлівы. «Ідзі, — кажа, — падумай». Такія прапановы паступаюць не кожны дзень. Ноч не спаў, думаў. Раніцою прыйшоў і кажу: «Не». «Ідзі яшчэ падумай». На трэці раз я здаўся.

***— Дзе і як вы пазнаёміліся з Цітовічам?***

— У 1968 годзе ў філармоніі быў наш выпускны, справаздачны канцэрт. Я ў якасці дыпломнай работы дырыжыраваў складаным творам для двух хароў. Гэта калі яны спяваюць адзін і той жа твор, але ў кожнага свая партыя. Яны як бы спаборнічаюць між сабой. То адзін наперадзе, то другі, то разам. Для дырыжора гэта вельмі складаная задача — нідзе нічога не ўпусціць, дабіцца цэльнага, гарманічнага гучання. Мне, здаецца, удалося справіцца, бо адразу пасля канцэрта да мяне падышоў Генадзь Іванавіч, павіншаваў і запрасіў у свой хор.

***— Некалі Генадзь Цітовіч назваў гомельскае Палессе «нечапаным куфрам», «кладоўкай беларускай народнай песні». А Рыгор Шырма марыў дажыць да таго часу, калі народная песня, гэтая сялянaчка, вырасце ў велікасвецкую даму. Ці збываюцца спадзяванні нашых патрыярхаў?***

— Адназначна адказаць складана. У нечым мы сёння пайшлі наперад, а ў нечым — адступілі. Тое, што мы многае з народнага песеннага фальклору паспелі запісаць, апрацаваць, — гэта добра. А кепска, што ў вёсках цяпер амаль не спяваюць. Яркія, самабытныя носьбіты старадаўніх песень пайшлі з жыцця, а моладзь, на вялікі жаль, далёка не ўсюды падхапіла ад іх бясцэнную эстафету. На сцэне і ў жыцці пануе сучасная папса — гэтая зараза, я па-іншаму назваць яе не магу, бо яна глуміцца з усяго народнага, чыстага, таленавітага.

Дзякаваць Богу, у апошнія гады пачаў адбывацца прыкметны паварот да лепшага. Зноў стала з'яўляцца шмат калектываў мастацкай самадзейнасці — цікавых, таленавітых, дарослых і дзіцячых, гарадскіх і вясковых. А колькі прыемных адкрыццяў адбываецца падчас рэспубліканскіх фестываляў і конкурсаў!..

***— Міхась Паўлавіч, у вас шмат ганаровых званняў і высокіх узнагарод. Што было самым дарагім, самым хвалюючым?***

— Вось, дальбог, кажу як на духу: я ніколі не працаваў на званне, на ўзнагароду. Працаваў, як мог, працаваў многа, упарта, настойліва, каб быў вынік, каб зрабіць справу. І ніколі не чакаў ніякіх узнагарод, а таму і не надаваў ім вялікага значэння. Адзначылі — добра, дзякуй. Гэта абавязвае мяне працаваць яшчэ лепш. А ад такой хваробы, як зайздрасць, славалюбства, я не пакутаваў і не пакутую.

**Гутарку вёў Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.**


Фота БЕЛТА.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка Травой заросшая крынічка». Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. № 35 (493)

# НАВОШТА ПАКІДАЦЬ СНЕГ У САДЗЕ

**Снежная зіма толькі на карысць саду і агароду. Снег — сапраўдная цёплая коўдра, якая дапаможа раслінам перазімаваць без страт і падрыхтуе глебу да наступнага сезона. Чым больш снегу, тым лягчэй пладовым і дэкаратыўным дрэвам, кустам, шматгадовым кветкам, падзімовым агародным культурам. Нават газону снег будзе толькі на карысць.**

## Як утрымаць снег

У бялюткага рыхлага снегу ёсць 2 ворагі: вецер і выпарэнне з паверхні. У ясны і ўмерана марозны ветраны дзень з 1 кв. м паверхні снегу выпарваецца да 5% яго аб'ёму. Таму варта ўсяляк перашкаджаць ветру, каб ён не здзімаў і не «выпарваў» снег з пасадак. Для гэтага ўсталюйце некалькі невысокіх перашкод. Яны выканаюць адразу 2 задачы — абароняць снег, які выпаў, ад выдзімання і паслужаць назапашвальнікамі для снегу, які яшчэ будзе ісці і збірацца каля перашкод. Трэба толькі вызначыць асноўны напрамак вятроў.



## Садовыя збудаванні

Эфектна выглядае на фоне заснежанага саду тын з лазы ці пластыкавы (абавязкова марозаўстойлівы!) яго заменнік. Невысокія шчыльныя агароджы з металапластыку халадоў не баяцца. Таму летнія агароджы, якія не прыбралі на зіму, змогуць затрымаць снег на клумбе. Калі клумба вялікая, трэба проста дадаць паралельныя загародкі. Такімі ж агароджамі няцяжка абгарадзіць і падзяліць на сектары газон.

Калі ўвосень вызваліліся пераносныя лёгкія канструкцыі, па якіх віліся аднагадовыя ліяны, іх таксама можна пусціць у справу — усталяваць у патрэбным месцы і ўшчыльніць ніжнюю частку плёнкай або сеткай. Выдатна затрымлівае снег спецыяльная пластыкавая сетка, якая прымяняецца для абароны аўтадарог. На дачным участку гэтую сетку можна ўсталяваць прама або дугападобна, што яшчэ лепш утрымае снег.

Натуральны спосаб затрымання снегу — валкі з яго ж. Зрабіць іх нескладана.

Шчыльныя «зялёныя» сцены — натуральная перашкода, каля якой завея намяце высокія гурбы. Прыкрытыя знізу снежнымі валкамі, жывыя загароды не горш абароняць сад ад зімовага ветравога ўсушэння, а ў маласнежную зіму засцерагуць глебу ад выдзімання.

# САКРЭТЫ САДАВОДАЎ

❍ *Зямлю пад дрэвамі засяваць травой непажадана, паколькі яна моцна высільвае глебу. Лепш пасадзіць кветкі, травы або ягаднік. Іх усё роўна давядзецца рыхліць і ўгнойваць, а значыць, і дрэву будзе карысць. Глебу пад кронамі пладовых дрэў абавязкова трэба рыхліць і ўгнойваць. Пры гэтым перакопваць на глыбіню не больш за 10 см. Каб унесці ўгнаенні глыбей, трэба вострым калом асцярожна прарабіць у глебе паглыбленні на 30-50 см, адступіўшы ад ствала прыкладна на 1 метр ці бліжэй да перыметра кроны. Такія паглыбленні робяць вакол дрэва ў некалькіх месцах. У іх і наліваюць прыгатаваныя ўгнаенні, пакуль глеба будзе іх убіраць. Затым адтуліны засыпаюць рыхлай урадлівай зямлёй.*

*Дарослыя пладаносныя дрэвы можна падкарміць наступным чынам: па перыметры кроны капаюць па коле канаўку шырынёй і глыбінёй каля 35 см. Яе запаўняюць перапрэлым гноем з дабаўленнем 3-4 кг драўнянага попелу, трохі ўшчыльняюць і засыпаюць глебай.*

*Пры ўгнаенні сліў і вішань карысна яшчэ дадаць гашанай вапны або старой тынкоўкі.*

❍ Дрэвы бываюць бясплоднымі з розных прычын. Напрыклад:

— калі пры пасадцы была заглыблена каранёвая шыйка, то дрэўца дрэнна расце і хварэе;

— пры пасадцы саджанцаў у сырым халаднаватым месцы, калі карані сутыкаюцца з пластамі глебы з блізкім заляганнем халодных грунтавых водаў;

— калі глеба занадта бедная;

— калі ж глеба ўрадлівая, а дрэвы скідаюць кветкі і завязь, значыць, не хапае мінеральных рэчываў. Трэба тэрмінова ўнесці мінеральныя ўгнаенні з фосфарам і каліем;

— калі глеба занадта ўжо тлустая. Пры гэтым на дрэвах шмат лістоты і вельмі мала пладовых галінак. У такім выпадку да глебы прымешваюць гліну, попел, вапну або ўносяць фосфарна-калійныя ўгнаенні;

— пры вельмі моцным абразанні адбываецца інтэнсіўны рост вегетатыўных, але не пладовых парасткаў;

— калі падчас цвіценняназіраліся моцныя замаразкі альбо стаяла вельмі сырое дажджлівае надвор'е. У такім выпадку насякомых вельмі мала і кветкі застаюцца неапыленымі;

— пры моцным пашкоджанні дрэў насякомымі. Неабходна праводзіць прафілактычнае апырскванне адпаведнымі прэпаратамі ў пэўныя тэрміны.

# НЕЗВЫЧАЙНАЯ ГАРОДНІНА І САДАВІНА

## ЮЗУ



Юзу, ці японскі лімон, — гібрыд мандарына і ічангскай папеды (дэкаратыўны цытрус). Жоўтага ці зялёнага колеру фрукт з бугрыстай скуркай памерам з мандарын мае яркі водар і кіслы смак. Ён выкарыстоўваецца японцамі яшчэ з VII стагоддзя, калі будыйскія манахі завезлі яго на астравы з мацерыка. Фрукт папулярны таксама ў кулінарыі Карэі і Кітая.

Юзу ўжываецца ў большасці выпадкаў для аддушкі. У яго ўзбуджальны водар — цытрусавы, з нотамі ігліцы і кветкавымі адценнямі. Цэдра юзу — адна з папулярных японскіх запраў. Яна выкарыстоўваецца для мясных і рыбных страў, дадаецца ў суп місо, локшыну. На аснове цэдры робяцца алкагольныя і безалкагольныя напоі, джэмы, сіропы, дэсерты. Кіслы, духмяны і не такі п346расталінейны, як цытрынавы, сок юзу выкарыстоўваецца ў якасці воцату, таксама ён служыць асновай для папулярнага соусу понзу.

Юзу выкарыстоўваецца не толькі ў кулінарыі. Гэты фрукт з'яўляецца ўдзельнікам японскага свята зімовага сонцастаяння, якое адзначаецца 22 снежня. У гэты дзень дарослыя і дзеці прымаюць ванны з пладамі юзу, сімвала сонца. У гарачай вадзе фрукт пахне яшчэ мацней і, паводле павер'яў, адганяе злыя сілы. Лічыцца, што пасля ванны з юзу чалавек год не будзе хварэць на прастуду, асабліва калі пасля водных працэдур пакаштаваць гарбуза, — а гэта яшчэ адзін знак сонца. У юзу-ванну акунаюць і хатніх жывёл, а вадой, якая засталася, паліваюць расліны.

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 21 (29)

■ Ваенная гісторыя — беларускія гарнізоны

# ТУТ ПАЧЫНАЎСЯ СПЕЦНАЗ

**Мар'іна Горка вайсковая...**

***Невялікі беларускі гарадок з буйным вайсковым гарнізонам, ваенныя часці з якога ва ўсе часы, рашалі адказныя стратэгічныя задачы.***

***Горад і сёння застаецца ў эпіцэнтры вайсковых падзей. Яго гарнізон выконвае важную ролю для сучасных беларускіх Узброеных Сіл.***

***Пра мінулыя і цяперашнія падзеі гарнізоннага жыцця нашы сённяшнія матэрыялы.***

## Коні сена не ядуць

Пра армейскі маштаб невялікай Мар'інай Горкі можна меркаваць па памеры жылых дамоў, збудаваных там для вайскоўцаў. Амаль паўсотні пяціпавярховікаў — цэлы раён.

Ваенная гісторыя Мар'інай Горкі пачалася напярэдадні Другой сусветнай. Падчас буйных вайсковых вучэнняў мясцовы ландшафт прыйшоўся даспадобы наркаму абароны Кліменту Варашылаву. Даў маршал каманду, і ў 1935 годзе сюды з поўдня перакінулі прадстаўнікоў любімага роду войск Варашылава — кавалерыйскую дывізію.

Коннікі прыбылі ажно з-пад Арэнбурга. І калі з уладкаваннем вайскоўцаў асаблівых пытанняў не паўстала, а вось з коньмі аказалася складаней. Арэнбургскія скакуны не сталі есці беларускае сена. З поўдня ў тэрміновым парадку вайсковымі эшалонамі пачалі вазіць адмысловае стэпавае. Дзе яго тады разгружалі з чыгункі — там і сёння растуць незвычайныя для нашага краю травы, выклікаючы шок у айчынных батанікаў.

У Еўропе ўжо гарэла полымя Другой сусветнай вайны. Баі паказалі: час конніцы мінуў. І замест коннікаў на Міншчыне з'явіліся прадстаўнікі абсалютна новай вайсковай прафесіі — дэсантнікі. У Мар'інай Горцы размясцілася 214-я паветрана-дэсантная брыгада, рэарганізаваная пасля ў яшчэ большую вайсковую адзінку — паветрана-дэсантны корпус. Тут жа пачаў базіравацца дэсантна-бамбардзіровачны авіяполк. Была і свая вайсковая школа пілотаў, якую пасля перавялі ў Паставы.

Яшчэ пасёлак у даваенны час мог пахваліцца ўласным ваенным вучылішчам. Па волі Генеральнага штаба нараўне з Масквой ці Ленінградам такі гонар выпаў і невялічкай Мар'інай Горцы. Выкладчыкам там служыў падпалкоўнік Іван Якубоўскі — будучы знакаміты военачальнік, маршал Перамогі. Праўда, яго курсантам-выхаванцам да маршальскіх зорак дайсці не ўдалося: амаль усе паляглі ў першыя месяцы вайны. Уцалелі толькі лічаныя з іх.

Само вучылішча ў пачатку Вялікай Айчыннай перавялі ў глыбокі тыл ажно пад Волагду. Але і там, у Верхнім Усцюгу, яно насіла ранейшую назву з беларускім каларытам — Пухавіцкае пяхотнае.

А мар'інагорскіх дэсантнікаў, калі грымнуў чэрвень сорак першага, кінулі на захад. І не з парашутамі, як вучылі дагэтуль, а на звычайных аўтамашынах. Далі загад дапамагчы пяхотным дывізіям стрымаць варожы ўдар. Пехацінцы пратрымаліся нядоўга, пачалі адступленне на ўсход, а вось 214-я брыгада адступаць не стала. Больш за месяц білася пад Старымі Дарогамі, а пасля пад Мінскам. І толькі ў канцы жніўня пакінула раён абароны і выйшла да сваіх.

У час акупацыі Мар'іну Горку аблюбавалі захопнікі. Вораг стварыў тут моцны апорны пункт, куды з фронту прысылалі салдат і афіцэраў на адпачынак і лячэнне. Тут дзейнічалі шпіталь, зенітна-артылерыйская школа і сапёрныя курсы.

## І танкісты, і сапёры, і камбайнеры

Пасля вызвалення ў Мар'іну Горку вывелі франтавую дывізію (якая, дарэчы, скончыла вайну ў Чэхаславакіі), адно са старэйшых злучэнняў Чырвонай Арміі — 30-ю гвардзейскую Іркуцка-Пінскую імя Вярхоўнага Савета РСФСР.

— Першай задачай вайскоўцаў тут у пасляваенны час стала размініраванне, — успамінае ветэран Валянцін Грышын. — Мін засталося ўсюды процьма — і ў гарадку, і на навакольных палетках. А яшчэ даводзілася дапамагаць мясцовым хлебаробам, бо працоўных рук у калгасах не хапала. Зімой і летам кіпела баявая вучоба, а ўвесну і восенню вайскоўцаў можна было бачыць на трактарах ці на жняярках.

У 1968 годзе дывізіі давялося тэрмінова зноў вярнуцца ў Чэхаславакію. Камандзіроўка выдалася няпростай: падчас вулічных баёў былі і ахвяры, і параненыя. Назад злучэнне ў Беларусь так і не вярнулі. «Трыццатка» заставалася ў славацкім горадзе Зволене ажно да 1990 года. І толькі калі сацыялістычны лагер пачаў трашчаць па швах, Іркуцка-Пінскую зноў перакідваюць у Беларусь. Яе месца там, праўда, было занятае: у ваенным гарадку дыслацыраваліся палкі 8-й гвардзейскай танкавай дывізіі. Восьмая танкавая лічылася дывізіяй скарочанага штату: яна мела толькі 2,5 тыс. чалавек асабовага складу замест 11 тыс. Але тэхнікі і зброі быў поўны камплект — сховішчы ажно трашчалі. І ў гэты перапоўнены гарадок накіроўваецца яшчэ адна дывізія. Танкавую спешна расфарміроўваюць, а на яе месцы пачынаюць разгружаць эшалоны «чэхаславацкай»— 30-й мотастралковай. Дывізія прыйшла баявая. Штат далёка не той, што ў мясцовых танкістаў, — каля 12 тысяч салдат і афіцэраў. Не хапала месца для яе танкаў і бронетранспарцёраў. І ў сакрэтным парадку (каб вораг не даведаўся) дывізіі дазваляюць трымаць адзін мотастралковы полк без баявой тэхнікі. І толькі тады неяк змаглі размясціцца.

## Постсавецкая «перазагрузка»

Калі распаўся Савецкі Саюз, у гарнізоне, як і ўсюды, закіпеў вір падзей, вынікам якіх у тым ліку сталі і паламаныя лёсы. Але дывізія, як ні дзіўна, уцалела. Беларускае ваеннае кіраўніцтва пасля скараціла яе да брыгады. У час, калі востра не хапала сродкаў і матэрыяльных рэсурсаў, з ёй нават былі праведзены буйныя вучэнні. А па вяртанні з тых вучэнняў, афіцэры і салдаты даведаліся: стараліся яны марна, іх злучэнне скарачаюць — будзе толькі база захоўвання тэхнікі.

Цяпер там няма і той базы. Маўкліва стаяць старыя казармы; дзе-нідзе вайсковыя будынкі прызвычаілі да сваіх патрэб розныя грамадзянскія ўстановы. Такім чынам была загорнута вайсковая старонка ў гісторыі гэтага раёна Мар'інай Горкі. Відаць, назаўсёды.

## Суперсакрэтны спецназ

У 1962 годзе частку гарадка аддзялілі пад суперсакрэтны аб'ект з жорсткай прапускной сістэмай. Нагналі туды ваеннаслужачых-асілкаў, якія нават намёкам не выдавалі, чым займаюцца. У звышсакрэтным гарадку размясціўся вайсковы спецназ. Які нават камандаванню Беларускай ваеннай акругі не падпарадкоўваўся — а толькі Галоўнаму разведвальнаму ўпраўленню ў Маскве. Там рыхтавалі салдат і афіцэраў, якія на вайне маглі літаральна ўсё. Такая брыгада была ў Беларусі ўсяго адна.



Падчас вайны ў Афганістане мар'інагорская брыгада накіравала туды ад сябе 334-ы атрад спецыяльнага прызначэння, які ў горнай краіне ў мэтах захавання сакрэтнасці маскіраваўся пад пяты асобны мотастралковы батальён. Размешчаны ён быў у невялікім гарадку Асадабад каля афгана-пакістанскай мяжы — гэта самая ўсходняя кропка дыслакацыі савецкіх войск у Афганістане.

Ваявалі мар'інагорцы добра. Два ваеннаслужачыя з гэтага атрада сталі Героямі Савецкага Саюза.

Але на пачатку адметнага баявога шляху здарыўся бой у Мараварскай цясніне. Першы бой 334-га атрада на той вайне, пра які многія яго ветэраны і цяпер успамінаць не хочуць.

На месцы дыслакацыі сённяшняй брыгады стаіць помнік, на якім 108 прозвішчаў салдат і афіцэраў. Гібель 29-ці з іх датавана адным днём красавіка 1985 года. Гэта беспрэцэдэнтная колькасць ахвяр за адзін бой. Тым больш, для вайсковай эліты — спецназ.

...Выхад атрада ў горы пачынаўся як звычайныя вучэнні. І разглядаўся нібы лёгкая прагулка. Крыху больш за месяц былі мар'інагорцы на вайне — сапраўднага пораху яшчэ не нюхалі. Расслабляла надзея, што душманы павінны дрыжаць ад страху ад аднаго іх з'яўлення. Ды і накіроўваліся байцы ў ноч прачэсваць пасёлак, які знаходзіўся ўсяго за тры кіламетры ад іх ваеннага гарадка. Разведка заўважыла там назіральны пост маджахедаў — мізэрная цэль.

Але душманы добра падрыхтаваліся. Кажуць, што дапамаглі ім тады прафесійныя наёмнікі-іншаземцы. Заманілі нашу першую роту ў пастку. І калі тая, разбіўшыся на баявыя групы, пачала праследаваць паставых, якія нібы кінуліся наўцёкі, адсеклі яе ад астатніх, акружылі і пачалі знішчаць.

Боепрыпасы ў нашых скончыліся вельмі хутка: на такі кароткі выхад іх шмат браць не сталі. Радыёсувязь з батальёнам, як заўсёды гэта здараецца ў адказны час, знікла. І падтрымкі адтуль чакаць было бессэнсоўна.

Камандзір роты капітан Мікалай Цэбрук, зразумеўшы ўсё, кінуўся на ворага і быў забіты куляй у шыю. Лейтэнант Мікалай Кузняцоў ратаваў параненых, а потым, каб не трапіць у палон, падарваў сябе гранатай. Услед за ім яшчэ сем байцоў атрада, маладых, дужых, таксама не захацелі трапіць ворагу ў рукі жывымі — падрывалі сябе.

І ўсё гэта — пад бокам у нашага гарнізона. Шалёную страляніну ў гарах там, безумоўна, пачулі. Але тэхніка не магла ноччу хутка туды прарвацца, артылерыя падключылася са спазненнем, ды і не мелі артылерысты дакладных каардынат для стральбы ў цемры.

Кажуць, тыя спецназаўцы, хто ўцалеў, выходзілі з пекла да сваіх... ссівелымі. А ім жа толькі па васямнаццаць-дваццаць гадкоў было. У кагосьці з іх і зброю з рук пасля доўга не маглі вырваць.

Пра гэтую няўдалую аперацыю і сёння стараюцца шмат не гаварыць. Але гэта было. 29 маладых хлопцаў — ахвяр памылкі вайсковай тактыкі, шапказакідальніцтва ці штабной бязглуздзіцы — сёння нема глядзяць на нас з салдацкага помніка на тэрыторыі брыгады.

## Мяняю Даманава на Хельсінкі

З савецкіх часоў у тутэйшым гарнізоне кватаравалі яшчэ і вартавыя неба — зенітная ракетная брыгада. Брыгада мела добрую зброю для свайго часу — комплексы «Аса». Гэтая вайсковая часць і ў беларускай арміі захавалася. На мяжы двухтысячных гадоў яе адсюль перакінулі на Брэстчыну, у Даманава. Можа, такі маршрут і быў апраўданы стратэгічна, але для афіцэраў і іх сем'яў пераезд у лясны гарнізон падаўся цяжкім. Некаторыя і не паехалі ў даманаўскія лясы. Звольніліся, каб застацца ў горадзе.

Ужо гадоў дваццаць мар'інагорцы маюць магчымасць хоць штодзень і без усялякіх віз наведваць «Хельсінкі». Тут ёсць цэлы так званы фінскі квартал. Бо, як і ў Баранавічах, тут напрыканцы СССР будавалі гарадок для савецкіх часцей, якіх выводзілі з Германіі. Тэндар выйгралі будаўнікі з Фінляндыі. Імя «Хельсінкі» атрымаў узведзены імі ўнівермаг.

Дарэчы, сюды, як і ў Баранавічы, войскі з Германіі не прыйшлі. Цяжка меркаваць, як бы тады выглядаў гарнізон, атрымаўшы з Германіі яшчэ адну баявую паўнавартасную дывізію. У новыя кватэры з радасцю засяляліся мясцовыя вайскоўцы. Новабудоўлі прапаноўвалі тады нават мінскім бескватэрным — і некаторыя згаджаліся: вельмі ж незвычайна выглядала створанае фінамі жыллё. У нас тады так будаваць яшчэ не ўмелі.

Аснову сённяшняга гарнізона складае тая самая знакамітая 5-я брыгада спецназа. Яна цяпер тут адна за ўсіх. Летась злучэнне справіла паўвекавы юбілей. Туды па-ранейшаму мараць трапіць на службу беларускія юнакі. І, як і раней, гэта не кожнаму па сілах.

**Вікенцій КЛЮЧНІК.**

**Загінулыя ў баі ў Мараварскай цясніне 21 красавіка 1985 года**

1. капітан Мікалай Цэбрук
2. лейтэнант Мікалай Кузняцоў — падарваў сябе
3. сяржант Андрэй Жукаў
4. сяржант Алег Касымаў
5. сяржант Станіслаў Кульніс
6. сяржант Васіль Кухарчук — падарваў сябе
7. сяржант Юрый Гаўраш — падарваў сябе
8. сяржант Міхаіл Матах
9. сяржант Уладзімір Някрасаў
10. сяржант Віктар Тарасаў
11. сяржант Жумабек Уразбаеў
12. сяржант Юрый Шапавалаў
13. малодшы сяржант Ігар Нападоўскі
14. малодшы сяржант Абдурахман Чутанаў
15. яфрэйтар Аляксандр Вакулюк — падарваў сябе
16. яфрэйтар Нікан Камагорцаў
17. яфрэйтар Вячаслаў Марчанкаў — падарваў сябе
18. радавы Уладзімір Байчук
19. радавы Уладзімір Куракін — падарваў сябе
20. радавы Віктар Марахін
21. радавы Васіль Музыка — падарваў сябе
22. радавы Наіль Мустафін — падарваў сябе
23. радавы Андрэй Новікаў
24. радавы Алег Аўчыннікаў
25. радавы Уладзімір Папоў
26. радавы Вячаслаў Сулін
27. радавы Васіль Федзіў
28. радавы Сахоб Хайдараў
29. радавы Андрэй Чухунаў

■ З нагоды

# «ТРЫЦЦАТАЯ» СВЯТКУЕ ЮБІЛЕЙ...



Каля помніка дывізіі.

**Міхаіл Фрунзэ называў яе «жамчужынай» Чырвонай Арміі. Яе баявым перамогам на франтах Масква салютавала аж 11 разоў. Гэта было самае праслаўленае злучэнне Узброеных Сіл Савецкага Саюза. Больш ні адна дывізія, як 30-я Іркуцка-Пінская, не мела столькі ўзнагарод і тытулаў!**

На днях славутае злучэнне адзначыла свой 95-гадовы юбілей. І хоць легендарнай дывізіі больш не існуе (яна расфарміравана ў пачатку 1990-х), нашчадкі яе баявой славы ніколі не забываюць гады сваёй службы. І на гэты раз сабраліся ў Мар'інай Горцы — там, дзе ў апошні раз дыслакавалася злучэнне, — каб ускласці кветкі каля помніка «трыццаткі», узгадаць старонкі сваіх ваенных біяграфій і сустрэцца з аднапалчанамі.

Палкоўнік у адстаўцы Уладзімір Уласенка ўзначаліў Іркуцка-Пінскую ў 1991 годзе, калі дывізія з Чэхаславакіі была выведзена на беларускую зямлю. Падзеі 20-гадовай даўніны не забываюцца і сёння:

— Я прымаў дывізію ў ноч на 29 снежня, якраз пад Новы год. Пад маё камандаванне прыбыла каля 4,5 тысячы чалавек. Тут жа ўступіў у сілу загад аб расфарміраванні злучэння. Трэба было звольніць каля 500 афіцэраў і 300 прапаршчыкаў, якія чакалі свайго лёсу на прыступках будынка штаба, і дзесьці размясціць астатніх.

**Сёння няма ўжо дывізіі, брыгады, няма і базы. Аднак ёсць батальён і памяць, а таксама традыцыя, якая працягваюць нашы вайскоўцы.**

Як лічыць Уладзімір Васільевіч, справіцца з усім гэтым яму дапамог багаты жыццёвы вопыт. У свой час быў начальнікам аператыўнага аддзела 5-га корпуса і камандзірам 176-й брыгады ў Мінску. Пад яго кіраўніцтвам у 1985 годзе вялася падрыхтоўка да маштабных вучэнняў. Затым ён — камандзір брыгады ў Афганістане, і ваяваў, абышоўшыся без чалавечых страт. Пасля ўзначальваў дывізію ў Ерэване. Яе называлі Віцебскай, што было сімвалічным для ўраджэнца Полаччыны. А 30-й брыгадай кіраваў да 1994 года.

— Цягам часу ўсе разбегліся па сваіх нацыянальных кватэрах, — успамінае Уладзімір Уласенка. — У выніку ў брыгадзе засталіся ў асноўным беларусы. Людзі былі добрымі, ставіліся адзін да аднаго па-сяброўску. Сёння няма ўжо дывізіі, брыгады, няма і базы. Аднак ёсць батальён і памяць, а таксама традыцыя, якую працягваюць нашы вайскоўцы. *(У тым ліку і сам Уладзімір Васільевіч, выкладаючы тактыку ў Ваеннай Акадэміі).*

Афіцыйнай датай фарміравання злучэння лічыцца 11 лістапада 1918 года, калі 4-я Уральская стралковая дывізія была перайменавана ў 30-ю стралковую. Камандаваў ёй у той час знакаміты Васіль Блюхер. Дывізія ўдзельнічала ў баях супраць чэхаславацкага корпуса і белагвардзейцаў на пермскім кірунку, граміла войскі Калчака і Урангеля. Менавіта яе вайскоўцы фарсіравалі Сіваш і штурмавалі Чангар. Па хадайніцтве працоўных загадам Рэйваенсавета Рэспублікі ў снежні 1920 года дывізіі было прысвоена ганаровае найменне Іркуцкай. Толькі за гады Грамадзянскай вайны баявы сцяг злучэння ўвянчалі 3 ордэны Чырвонага Сцяга.

У гады мірнага жыцця 30-я стралковая таксама была на вышыні. Яна стала адной з першых дывізій, якая ў 1934 годзе атрымала вышэйшую ўзнагароду СССР. Уручаючы ёй ордэн Леніна, старшыня ЦВК Міхаіл Калінін падкрэсліваў магутнасць і неперамажнасць дывізіі.

І пацвердзіць справядлівасць гэтай адзнакі злучэнню давялося падчас Вялікай Айчыннай вайны. Летам 1941-га яна была разгорнута па штатах горнастралковай дывізіі і дыслацыравалася ў Малдавіі. Там, на ўсходнім беразе ракі Прут, і атрымала першае баявое хрышчэнне, разграміўшы 198-ю пяхотную дывізію гітлераўцаў. Затым, зноў стаўшы стралковай, удзельнічала ў абароне Нікалаева і Растова-на-Доне, вызваляла Таманскі паўвостраў, Беларусь, Усходнюю Прусію і Польшчу. Яе байцы штурмавалі Берлін, а Дзень Перамогі сустрэлі на подступах да Прагі. За гады вайны дывізія стала гвардзейскай, была ўзнагароджана ордэнам Суворава II ступені, атрымала найменне Пінскай. Героямі Савецкага Саюза сталі 25 яе вайскоўцаў.

У пасляваенныя гады Іркуцка-Пінская дыслацыравалася ў Беларусі. Пасля ажно 22 гады (з 1968-га па 1990-ы) знаходзілася ў Чэхаславакіі. У 1991 годзе зноў вярнулася ў беларускі край. Штаб размясціўся ў Мар'інай Горцы.

Пасля распаду Савецкага Саюза 30-я Іркуцка-Пінская была пераўтворана ў мотастралковую брыгаду беларускай арміі, затым — у базу захавання ўзбраення і ваеннай тэхнікі. Так перастала існаваць тая самая «жамчужына» Чырвонай Арміі, праслаўленае злучэнне былой краіны.

Артур Навуменка ўзначальваў базу захавання ўзбраення і ваеннай тэхнікі з 2002-га па жнівень 2003 года.

— У той перыяд асноўнай задачай базы з'яўлялася не захаванне маёмасці, як многія думаюць, а баявая падрыхтоўка, у тым ліку падтрыманне тэхнікі

**Афіцыйнай датай фарміравання злучэння лічыцца 11 лістапада 1918 года, калі 4-я Уральская стралковая дывізія была перайменавана ў 30-ю стралковую. Камандаваў ёй у той час знакаміты Васіль Блюхер.**

ў боегатоўнасці, — расказвае сённяшні начальнік кафедры ваеннай стратэгіі факультэта Генеральнага штаба Ваеннай Акадэміі. — Тут праходзілі службу выдатныя афіцэры, сюды прызываліся салдаты тэрміновай службы. Былі прадстаўлены амаль усе роды войск Узброеных Сіл: існавалі механізаваныя і танкавыя батальёны, група артылерыі, разведвальны батальён, зенітна-ракетны дывізіён, які неаднойчы выходзіў на баявыя стрэльбы на палігон Даманава. На жаль, у 2005 годзе база была расфарміравана, але нам удалося захаваць частку нашага славутага злучэння ў выглядзе 30-га гвардзейскага асобнага батальёна 19-й механізаванай брыгады, якая размяшчаецца ў маленькім гарадку Заслонава, што ў Віцебскай вобласці.

Памяць пра 30-ю Іркуцка-Пінскую дывізію будзе жыць доўга. Хаця б таму, што пра яе не забываюць самі вайскоўцы. Як аказалася, аднапалчане, якія жывуць у Расіі, стварылі ў Маскве арганізацыю ваеннаслужачых дывізіі, маюць свой сайт. Да сяброў-беларусаў прыехалі не з пустымі рукамі: да юбілею падрыхтавалі новую кнігу аб гісторыі баявога шляху Іркуцка-Пінскай дывізіі, якая хутка ўбачыць свет у выдавецкім доме «Звязда».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота аўтара.**
*Мар'іна Горка*

# ВАЕННЫ РАСІЙСКІ КАРАБЕЛЬ БУДЗЕ НАСІЦЬ ІМЯ БЕЛАРУСА



Віцэ-адмірал Іван Кузьміч Хурс.

**Мінск, Гомель, Брэст... Гэта не толькі сталіца і абласныя цэнтры Рэспублікі Беларусь. Гэтыя гарады маюць непасрэднае дачыненне да ваенна-марскога флоту Расійскай Федэрацыі.**

У Беларусі беражліва захоўваюць традыцыі ваенных маракоў, ганарацца іх подзвігамі. Вось чаму па распараджэнні Мінгарвыканкама № 354 ад 19 красавіка 2001 года ўстаноўлены шэфскія сувязі з экіпажамі караблёў Расіі. За Заводскім раёнам беларускай сталіцы замацаваны памежны вартавы карабель «Мінск» Калінінградскага пагранічнага рэгіянальнага кіравання, а вялікі дэсантны карабель «Мінск» Балтыйскага флоту — за Маскоўскім раёнам.

Нашы абласныя цэнтры таксама не застаюцца ў баку ад флоцкіх спраў: на Паўночным флоце ёсць малы супрацьлодачны карабель — МПК «Брэст», былы «Брэсцкі камсамолец», а ў складзе Каспійскай флатыліі — малы артылерыйскі карабель МАК-160 «Гомель».

У хуткім часе ваенна-марскі флот Расіі папоўніцца яшчэ адным караблём, назва якога таксама звязана з Рэспублікай Беларусь: ён будзе насіць імя нашага земляка, віцэ-адмірала Івана Кузьміча Хурса...

На суднабудаўнічым заводзе «Паўночная верф» Санкт-Пецярбурга ў лістападзе 2013 года адбылася закладка першага серыйнага судна сувязі. І загадам Галоўнакамандуючага ВМФ Расіі яму прысвоена імя «Іван Хурс».

Іван Кузьміч Хурс нарадзіўся 29 верасня 1922 года ў вёсцы Клетнае Дуброўскага сельсавета Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. Пасля школы паступіў у педагагічнае вучылішча. Аднак, скончыўшы два курсы, вырашыў звязаць сваё жыццё з морам. У 1939 годзе паступае і ў 1942 годзе заканчвае вышэйшае ваенна-марское вучылішча імя М.В. Фрунзэ.

Пасля выпуску накіроўваецца на Чарнаморскі флот, дзе выконвае абавязкі камандзіра катара, а затым — дывізіённага артылерыста.

Удзельнічаў у вайне з Японіяй. У прадстаўленні аб узнагароджанні старшага лейтэнанта Хурса ордэнам Айчыннай вайны I ступені, якое падпісаў камандзір 17-га асобнага дывізіёна тральшчыкаў, капітан-лейтэнант Іваноў, гаворыцца: «Камандзір 602-га тральшчыка старшы лейтэнант Хурс Іван Кузьміч за час знаходжання ў дывізіёне тральшчыкаў паказаў сябе выключна дысцыплінаваным і патрабавальным афіцэрам. Клапатлівы, ветлівы, камунікатыўны з таварышамі і карэктны з падначаленымі, у выніку чаго сярод асабовага складу карабля і дывізіёна карыстаецца заслужаным аўтарытэтам і павагай.

Дзякуючы ўмеламу кіраўніцтву і арганізацыі службы на караблі таварыш Хурс у кароткі тэрмін (8 дзён) здолеў прыняць ад ВМФ ЗША тральшчык № 100, цяпер 602-і ў склад ВМФ СССР. У выключна складаных метэаралагічных умовах дзякуючы яго ўмеламу кіраўніцтву і ўмелай працы асабовага складу карабель быў прывездзены на асобную ваенна-марскую базу без аварый і паломак.

З прыходам на базу судна было накіравана на баявое траленне праліва Лаперуза ад варожых мін. І тут дзякуючы ўмеламу кіраўніцтву камандзіра карабля экіпаж тральшчыка да 15 лістапада 1945 года вытраліў і расстраляў 43 міны праціўніка і правёў 32 караблі з найкаштоўнейшымі грузамі...».

У 1946 годзе Іван Кузьміч Хурс быў прызначаны начальнікам штаба дывізіёна, а затым камандзірам дывізіёна тральшчыкаў Ціхаакіянскага флоту. У 1951 годзе ён скончыў аддзяленне разведкі Вышэйшых акадэмічных курсаў, і з 1952 года Іван Кузьміч — афіцэр, старшы афіцэр, начальнік разведкі ВМФ СССР.



На стапелі галаўное судна сувязі «Юрый Іваноў», спуск на ваду якога адбыўся 30 верасня 2013 года на «Паўночнай верфі».

У 1959 годзе ён скончыў Ваенна-марскую акадэмію. У 1963—1971 гг. і ў 1973—1978 гг. — намеснік начальніка разведкі ВМФ, а ў 1971—1973 гг. — начальнік разведкі Чарнаморскага флоту. У 1978 — 1987 гадах — начальнік Разведупраўлення Галоўнага штаба ВМФ — намеснік начальніка Галоўнага штаба ВМФ па разведцы.

У 1987 годзе віцэ-адмірал Іван Кузьміч Хурс сышоў у адстаўку. Ён унёс вялікі ўклад у развіццё пастаянна дзеючай сістэмы разведкі ВМФ, стварэнне разведвальных караблёў новага пакалення, спецыяльных сістэм... За што быў удастоены Дзяржаўнай прэміі, узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступені, чатырма ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам «За службу ва Узброеных сілах СССР» III ст., медалямі.

Віцэ-адмірал Іван Кузьміч Хурс памёр 28 снежня 2002 года ў Маскве. І цяпер яго імя будзе насіць судна сувязі ваенна-марскога флоту Расіі.

Варта адзначыць, што галаўное судна сувязі гэтай серыі, спуск на ваду якога адбыўся 30 верасня на суднабудаўнічым заводзе «Паўночная верф», названа ў гонар віцэ-адмірала Юрыя Васільевіча Іванова, які таксама ўнёс значны ўклад у стварэнне і развіццё пастаянна дзеючай разведкі ВМФ.

**Мікалай БОЙКА.**

■ Конкурс

# МЫ ПОМНІМ ІМЁНЫ ГЕРОЯЎ

**Подзвіг народа — прамое адлюстраванне подзвігу кожнага чалавека, памножанае на мільён, на дзясяткі мільёнаў. Яркім прыкладам з'яўляецца подзвіг Казбека Бейсенавіча Нуржанава, Героя Савецкага Саюза, які ўдзельнічаў у вызваленні нашага роднага Ваўкавыска ад фашысцкіх захопнікаў.**

Казбек Нуржанаў пражыў вельмі кароткае жыццё. Ён, просты сельскі настаўнік з Казахстана, у красавіку 1942 года трапіў у пекла Вялікай Айчыннай вайны. Ваяваў на Волзе, пад Арлом, фарсіраваў Дзясну, Сож, Днепр, Друць, Бярэзіну. А скончыў свой баявы і жыццёвы шлях воіна на беларускай зямлі, на Ваўкавышчыне.

У ліпені 1944 года ў баях пры вызваленні райцэнтра воін з Казахстана ўзначаліў групу захопу, якая дзейнічала на флангу. Рашучыя дзеянні групы пасеялі паніку ў стане ворага. Гітлераўцы, кідаючы баявую тэхніку і зброю, уцякалі. Храбры воін першым уварваўся ў Ваўкавыск, ведучы за сабой наступаючую пяхоту. На ўскраіне горада Казбек Нуржанаў быў смяротна паранены.

За праяўленыя мужнасць і гераізм Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР Указам ад 24 сакавіка 1945 года прысвоіў Казбеку Бейсенавічу Нуржанаву званне Героя Савецкага Саюза пасмяротна. Аднак месца яго пахавання доўгі час заставалася невядомым. І толькі ў 2010 годзе было вызначана, што пахаваны ён у брацкай магіле каля царквы ў вёсцы Дзярэчын Зэльвенскага раёна. Мы і ўявіць сабе не маглі, што ўсяго ў трыццаці хвілінах язды ад Ваўкавыска пахаваны той, чыё жыццё аддадзена за шчасце дзяцей і спакой старых, за нашу родную зямлю.

У выўкавыскай школе ўжо даўно вядзецца актыўная праца па ўвекавечванні памяці герояў Вялікай Айчыннай вайны. Сёння мы працуем над праектам «Ніхто не забыты, нішто не забыта». Гэта ўнікальная магчымасць для нас даведацца пра суровую праўду тых дзён, пра гістарычны досвед стойкасці і самаадданага служэння Радзіме яе сыноў. Наведваем ветэранаў, гутарым з імі, даведваемся шмат новага і цікавага з іх жыцця, аказваем пасільную дапамогу.

Толькі асабіста сутыкаючыся з вопытам людзей, якія перажылі ваеннае ліхалецце, мы можам уявіць факты франтавога жыцця арміі і тылу, працы на мяжы чалавечых сіл, пачуць пра рэальныя, «некіношныя» прыклады моцы духу і маральнай стойкасці.

**Вікторыя КАЗІМІРЧЫК і Максім СКЯПКО.**
*сярэдняя школа №5 г. Ваўкавыска.*

■ Можна праверыць

# ФІЗКУЛЬТУРА: КАМУ ЯКАЯ?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Па розныхназіраннях, амаль палова тых, хто вырашыў заняцца спортам, праз два-тры месяцы кідаюць занятак. Прычыны могуць быць рознымі, аднак аб'ядноўвае іх, па сутнасці, спроба займацца... не сваім відам фізічнай нагрузкі. Вось як рэкамендуюць падыходзіць да справы на Усходзе.**

**Людзі знаку Зямлі** ***(народжаныя 1 — 19 студзеня, 20 красавіка —19 мая, 20 жніўня —19 верасня, 20 — 31 снежня)*** не здольныя вытрымліваць працяглыя фізічныя нагрузкі. Ім патрэбна медытацыйная настройка, лёгкі масаж, а пры інтэнсіўных практыкаваннях — частыя перапынкі. Па завяршэнні нагрузкі трэба на працягу 20 хвілін адпачыць — прысесці, каб стабілізаваліся пульс і дыханне. Пасля можна прыняць душ.

«Зямным» падыходзяць тыя віды спорту, дзе патрабуецца індывідуальнае майстэрства. Гэта бокс, фехтаванне, стральба, конны спорт, турызм, усходнія адзінаборствы, тэніс і настольны тэніс, цяжкая атлетыка, бодзібілдынг. Спартыўныя і бальныя танцы — таксама для «зямных» меланхолікаў, якія адчуваюць партнёра як ніхто іншы. Чулллівыя «зямныя» наогул перажываюць творчы ўздым, прыліў сілы падчас руху пад мелодыю. У меншай ступені падыходзяць спартыўныя гульні, альпінізм, парашутны спорт, акрабатыка, гімнастыка, а таксама шахматы і шашкі.

Фізкультура зімой — не лепшы варыянт для «зямных», бо ім неабходна пастаянна атрымліваць энергію з прыроднага акружэння, а яно ў халодны час «спіць». Лыжы, канькі не выключаюцца, аднак цяжкавата будзе дасягнуць высокіх вынікаў падчас спаборніцтваў.

**Людзі знаку Паветра** ***(20 студзеня — 19 лютага, 20 мая — 19 чэрвеня, 20 верасня — 19 кастрычніка)*** захапляюцца каманднымі відамі спорту. Футбол, баскетбол, валейбол, гандбол. Добра падыдуць і тэніс, у тым ліку настольны, розныя віды барацьбы, бег, плаванне, скачкі ў ваду, аэробіка. Людзі гэтага знака лёгка прывыкаюць да фізічных нагрузак і маюць моцную волю. Іх цалкам паглынае тое, чаму яны аддалі перавагу, так што нярэдка гэта — куміры балельшчыкаў, якія даволі доўга застаюцца ў выдатнай форме. Часцей за ўсё да самага сталага веку гэтыя людзі складаюць асноўную «ўдарную моц» любога фізкультурнага руху.

Галоўная бяда «паветраных» — няўважлівасць і лянота. Ім пастаянна трэба нагадваць пра небяспеку, надзвычайныя сітуацыі, а таксама прымушаць выконваць пастаўленыя задачы, паколькі ўгаворы не дадуць станоўчага выніку.

«Паветраным» можна не баяцца холаду, дажджу і снегу. Галоўнае на свежым паветры — актыўна рухацца.

**Людзі знаку Вады** ***(20 лютага — 19 сакавіка, 20 чэрвеня — 19 ліпеня, 20 кастрычніка —19 лістапада)*** не вылучаюцца тэмпераментам і актыўнасцю, але заўсёды ўсё выконваюць грунтоўна і з веданнем справы. «Водныя» моцныя і дакладныя ў рухах, аднак у іх запаволеная рэакцыя. А значыць, ім не падыдуць настольны тэніс, бокс, бадмінтон ці валейбол.

Іх віды спорту — кіданне дыска, штурханне ядра, шахматы. Менш удала даюцца ім бег і скачкі, больш удала — плаванне, у тым ліку сінхроннае. Падыходзяць культурызм, павольная хада, класічная барацьба. Аэробіка, гімнастыка — лепшы сродак для аздараўлення і пад'ёму настрою. Водным даводзіцца надаваць увагу спорту і фізкультуры да глыбокай старасці, таму што яны схільныя да паўнаты, хвароб сэрца, печані, падстраўнікавай залозы, апорна-рухальнага апарату.

Таму не трэба забывацца на водныя працэдуры, саўну, лазню, масаж.

З прыходам халадоў лепш займацца ў памяшканнях.

**Людзі знаку Агню** ***(20 сакавіка — 19 красавіка, 20 ліпеня — 19 жніўня, 20 лістапада — 19 снежня)*** валодаюць моцнай воляй, развітай мышачнай сістэмай, здольны паказваць добрыя вынікі практычна ва ўсіх відах спорту. Паважаюць законы і абавязкі. Перад імі неабходна ставіць канкрэтныя задачы.

Падыдуць і гульнявыя віды, і адзінаборствы. Не надта пасуе ім настольны тэніс, стральба ці, скажам, бадмінтон або фігурнае катанне (хіба адзіночнае).

«Вогненных» можна ўбачыць у вадалазным касцюме і амуніцыі альпініста, на лыжах ці велатрэку. Аэробіка, гімнастыка, грэбля, адзінаборствы — усё гэта падыходзіць «вогненным».

Восенню і зімой ім карысна займацца фізічнымі практыкаваннямі на адкрытым паветры, што рацыянальна размяркоўвае біяэнергетычны патэнцыял, загартоўвае цела, умацоўвае волю, ураўнаважвае эмоцыі.

**Сяргей АНУПРЫЕНКА,**
**доктар філасофскіх навук**

■

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

| Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов | Аукцион состоится 10 января 2014 года в 11.00 по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45 (подъезд 2, этаж 1) КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» | | |
|---|---|---|---|
| **Номер лота** | **1** | **2** | **3** |
| **Адрес земельного участка** | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Олимпийская, 16 | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Олимпийская, 14 | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Волкова, 30/1 |
| **Кадастровый номер участка** | 321850100001002078 | 321850100001002077 | 321850100001001312 |
| **Площадь, га** | 0,0965 | 0,0979 | 0,0999 |
| **Целевое назначение** | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (размещение объектов усадебной застройки) | | |
| **Условия и ограничения** | 1. победителю либо единственному участнику несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней с даты утверждения протокола результатов аукциона:<br>- внести плату за земельный участок (часть платы в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>- возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка;<br>2. после совершения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона действий, названных в п. 1, в двухмесячный срок осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в установленном порядке;<br>3. получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение Жлобинского районного исполнительного комитета на строительство одноквартирного жилого дома;<br>4. приступить к строительству одноквартирного жилого дома в течение одного года, со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома;<br>5. снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проектной документации;<br>6. завершить строительство объекта в сроки, определенные законодательством;<br>7. по мере изменения фактического состояния и характера использования земель обратиться в райисполком для внесения сведений об изменении видов земель в государственный земельный кадастр. | | |
| **Начальная стоимость, рублей** | 13 274 636 | 13 467 222 | 38 183 977 |
| **Сумма задатка, рублей** | 1 300 000 | 1 300 000 | 3 800 000 |
| **Затраты по изг. зем. документации, рублей** | 5 354 746 | 5 362 187 | 2 389 266 |
| **Стоимость расходов по орг. и проведению аукциона (ориент.), рублей** | 1 000 000 | 1 000 000 | 1 000 000 |
| Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций; строений и сооружений; инженерно-геологические условия: участки свободны от застройки (инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ) | | | |
| Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: общие сети и сооружения инженерной инфраструктуры отсутствуют | | | |

1. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 26.03.2008 г. № 462.

2. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Не допускается продажа по начальной цене.

Победителем признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По заявлению победителя аукциона местным исполнительным комитетом предоставляется рассрочка внесения платы за предмет аукциона. Указанное заявление подается победителем аукциона в местный исполнительный комитет не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона. Решение о предоставлении рассрочки внесения платы за предмет аукциона принимается местным исполнительным комитетом в течение 5 рабочих дней со дня получения заявления о предоставлении рассрочки.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

После совершения победителем аукциона вышеуказанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет передает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

3. Если аукцион признан несостоявшимся в связи с тем, что заявление на участие в нем подано только одним участником, земельный участок предоставляется этому участнику при его согласии с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, с выдачей ему в день признания аукциона несостоявшимся копии протокола о признании аукциона несостоявшимся.

В течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо обязаны внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

После совершения участником названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет передает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о признании аукциона несостоявшимся, в котором указываются лицо, выразившее согласие на приобретение этого земельного участка, и иные сведения, предусмотренные в части второй пункта 28 Положения.

4. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) **с 9.00 до 17.00 по рабочим дням в срок по 8 января 2014 года** подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые они желают приобрести в частную собственность, а также представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка.

Кроме того, Организатору аукциона представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Документы принимаются по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского,45 (подъезд 2, этаж 1).**

5. *Перечисление суммы задатка осуществляется на расчетный счет Организатора аукциона № 3012006530013 в филиале № 312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобин, код МФО 151501673, УНН 490317354, сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона.*

Всем желающим представляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту и с объектом в натуре.

Контактные телефоны: **8 (02334) 3 14 08, 2 18 18.**

■ Дзе розум...

# ПАД «КАЙФАМ» — НА КАНЦЭРТ

**Падчас дзяжурства на канцэрце амерыканскай метал-групы патрульны нарад сталічнага атрада міліцыі асаблівага прызначэння звярнуў увагу на двух падлеткаў. Потым пацвердзілася, што невыпадкова: яны знаходзіліся ў стане наркатычнага ап'янення.**

З боку 17-гадовых хлопцаў, што курылі пад аркай аднаго з дамоў па праспекце Пераможцаў, цягнула дымам, які зусім не быў падобны на цыгарэтны. Ды і самі падлеткі не надта арыентаваліся ў прасторы, а на пытанні праваахоўнікаў не маглі даць ніводнага зразумелага адказу, паведамілі ў прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама. Па ўсім выходзіла, што хлопцы, хутчэй за ўсё, ужывалі папулярныя ў моладзевым асяроддзі міксы для курэння. Таму падлеткаў даставілі ў райаддзел міліцыі, дзе медыцынскі агляд пацвердзіў падазрэнні міліцыянераў: маладыя людзі, што прыйшлі на канцэрт, знаходзіліся ў стане наркатычнага ап'янення.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное производственное объединение**
**«Минскстрой»**
220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А

режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00,
тел.: 327-52-36, 226-03-01

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3-х лет, предшествующих опубликованию настоящей декларации, с указанием фактических сроков строительства:

- ул. Чичурина, д. 6 – 10 мес., ул. Чичурина, д. 12 – 11 мес., ул. Чичурина, д. 14 – 18 мес., ул. Чичурина, д. 18 – 17 мес., ул. Чичурина, д. 20 – 27 мес., пр-т газеты «Правда», д. 3 – 24 мес., ул. Панченко, д. 10 – 11 мес., ул. Панченко, д. 10А – 12 мес., ул. Матусевича, д. 56 – 23 мес.

**Объединение осуществляет строительство объекта «Многоквартирный жилой дом № 5 по генплану со встроенными помещениями по пр. Независимости в м-не Уручье-3 в г. Минске».**

Свидетельство (удостоверение) № 500/756-1170 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права собственности на него от 12 ноября 2007 г.

Земельный участок площадью 1,1083 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома запроектировано из трех разновысоких секций. 1 и 3 секции – 12 этажей, 2 секция – 15-17 этажей. На нижних 2 этажах предусмотрены площади для встроенных помещений с дебаркадером. Количество жилых помещений жилого дома – 202.

Начало строительства – август 2008 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию нежилого помещения – декабрь 2013 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 17.10.2006 № 2245-5/06.

Договор создания объекта долевого строительства будет заключаться на строительство нежилого помещения (дебаркадера) площадью по экспликации помещений 679,77 м$^2$.

Предметом договора будет являться строительство нежилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра площади нежилого помещения (дебаркадера) без учета выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет – 9 305 644 руб.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 09.07.2008 № 2-К, генподрядчик – ПК УП «Монолит».

Заявления о долевом строительстве нежилого помещения будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящей проектной декларации в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

*Генеральный директор* *Н.В. Милошевский*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Солигорскторг» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже**

**здания специализированного для розничной торговли (магазин № 35)**

**общей площадью 7 296,4 кв.м (инв. № 644/С-3766), ВКЛЮЧАЯ МНОГОЛЕТНИЕ НАСАЖДЕНИЯ. Указанное имущество расположено на земельном участке площадью 1,2200 га (предоставлен в постоянное пользование) с кадастровым номером 643000000001001064, по адресу: Минская область, Солигорский район, ул. К. Заслонова, д. 63. Часть указанного недвижимого имущества сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона).**

**Начальная цена с НДС– 44 640 112 080 бел. руб.**

**Задаток 5% от начальной цены (2 232 000 000 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

*Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 20.11.2013 г.*

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **20.12.2013** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.12.2013** до 16.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**

## ОАО «Белторгстрой»

**уведомляет своих акционеров:**

В связи с реорганизацией ОАО «Белторгстрой» в форме присоединения к ОАО «Белбакалея», в соответствии со статьей 78 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах» у акционеров, голосовавших против такого решения или не участвовавших во внеочередном собрании акционеров, на котором было принято такое решение, возникает право требования выкупа принадлежащих им акций.

Внеочередным собранием акционеров установлено:

- цена выкупа акций в размере номинальной стоимости — 1200 рублей за 1 простую (обыкновенную) акцию;

- оплата акций при их выкупе осуществляется в белорусских рублях безналичным перечислением на счет (по заявлению продавца);

- срок, в течение которого акционеры могут предъявить письменное требование Обществу о выкупе принадлежащих им акций, с 28 ноября 2013 г. по 16 января 2014 г;

- срок выкупа акций у акционеров с 17 января 2014 г. по 15 февраля 2014 г.

Письменное требование акционера должно содержать фамилию, собственное имя, отчество, подпись, количество акций, выкуп которых требуется.

Письменные требования направлять по адресу: 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31, тел. (80173) 34-56-34.

УНП 100633428

## ИЗВЕЩЕНИЕ

УНП 100071325

**Государственное производственное объединение**
**«Минскстрой»**

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ**
**объекта «Строительство многоквартирных жилых домов типовых потребительских качеств №№ 9, 11 (по генплану) со встроенно-пристроенными помещениями в жилом квартале в границах ул. Янковского – ул. Горецкого – ул. Проектируемой». Жилой дом № 11 по генплану» в г. Минске,**
*опубликованную в газете «Звязда» 4 октября 2013 года:*

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений № 4, № 5, № 10, № 11, № 12, № 13, № 17, № 18, № 19, № 20, № 24, № 26, № 27, № 31, № 32, № 33, № 34, № 38, № 39, № 40, № 41, № 46, № 92, № 93, № 94, № 95, № 96, № 97, № 99, № 100, № 101, № 102, № 103, № 104, № 106, № 107, № 108, № 109, № 110, № 111 с учетом выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, в текущих ценах составляет:

1-комнатных квартир – 14 643 796 рублей;

2-комнатных квартир – 14 234 165 рублей.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

*Генеральный директор* *Н.В. Милошевский*

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 | **Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов** | **Аукцион состоится 14 января 2014 года по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45 КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью»** | |
| 2 | **Срок приема документов** | **с 9.00 до 17.00 по рабочим дням по 9 января 2014 года** | |
| 3 | **Номер лота** | **1** | **2** |
| 4 | **Адрес земельного участка** | Гомельская область, Жлобинский район, Староруднянский с/с, д. Старая Рудня (пересечение улиц Петровского и Стадионная) | Гомельская область, Жлобинский район, Краснобережский с/с, аг. Красный Берег, ул. Кооперативная, 1 |
| 5 | **Кадастровый номер участка** | 321886803601000339 | 321882404101000819 |
| 6 | **Площадь, га** | 0,0071 га | 0,2402 га |
| 7 | **Целевое назначение** | для установки торгового павильона (размещение объектов розничной торговли) | для установки торгового павильона (размещение объектов розничной торговли) |
| 8 | **Срок аренды** | 15 лет | 15 лет |
| 9 | **Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций; строений и сооружений; инженерно-геологические условия** | Участок свободен от застройки (инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ) | |
| 10 | **Условия и ограничения** | 1. победителю либо единственному участнику несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней с даты утверждения протокола результатов аукциона (либо признания аукциона несостоявшимся):<br>- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>- возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков;<br>2. после совершения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона действий, названных в п. 1, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с Жлобинским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды государственную регистрацию прав, ограничений прав на земельный участок;<br>3. получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение Жлобинского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий одного года;<br>4. приступить к занятию земельного участка в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такового объекта;<br>5. снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проектной документации;<br>6.завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией. | |
| 11 | **Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории** | Подключение к общим сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД. | |
| 12 | **Начальная стоимость, рублей** | 55 235 | 2 022 326 |
| 13 | **Сумма задатка, рублей** | 11 000 | 400 000 |
| 14 | **Затраты по изготовлению землеустроительной документации, рублей** | 6 439 008 | 8 383 952 |
| 15 | **Стоимость расходов по организации и проведению аукциона (ориентировочно), рублей** | 1 000 000 | 1 000 000 |

1. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 26.03.2008 г. № 462.

2. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Не допускается продажа по начальной цене.

Победителем признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По заявлению победителя аукциона местным исполнительным комитетом предоставляется рассрочка внесения платы за предмет аукциона. Указанное заявление подается победителем аукциона в местный исполнительный комитет не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона. Решение о предоставлении рассрочки внесения платы за предмет аукциона принимается местным исполнительным комитетом в течение 5 рабочих дней со дня получения заявления о предоставлении рассрочки.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

После совершения победителем аукциона вышеуказанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет заключает с ним договор аренды земельного участка.

3. Если аукцион признан несостоявшимся в связи с тем, что заявление на участие в нем подано только одним участником, земельный участок предоставляется этому участнику при его согласии с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, с выдачей ему в день признания аукциона несостоявшимся копии протокола о признании аукциона несостоявшимся.

В течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо обязаны внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

После совершения участником названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет заключает с ним договор аренды земельного участка.

4. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) **с 9.00 до 17.00 по рабочим дням в срок по 9 января 2014 года** подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. *Перечисление суммы задатка осуществляется на расчетный счет Организатора аукциона № 3012006530013 в филиале № 312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобин, код МФО 151501673, УНН 490317354, сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона.*

Всем желающим представляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту и с объектом в натуре.

Контактные телефоны: **8 (02334) 3 14 08, 2 18 18.**

■ У эфіры

# МАЕШ ВЕДЫ? ПРЫМЯНЯЙ І ВЫЙГРАВАЙ!

**Неўзабаве тэлеканал СТБ запускае новы праект — інтэлект-шоу «Разумней не прыдумаеш». 16 каманд, у кожнай з якіх па 4 прадстаўнікі пэўнай прафесіі, будуць спаборнічаць за ганаровае званне сапраўдных інтэлектуалаў. Пераможцам жа ў дадатак да гэтых лаўраў дастанецца галоўны прыз — вандроўка ў Чарнагорыю.**

Фота: прэс-служба тэлеканала СТБ.



Як распавяла «Звяздзе» прэс-сакратар тэлеканала Анастасія Савіцкая, кожны сезон інтэлект-шоу «Разумней не прыдумаеш» складаецца з 15 гульняў: 8 адборачных, 4 чвэрцьфінальных, 2 паўфіналаў і фіналу. У кожнай гульні — 5 геймаў, за якія 2 каманды-саперніцы павінны набраць найбольшую колькасць балаў і прайсці ў наступны этап.

Правілы праекта досыць простыя і зразумелыя. У першым гейме адбываецца своеасаблівая «размінка» і правяраюцца агульныя веды ўдзельнікаў: вядучы «закідвае» каманды 15 пытаннямі, на якія трэба адказаць як мага хутчэй (на роздум усяго 3 секунды). Пытанні могуць быць самыя розныя: ад таго, колькі пар храмасом у ДНК малпы, да таго, якая краіна выпускае аўтамабіль маркі Ferrari.

У наступным гейме абвяшчаецца пэўная тэма гульні, а задача ўдзельнікаў — націснуць на кнопку і даць правільны адказ хутчэй за канкурэнтаў. Як кажуць, «хто паспеў — той і з'еў». У наступным туры месца вядучага займае запрошаны «зорны госць», які задае камандам па 4 пытанні — як правіла, са сваёй прафесійнай сферы.

Чацвёрты гейм носіць красамоўную назву «Мой родны кут». Адпаведна, усе пытанні ў ім датычацца Беларусі. А вы памятаеце, напрыклад, хто аўтар паэмы «Новая зямля» і якая жывёліна змешчана на гербе Гародні? Не ўпусціце магчымасць праверыць сябе і дапоўніць або асвяжыць веды! На гэтым этапе ўдзельнікі, якія даюць няправільныя адказы, выбываюць з гульні, пакуль не застанецца толькі адзін інтэлектуал.

Зыход жа фінальнага раўнда ў многім залежыць ад капітанаў каманд. Пераможцаў кожнай гульні адзначаць невялікімі прызамі, але галоўны прыз атрымае толькі адна, самая моцная, зладжаная і разумная каманда.

Вядучы шоу «Разумней не прыдумаеш» Міхаіл Марфін вядомы тэлегледачам і як гулец у КВЗ, акцёр і сцэнарыст мноства праграм, і як вядучы віктарыны — дарэчы, таксама інтэлектуальнай — «Шчаслівы выпадак». Прапанову весці беларускі праект, прызнаецца, ён атрымаў «ад мінскіх сяброў» і адразу пагадзіўся: «Мне гэта цікава і ў прафесійным сэнсе, і па-чалавечы. Я вельмі люблю Мінск, у мяне тут шмат сяброў, з якімі цяпер зможам больш шчыльна працаваць і часцей сустракацца».

Дарэчы, першы сезон гульні — цікавай, азартнай, эмацыянальнай і шмат у чым непрадказальнай — ужо знялі, а вось на другі яшчэ цалкам рэальна трапіць. Для гэтага неабходна заручыцца згодай як мінімум 3 калег і сяброў, абраць капітана будучай каманды і запоўніць заяўку на сайце тэлеканала СТБ. А для размінкі і праверкі ўласных сіл варта паглядзець першыя выпускі інтэлект-шоу «Разумней не прыдумаеш» і адказаць на пытанні разам з гульцамі, толькі па гэты бок экрана. Праект будзе выходзіць у эфір увечары па буднях (20.15), а таксама паўтарацца ў суботу (17.40). Першы выпуск — 7 снежня.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, г. Дзяржынск.



## Снежань снегам вока цешыць

**Па гарызанталі: 1.** «Ад Дзвіны да Прыпяці — бела-бела, \\Ад Дняпра да Нёмана — ... і ...». З верша П. Панчанкі «Снежань». **7.** Знак задыяка беларускага народнага календара, які прыходзіцца на перыяд ад 24 снежня да 18 студзеня. **8.** У снежні мароз і снег вышэй хаты — ... будзе багаты (прык). **9.** Хуткая змена, пералівы колераў, святла. **11**. Кармушка для жывёлы. **13.** Натоўп, зграя. **14.** Калі снежань сухі — вясна і ... будуць сухія (прыкм.). **15.** Піліпаўскі ... . Перыяд устрымання ад скаромнай ежы, які доўжыцца ад 28 лістапада да 7 студзеня. **16.** «... прыйшла крадком, паціху.\\Бялюткай ноч раптоўна стала». З верша Я. Мальца «Надыход зімы». 18. Музычны смычковы інструмент. **19.** «Шчокі ружавеюць -\\... хлопцаў грэюць». З верша А. Дзеружынскага «Першы снег». **23.** Урачысты верш. **25.** Старажытнабеларуская назва снежня. **26.** Снежань вока снегам цешыць, ды марозам ... рве (прык.).

**Па вертыкалі: 1.** «Вунь пасялілася ...,\\Ужо наведала балкон». З верша М. Стральцова «Першы снег». **2.** Драўляная перакладзіна ў санях. **3.** У народзе кажуць: «... Юр'і ды абодва дурні: адзін галодны (6 мая), а другі халодны (9 снежня). **4.** Прэснаводная рыба сямейства карпавых. **5.** Паслядоўнік ёгі. **6.** Пацяпленне зімой пасля марозу. **10.** «З сабой зіма прынесла нам\\Забавы, ... і ўцехі». З верша А. Грушэцкага «Зіма». **12.** «Снежань. Снежна. ....\\Сані шпарка імчацца». З верша Ю. Півунова «Снежань. Снежна. ...». 15. Прыйдзе ... хмуры — раскапае гуры (прык.). Прысвятак ... адзначаўся 5 снежня. **17.** Невялікая арыя. **20.** Вялікі гістарычны перыяд. **21.** «А перад тым, як выпіць чарку,\\Мы гэтак голас узнясём:\\За ..., за нашу гаспадарку». З верша Я. Коласа «Тосты. Пад Новы 1948 г.». **22.** Літара гістарычнай кірыліцы і глаголіцы; зараз ужываецца толькі ў царкоўнаславянскай мове. **24.** Мера зямельнай плошчы.

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 1. Снег. 7. Мядзведзь. 8. Год. 9. Ігра. 11. Яслі. 13. Арда. 14. Лета. 15. Пост. 16. Зіма. 18. Альт. 19. Лыжы. 23. Ода. 25. Прасінец. 26. Вуха.

**Па вертыкалі:** 1. Сініца. 2. Вяз. 3. Два. 4. Язь. 5. Ёг. 6. Адліга. 10. Радасць. 12. Снегіры. 15. Пракоп. 17. Арыёза. 20. Эра. 21. Мір. 22. Яць. 24. Ар.

■ Крытыка на шпільцы

# ЖАХІ, ТАЯМНІЦЫ І ТРОШКІ ІРОНІІ



**Нядаўна паспрачалася ў інтэрнэце: а ці патрэбна пісьменніку натхненне? Як на мой погляд, то паэзія наогул без стану творчага ўздыму немагчымая. Менавіта натхненне пераводзіць у ранг паэзіі версіфікатарства, робіць яго актам мастацтва. Але ёсць і іншыя меркаванні... Так адзін вядомы крытык запярэчыў: «А навошта яно было Цвятаевай, якая кожную раніцу а шостай гадзіне садзілася за стол і працавала, не снедаўшы і не звяртаючы ўвагу на тое, што ў яе за акном? Навошта яно было Стывену Кінгу, які за 10 дзён напісаў «Чалавека, які бяжыць»? Альбо Дзюма?...»**

Але ж менавіта натхненне — гэта той асаблівы стан, які, з аднаго боку, характарызуецца велізарным пад'ёмам і напружаннем чалавечых сіл, з другога боку — высокай працаздольнасцю. Натхненне — гэта не столькі імпульс да працы, колькі складнік творчай дзейнасці.

Відавочна, што розныя жанры літаратуры патрабуюць і рознай ступені эмацыйнага ўздыму. Літаратуразнаўцы, напрыклад, вылучаюць у асобную групу так званую формульную літаратуру — літаратурныя творы, якія былі напісаны паводле пэўнай схемы. Да такой літаратуры адносяць меладраму, любоўныя гісторыі, дэтэктывы, трылеры, фэнтэзі, прыгоды і містыку.

Да нядаўняга часу гэтыя жанры ў Беларусі, хоць і былі запатрабаваны чытачом, але рэдка выкарыстоўваліся пісьменнікамі. Сёння ж можна назіраць цікавасць да іх і ў айчынных творцаў, асабліва тых, хто займаецца перакладамі. Не так даўно выйшаў зборнік перакладных дэтэктываў «Злачынства, сэр!» А цяпер убачыў свет зборнік містычных апавяданняў «Вусцішны пакой».

Як і папярэдняя кніга, «Вусцішны пакой» — гэта зборнік апавяданняў, напісаных у розных канцах свету ў розны час рознымі аўтарамі і аб'яднаных тэмай страху. Дэвізам гэтай кнігі мог бы стаць першы радок са змешчанага тут апавядання Эдгара Алана По «Метцэнгерштэйн»: «Ва ўсе часы чалавека паўсюль праследавалі жах і лёс» (пераклад Г. Янкуты). Аднак трэба прызнаць, што ў кнігу трапіла шмат твораў, якія нягледзячы на вызначэнне складальнікаў, назваць уласна «містычнымі» складана.

Напрыклад, «Адчыненае акно» Сакі (у перакладзе А. Казловай), «Трыюмфы таксідэрміста» Герберта Уэлса (у перакладзе А. Арцёмава), ды і сам «Вусцішны пакой» Артура Конан Дойла (пераклад Алены Пятровіч), які даў назву ўсяму зборніку — творы, хутчэй, вясёлыя і іранічныя, чым вусцішныя.

Аднак жахаў і містыкі для ахвочых усё ж хапае: у кнізе больш за чатыры сотні старонак уборыстым шрыфтам, таму чытаннем для змрочных вечаровых прыцемкаў наш чытач да вясны будзе забяспечаны. Гэтак жа, як і ведамі пра тое, што ёсць гатычны раман, бо менавіта звесткі пра яго змешчаны ў прадмове да кнігі. На жаль, многія сказы з гэтай прадмовы аказваюцца добра знаёмымі тым, хто цікавіцца так званым «гатычным раманам» і, у прыватнасці, творчасцю Эн Рэдкліф. Здзіўленне выклікае і тое, што аўтары, пра якіх гаворыцца ў прадмове, вельмі мала прадстаўлены ў самім зборніку «Вусцішны пакой». У прадмове, дарэчы, пераважная большасць пісьменнікаў — англамоўныя, а ў самой кнізе прадстаўлена вельмі інтэрнацыянальная каманда: тут і ўкраінец Юры Вінічук, і паляк Баляслаў Лесьман, і партугалец Марыю ды Са-Карнэйру, і шведка Сельма Лагерлёф. Аднак, як паказвае вопыт чытання, усе творы, прадстаўленыя ў кнізе, выдатна працягваюць даўнюю традыцыю літаратуры «жахаў і таямніц», нягледзячы нават на тое, што некаторыя аўтары працавалі ў такіх, здавалася б, сучасных жанрах, як альтэрнатыўная гісторыя ці фэнтэзі.

Так, падзеі, пра якія паведамляецца ў апавяданні «Выспа-сяброўка» Фрэнсіс Стывенс (пераклад Паўла Донава), адбываюцца ў свеце, дзе жанчыны з'яўляюцца моцным полам. Зусім не вусцішна, а, хутчэй, забаўна чытаць развагі галоўнай гераіні-марачкі пра мужчын: «Ох, не так ужо і дрэнна я да мужчын стаўлюся, як ты, мабыць, падумаў. Псуюць іх, вось што дрэнна. Гэта цяпер усе кажуць, што мужчына толькі і можа, што насіць рэчы, ці патрымаць што, ці нянькай у дзіцячым прытулку працаваць. А як на мой розум, дык мужчыну і бацькам быць нельга, калі ён не мае жаночай вытрымкі, а дзяцей выхоўваць — няма чаго і казаць. Але гэта ўсё пустое».

Аднак хапае ў кнізе «Вусцішны пакой» і сапраўды страшных апавяданняў, такіх, ад якіх дрыжыкі бягуць па скуры, а ногі хочацца падцягнуць з падлогі: а раптам хто пад крэслам схаваўся? Да такіх можна аднесці апавяданне «Павучыха» нямецкага празаіка і паэта, аўтара містычных апавяданняў і раманаў Ханса Хайнца Эверса (у перакладзе А. Бахарэвіча), і «Жоўтыя шпалеры» Шарлоты Пэркінс Гілман (у перакладзе Юлі Цімафеевай), апавяданні, якія, безумоўна, адносяцца да класікі жанру.

Кніга ўзброена не толькі прадмовай, але і даволі падрабязнымі каментарыямі і кароткімі біяграфіямі перакладчыкаў. Чытаючы апошнія, міжвольна заўважаеш, што большасць перакладчыкаў гэтых тэкстаў — проста-такі асуджаных на папулярнасць — нарадзіліся ў 1980-я гады, а значыць людзі маладыя, сучасныя, заклапочаныя поспехам. Нягледзячы на параўнальна малады ўзрост, яны вельмі дбайна ставяцца да чужых тэкстаў, дэманструючы выдатную сакавітую беларускую мову, часам настолькі самавітую, што зломіш галаву — ці то гэта нейкае мала ўжывальнае слова ці звычайная памылка друку? Тым не менш прафесійнасць, з якой яны падыходзяць да тэкстаў, дае падставу гаварыць пра тое, што ў Беларусі складаецца новая школа перакладу, якая будзе грунтавацца не толькі на веданні замежных моў, але, у першую чаргу, на цікавасці да актуальнай літаратуры і ўліку густаў масавага чытача.

«Вусцішны пакой» — гэта кніга, якую смела можна рэкамендаваць шырокаму колу чытачоў, якія любяць адначасова жахі і гумар.

**Ганна КІСЛІЦЫНА**

■ Версіі

# Камета-фенікс ISON адрадзілася з попелу?

«Камета стагоддзя» ISON, магчыма, перажыла сустрэчу з Сонцам і працягнула свой шлях

**Нагадаем, што ў чацвер, 28 лістапада, гэтая камета першай з падобных нябесных цел дабралася да цэнтра Сонечнай сістэмы і выпарылася пад уплывам тысячаградуснай спякоты і радыяцыі, пазбавіўшы зямлян феерычнага шоу. За набліжэннем каметы назіралі некалькі абсерваторый, але разгледзець, што менавіта адбылося з ISON, не ўдалося. Апошнія даследаванні паказалі, што, магчыма, камета моцна паменшылася ў памерах, але працягнула свой палёт, і ў бліжэйшыя тыдні жыхары Паўночнага паўшар'я Зямлі змогуць убачыць яе няўзброеным вокам.**



У амерыканскім аэракасмічным агенцтве NASA зарэгістравалі паток адлюстраванага сонечнага святла, якое можа зыходзіць ад ацалелай ISON. Пакуль навукоўцы не могуць дакладна сказаць, што гэта — смецце або частка ядра нябеснага цела, якая засталася некранутай.

Назіральнікі ўжо назвалі ISON каметай-феніксам ці нават каметай Шродынгера па аналогіі з адначасова жывым і мёртвым катом з эксперыменту заснавальніка квантавай механікі Эрвіна Шродынгера.

Расійскія вучоныя мяркуюць, што ў любым выпадку асколкі каметы не будуць пагражаць Зямлі. Паводле папярэдніх разлікаў, ISON перасячэ арбіту кручэння Зямлі вакол Сонца 24 снежня, калі наша планета будзе знаходзіцца ў 50 млн кіламетраў ад гэтага пункта. Каметнае воблака будзе відаць на небе яшчэ тыдзень, а потым яно стане паступова гаснуць.

**Сяргей КУРКАЧ**

Даты | Падзеі | Людзі

***Міжнародны дзень добраахвотнікаў у імя эканамічнага і сацыяльнага развіцця. Абвешчаны рашэннем 40-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН ад 17 снежня 1985 года ў знак прызнання важнай ролі добраахвотніцкіх і іншых арганізацый у сацыяльным і эканамічным развіцці грамадства.***

**1803** год — нарадзіўся Фёдар Цютчаў, рускі паэт. Гісторыкі лічаць родапачынальнікам гэтага роду Захара Цютчава, пасланца Дзмітрыя Данскога да Мамая, удзельніка Кулікоўскай бітвы. Аднак самі Цютчавы падтрымлівалі легенду пра сваё замежнае паходжанне, узводзячы генеалогію да фларэнтыйскага прозвішча Дуджы, носьбіт якой быў спадарожнікам Марка Пола. «Некаторыя яго вершы пройдуць з канца ў канец усю Расію і перажывуць у літаратуры многае з таго, што цяпер здаецца даўгавечным». Так ахарактарызаваў Іван Тургенеў творчасць свайго сучасніка Фёдара Іванавіча Цютчава. 22 гады паэт пражыў за мяжой, амаль усё жыццё гаварыў, пісаў па-французску, але самыя патаемныя думкі мог выказаць толькі ў рускім вершы — на мове сваёй радзімы. Цютчаў верыў, што Расіі прыгатавана ахавальная і панславянская місія. У творах паэта рускія асновы, «руская душа» супрацьстаяць бездухоўнасці навакольнага свету. Паэзія Цютчава зрабіла вялікі ўплыў на творчасць Фета, Брусава, Іванова, Салагуба.

**1945** год — у раёне так званага Бермудскага трохвугольніка ў паўночнай Атлантыцы бясследна зніклі шэсць самалётаў і 27 ваеннаслужачых марской авіяцыі ЗША, якія знаходзіліся ў іх. Анамальная зона і сёння лічыцца адным з самых загадкавых месцаў на планеце.



**1955** год — нарадзіўся (вёска Паболава Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці) Аляксандр Вікенцьевіч Цімашэнка, беларускі вучоны ў галіне біяфізікі, доктар біялагічных навук (1998). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2000).

Было сказана

**Рыгор ШЫРМА, харавы дырыжор, фалькларыст, грамадскі і музычны** дзеяч:

*«Гэта нічога, што ноч цёмная, — затое зоркі ярчэй мігцяць у небе».*

■ Чытальня

# «МАЛАДОСЦЬ»: ШТО БЫЛО ПАМІЖ НАМІ?

**«Можна тысячу разоў заяўляць, што свет творчасці значна рэальней для мастака, чым само жыццё, але... усе сны калі-небудзь канчаюцца, і мары вычэрпваюцца, і любімыя старэюць, і сябры паміраюць, і... і скончыцца ўсё, як звычайна, — аўтабіяграфічным раманам «Люстэрка». Гэтыя радкі чарговых старонак маладосцеўскага «Жыровіцкага дыярыуша» айца Яўстафія (Халіманкова) прысвечаны Мінску. «Скажы праўду, Мінск, — просіць аўтар. — Што было паміж намі?»**

Скажы і ты, чытач, праўду: ці чытаеш ты «Маладосць» з такім захапленнем, з якім яна штомесяц ствараецца? Яе снежаньскі нумар, у прыватнасці, уздымае пытанне пра тое, якое чытанне нам больш даспадобы зімой, напярэдадні свят — Каляд і Новага года. У рубрыцы «Апытанка» змешчаны адказы. Мяркуеш, чытач, што большасць узгадвала Гогаля і Баршчэўскага? Алёна Беланожка параіла Льюіса Кэрала! А ўвогуле, пад святло ёлачных ліхтарыкаў чытаюць, як аказалася, Кірылу Тураўскага, Івана Мележа, Конан Дойля, «Жывага» і Кафку. І вершы!




Вершы, што друкуюцца ў «Маладосці» ў снежні, — спрэс разнастайныя і аднолькава вартыя ўвагі. Пакуль дэбютант Зміцер Захарэвіч разважае пра «рацыю збаўнай прынукі», улюбёнка рамантыкаў Наста Кудасава назірае «концасці напамін». Быццам новы Эдэм бясхібавы Госпад у захапленні выдыхнуў, каб сусвет распачаць з нас. Святлану Сцепанчук «заве ўспамін да вяртання», Святлана Куль прадстаўляе паэму «Ян і Мар'яна», напісаную паводле архіўных звестак.

Пройдземся па прозе? Тут табе, чытач, і сапраўдная дэтэктыўная гісторыя з элементамі «пра каханне» ў іранічным стылі Ганны Чакур («У пошуках экстрасэнса»), і казкі для дарослых у выкананні Валерыі Саротнік (так і называюцца, усяго восем), і меладраматычныя дзеі п'есы Георгія Марчука («Усё будзе заўтра»). З дэбютам у прозе выступае студэнт біяфака БДУ Аляксандр Даменікан («Твары»).

Чаму вельмі важным з'яўляецца вывучэнне спадчыны беларускіх гуманітарыяў часоў беларусізацыі? Чаму часопіс «Маладосць» вырашыў апублікаваць малавядомую на сёння работу «Параўнанне ў мастацкай літаратуры» Яўгена Барычэўскага? Ці толькі з нагоды 130-годдзя з дня нараджэння апошняга, якое адзначаецца ў снежні? Адказы — у артыкуле Ціхана Чарнякевіча і ў самой рабоце Барычэўскага, што падаецца тут жа. Пра «Нядолю Кулакоўскага», 100-гадовага юбіляра, першага рэдактара часопіса «Маладосць», распавядае рубрыка «Эпісталярый».

Скажы праўду, чытач: што было паміж намі? Чаго чакаць нам з табою ад года наступнага? Самых шчырых чытачоў «Маладосці» ў 2014-м чакаюць адкрыцці — тым больш цікавыя і разнастайныя, чым шырэй дыяпазон падпіскі. Падпішашся на паўгоддзе, чытач? Не прагадаеш.

**Шаноўныя хлебаробы глыбінкі Палесся!**

**Віншуем Вас з наступаючым Новым годам, каляднымі святамі.**

Жадаем усім вяскоўцам здароўя, дастатку і шчасця ў сем'ях, новых працоўных поспехаў у будучыні.

*З павагай, калектыў прыватнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «ПінскдрэўАгра».*

УНП 291024301

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 9.11 | 16.49 | 7.38 |
| Віцебск | — 9.07 | 16.32 | 7.25 |
| Магілёў | — 9.01 | 16.39 | 7.38 |
| Гомель | — 8.49 | 16.44 | 7.55 |
| Гродна | — 9.25 | 17.06 | 7.41 |
| Брэст | — 9.17 | 17.15 | 7.58 |

**Месяц**

***Маладзік 3 снежня. Месяц у сузор'і Казярога.***

**Імяніны**

***Пр.** Аляксандра, Аляксея, Максіма, Міхаіла, Паўла, Пракопа, Пятра, Уладзіміра, Фёдара, Філімона, Якава.*

***К.** Хрысціны, Генрыха.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




УСМІХНЕМСЯ

Пасварыўся з жонкай. Пайшоў на кухню, закруціў усе слоікі мацней.

**— Малады чалавек, у вас харызма расшпілена!**

Яны плакалі, калі развітваліся... Доўга не маглі адпусціць адно аднаго. Ён ад'язджаў у камандзіроўку на 10 дзён, а яна — да мамы... Сустрэча аказалася яшчэ больш бурнай... Праз суткі... На пляжы... У Егіпце...




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.398. Індэкс 63850. Зак. № 5144.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 4 снежня 2013 года.